WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

28 СТУДЗЕНЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 15
(26623)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Пётр ПРАКАПОВІЧ:

«БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ БУДЗЕ ЎМАЦОЎВАЦЦА...»

Ігар ШЧУЧЭНКА

Такое меркаванне на ўчарашняй сустрэчы з журналістамі выказаў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч. Прынамсі, закранаючы тэму стабільнасці нацыянальнай валюты, галоўны банкір заявіў пра тое, што ён не выключае па выніках гэтага года невялікага ўмацавання беларускага рубля да кошыка валют.

Паводле яго слоў, для гэтага ёсць усе перадумовы. «Мы спадзяёмся, што сітуацыя ў свеце будзе лепшай, чым гэта прагназуецца цяпер, — зазначыў галоўны банкір. — Мы ўпэўненыя і спадзяёмся на тое, што Беларусі ўдасца значна павялічыць экспарт айчыннай прадукцыі, што значна палепшыцца сітуацыя ў нашых асноўных гандлёвых партнёраў, асабліва ў краін-суседак». На думку Пятра Пракаповіча, у прыватнасці, гэта датычыцца той жа Украіны, Расіі, і ўсе магчымасці для гэтага ёсць. Акрамя таго, краіна напрацавала шмат рынкаў — гэта і Азія, і Афрыка, і Лацінская Амерыка, на якіх раней прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў не было, і цяпер для нашай краіны там адкрываюцца вялікія магчымасці. Да таго ж, лічыць Пётр Пракаповіч, істотны задзел для ўмацавання валюты, — захады, што прымаюцца дадаткова па ўмацаванні ўнутраных магчымасцяў развіцця эканомікі, па прыцягненні прамых замежных інвестыцый: сёлета плануецца значна нарасціць іх аб'ём. «А прамыя інвестыцыі — гэта шлях, каб не толькі падтрымаць курс нацыянальнай валюты, але і значна нарасціць нашы золатавалютныя рэзервы», — кажа ён. Між іншым, летась золатавалютныя рэзервы ўдалося павялічыць у 1,8 раза — да 5 мільярдаў 650 мільёнаў долараў ЗША. На наяўным валютным рынку цяпер няма ніякага ціску на нацыянальную валюту з боку насельніцтва: у адрозненне ад мінулага года, сёння тут пануюць іншыя тэндэнцыі — людзі больш здаюць СКВ, чым купляюць. З пачатку года беларусы здалі ў банкі на 60 мільёнаў долараў больш, чым купілі. «Гэта значыць, — удакладніў кіраўнік Нацбанка, — штодня насельніцтва прадае валюты на 3-4 мільёны долараў ЗША больш, чым купляе. Гэта адразу сведчыць пра тое, наколькі змянілася сітуацыя на валютным рынку».

Аднак, нягледзячы на апошняе, галоўны банк краіны ўсё адно не спяшаецца вяртацца да пытання ўзнаўлення крэдытавання фізічных асобаў у замежнай валюце, якое забараніў летась у ліпені. Разам з тым, пытанне, ці трэба зноў вяртацца да былой практыкі крэдытавання насельніцтва ў свабоднаканверсоўнай, банкір лічыць няпростым.

СТАР. 2

Павел ЛАТУШКА:

«НА ФІЛЬМ «ДНЯПРОЎСКІ РУБЕЖ» ПАТРАЧАНА Br6 МІЛЬЯРДАЎ, ВЕРНУТА — 100 МІЛЬЁНАЎ...»

Учора на выніковай калегіі Міністэрства культуры за 2009 год былі агучаныя як канкрэтныя поспехі, так і канкрэтныя праблемы.

Калегія была прадстаўнічая і цягнулася доўга. На яе сабраліся прадстаўнікі ўсіх высокіх дзяржаўных органаў апроч Мінкульта. А супрацоўнікі сферы культуры з'ехаліся з усяе Беларусі. Што важна — казалі пра рэальныя праблемы, а не пра тое, «як усё добра». Напрыклад, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валеры Малашка паскардзіўся, што ў краіне знікаюць фабрыкі па вытворчасці музычных інструментаў — і для музычных школак ды каледжаў іх замяняюць кітайскімі, даражэйшымі і горшымі па якасці. Намеснік міністра культуры Віктар Кураш прывёў вусцішныя прыклады, калі ў вёсцы Ляхавічы Іванаўскага раёна ўнікальную драўляную царкву 1818 года ababілі сучасным белым сайдынгам, знішчыўшы выгляд помніка архітэктуры! Альбо бязглуздая перабудова да непазнавальнасці іншай драўлянай царквы, 1838 года, у вёсцы Гошчава Івацэвіцкага раёна. І такія выпадкі — ужо не адзінкавыя... Чыноўнік заклікаў мясцовую ўладу не дапускаць такога бясчынства.

Аднак найбольшую цікавасць усіх прысутных, безумоўна, выклікала 47-хвіліннае выступленне **міністра культуры Паўла ЛАТУШКІ**. Як заўжды, на бездакорнай беларускай мове спадар Павел казаў...

...ПРА КУЛЬТУРНУЮ І НЕКУЛЬТУРНУЮ МОЛАДЗЬ

— Стан культуры ўплывае на імідж краіны. Гэта дакладна вызначыў Прэзідэнт Беларусі: «Цывілізаванай дзяржавы без культуры няма». Аднак вынікі апошняга сацыялагічнага даследавання Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта паказваюць, што ў структуры каштоўнасцяў і арыентацый моладзі пераважнае месца займаюць матэрыяльны дабрабыт, здароўе і сям'я. Усё гэта, зразумела, важна. Аднак толькі 48 % сельскай і 42 % гарадской моладзі паказалі, што для іх сярод важкіх каштоўнасцяў знаходзіцца культура. Такая сітуацыя не можа нас задавальняць. ...Класік беларускай літаратуры Уладзімір Караткевіч, чыё 80-годдзе мы будзем адзначаць у гэтым годзе, казаў: «У беларусаў ёсць свая, Богам дадзеная зямля. Яна прыўкрасная. Іншай няма і не будзе. Таму яе трэба берагчы, песціць. А калі жывеш на гэтай зямлі — павінен быць яе гаспадаром, ты не маеш права працаваць дрэнна».

СТАР. 7

Ігар Бузоўскі выбраны першым сакратаром ЦК БРСМ

На V пленуме ЦК Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, які адбыўся ўчора, Ігар Бузоўскі выбраны першым сакратаром Цэнтральнага камітэта гэтай арганізацыі. Мерапрыемства прайшло з удзелам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзіміра Макея.

У сваім выступленні пасля выбрання лідара маладзёжнай арганізацыі Уладзімір Макей адзначыў, што рабоце БРСМ трэба надаць новае дыханне ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу. Зрабіць яе такой, «каб яе ведалі, аб ёй гаварылі». Гэта павінна быць аўтарытэтная маладзёжная арганізацыя з новымі цікавымі праектамі і ініцыятывамі. Кіраўнік Адміністрацыі ў сваім выступленні сказаў пра неабходнасць выбудоўвання зладжанай, адпаведнай патрабаванням часу работы БРСМ, сістэмнай праграмнай дзейнасці маладзёжнага саюза, у якой асноўныя намаганні павінны быць сканцэнтраваны не на разавых акцыях, а на некалькіх ключавых напрамках. Уладзімір Макей акцэнтаваў увагу на развіцці будатрадаўскага руху, больш актыўнай рабоце ў працоўных калектывах, са студэнцкай моладдзю, з маладзёжнымі СМІ, а таксама на неабходнасці прыняцця мераў па выхаду БРСМ на самафінансаванне. Уладзімір Макей падкрэсліў, што Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі павінен быць дастойным партнёрам дзяржавы ў далейшай пабудове моцнай і квітнеючай Беларусі.

БЕЛТА.

Віктар ГАЛАВАНАЎ:

«У БЕЛАРУСІ ПЛАНУЕЦЦА ЎВЕСЦІ КРЫМІНАЛЬНУЮ АДКАЗНАСЦЬ ДАЎЖНІКОЎ»

Надзея ДРЫЛА

Крымінальная адказнасць у дачыненні да даўжнікоў, якія не выконваюць рашэнні агульных судоў, ужо ўведзена ў Літве, Казахстане і іншых краінах. Паводле слоў міністра юстыцыі Беларусі Віктара Галаванава, праекты адпаведных дакументаў распрацаваныя і ў Беларусі. Неабходнасць гэтага нововўвядзення падказала жыццё: летась судовыя выканаўцы не змаглі спагнаць з даўжнікоў прыблізна 44 мільярды рублёў. У большасці выпадкаў гэта адбываецца з-за таго, што яны наўмысна хаваюць сваю маёмасць, даходы, не жадаюць працаваць. Менавіта ў дачыненні да вось такіх «ухілістаў» будзе прымяняцца крымінальная адказнасць. Аднак яна, хутчэй за ўсё, не будзе звязана з пазбаўленнем волі. Больш за тое, Мінюст прапануе даўжнікоў, якія наўмысна ўхіляюцца ад рашэнняў агульных судоў, абмяжоўваць у некаторых правах — на паляванне, кіраванне маламернымі суднамі, на перарэгістрацыю аўтамабіляў, на правядзенне тэхагляду. Гэта будзе прэвентыўнай мерай. Да ведама, летась выканаўцы агульных судоў па рашэннях ДАІ, падатковых органаў, КДК, мытні і іншых ведамстваў спагналі каля 450 мільярдаў беларускіх рублёў, з якіх звыш 200 мільярдаў паступіла ў даход дзяржавы.

РАСПРАЦАВАНА КАНЦЭПЦЫЯ ЮВЕНАЛЬНАЙ ЮСТЫЦЫІ

Яна ўжо ўзгоднена практычна з усімі ведамствамі. І, як плануецца, будзе разгледжана на пасяджэнні Прававога кансультацыйнага савета пры кіраўніку дзяржавы. «Гэта канцэпцыя дазволіць больш лаяльна ставіцца да няпоўнагадовых злачынцаў, — падкрэсліў Віктар Галаванаў. — Сутнасць у тым, што не заўсёды мэтазгодна адпраўляць маладога чалавека, які спатыкнуўся, у калонію, дзе, як правіла, сядзяць падлеткі яшчэ горшыя, чым ён. Такое ўздзеянне адзін на аднаго не садзейнічае выпраўленню, хутчэй, наадварот. Менавіта таму ў шэрагу развітых заходніх краін створаны спецыяльныя ювенальныя суды для няпоўнагадовых, якія дазваляюць не ізаляваць канкрэтнага маладога парушальніка ад грамадства. Іх справы разглядаюць суддзі, якія працуюць толькі ў гэтай сферы, у судовых пасяджэннях прымаюць удзел псіхолагі і педагогі. Усё гэта накіравана, у першую чаргу, на перавыхаванне падлеткаў. Такая сістэма, мяркуецца, будзе створана і ў нас».

СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПРАЦОЎНЫ ПІРОГ

Муляр — самая запатрабаваная прафесія на рынку працы Магілёўскай вобласці, разам з іншымі будаўнічымі спецыяльнасцямі

Ілона ІВАНОВА

Я ў муляры пайшоў бы

У Магілёўскай вобласці ёсць свабодныя вакансіі (прынамсі болей за 50): муляра, вадзіцеля, цесляра, падсобнага рабочага, прадаўца харчовых тавараў, тынкоўшчыка, рабочага ў сельскай гаспадарцы. Патрабуюцца таксама 30 урачоў і больш за 20 медыцынскіх сясцёр.

Невялікі будынак на вуліцы Пінянерскай у Магілёве з надпісам «Служба занятасці». Навокал нервова кураць мужчыны з хмурымі тварамі, усярэдзіне людзі тоўпяцца каля стэндаў са звесткамі пра вакансіі, у калідорах наведвальнікі чакаюць кансультацый спецыялістаў упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага гарвыканкама.

У аддзеле прафесійнай арыентацыі і прафесійнага навучання ідзе прыём. Ігару — 48 гадоў, у яго вышэйшая адукацыя, усё жыццё ён займаўся металаапрацоўкай. Да таго часу, пакуль урачы катэгарычна не забаранілі мужчыну працаваць з металам з-за алергіі. Ён накіраваўся па заробак на будоўлі. Цяпер Ігар хоча не проста атрымаць «корачкі» муляра і тынкоўшчыка, але з цягам часу стаць прадпрымальнікам у справе апрацоўчых будаўнічых работ. Што ж, магілёвец не прагадае.

— Цяпер ёсць вялікі попыт на высокакваліфікаваную працоўную сілу, — тлумачыць **Вольга ЯЛАВЕНКА, галоўны спецыяліст аддзела рынку працы і прафесійнага навучання Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама.** — У асноўным патрабуюцца **будаўнікі**. Сярод гэтых прафесій асабліва дэфіцытныя **муляры**. Па ўсёй вобласці іх патрабуецца цяпер 173. Толькі летась мы адправілі 136 маладых людзей перавучвацца на муляра.

Андрэй, якому споўніўся 21 год, вырашыў прасіцца на курсы навучання **электраманцёраў**: «У майго бацькі такая прафесія — і праца добрая, і заробак».

— Малады чалавек рэальна глядзіць на рэчы: у Магілёве цяпер 25 свабодных вакансій электраманцёраў, — каментуе спецыяліст на прыёме.

Абавязкова знойдуць працу таксама **бетоншчыкі, страхары, кранаўшчыкі, мантажнікі, экскаватаршчыкі, зваршчыкі і іншыя будаўнікі**. Калі ёсць вопыт і кваліфікацыя — наймальнікі возьмуць такіх з рукамі і нагамі. І добрыя грошы будуць плаціць: сярэдні заробак будаўніка ў Магілёве сёння перавышае 1,2 мільёна рублёў.

СТАР. 2

У эпіцэнтры дзяржаўнай палітыкі

ЗАДАЧА ДЛЯ «ЗАРЫ»: НАКАРМІЦЬ ПАЛЕССЕ

ЗНАЁМІМ З ГАСПАДАРКАЙ

Пра яе маштабы сведчаць такія лічбы: адлегласць ад аднаго вытворчага ўчастка да другога — 70 кіламетраў. А паміж фірменнымі гандлёвымі кропкамі саўгаса-камбіната, якія размешчаны ў розных раёнах Гомельшчыны і ў якія патрэбна штодзённа падвозіць свежыя прадукты, па прамой наогул 350 кіламетраў.

Цяпер адных толькі спецыялістаў тут больш за 160 чалавек! Калі пачыналі сваё адраджэнне, то ўсіх працуючых было 200. Сёння калектыў налічвае больш за тысячу чалавек. І каля 70 працэнтаў яго членаў — гарадское насельніцтва, з Мазыра і прыгараднага пасёлка Крынічны.

Па эфектыўнасці гаспадарання не многія могуць параўнацца з гэтым саўгасам-камбінатам. Рэнтабельнасць летась склала 34 працэнты. Прывагі буйной рагатай жывёлы — 958 грамаў, свіней — больш за 600, надой у сярэднім на карову 7532 кілаграмы. Пра тое, што тут умеюць пралічваць кожны свой крок, сведчаць і такія красамоўныя факты: толькі дзякуючы праведзенай рэканструкцыі свінагадоўчага комплексу і птушкафабрыкі эканомія энергарэсурсаў складае ад 2 да 2,5 мільярда рублёў у год. Уласныя інвестыцыі ў гаспадарку штогод перавышаюць 20 мільярдаў.

А пачыналася ўсё ў 1982 годзе з увядзення ў эксплуатацыю комплексу па адкорме свіней. Пакуль існавала вялікая краіна, працаваў ён няблага. Падпарадкоўваўся напрамую Маскве, з усіх куткоў Савецкага Саюза сюды ішлі саставы з камбікармамі. Калі рухнуў Савецкі Саюз, захістаўся, але ўстаяў, бо знайшліся людзі, якія падставілі плячо і праявілі сапраўдны арганізатарскі талент. Той антыкрызісны вопыт варты вывучэння ў любой сітуацыі, у сённяшняй — тым больш.

Першае слова пра калектыў — чалавеку, які стаяў каля вытокаў новай «Зары».

Сярод дыпломаў, сертыфікатаў, грамат, якімі адзначаны працоўныя поспехі калектыву, ёсць і ганаровы знак «Лідар нацыянальнай эканомікі».

1. «АГРАРНЫ СЕКТАР — НЕКРАНУТЫ КУТОК БІЗНЭСУ. А МАЗЫРСКІ РАЁН — ДРУГАЯ ГАЛАНДЫЯ»

Толькі вера калектыву ў поспех і ў свайго лідара робіць антыкрызісную праграму паспяховай, лічыць **Уладзімір ДВОРНІК.**

ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ

Яшчэ нядаўна, да кастрычніка мінулага года, Уладзімір Дворнік якраз і кіраваў гэтай адной з найбольш праслаўленых айчынных гаспадарак. У кастрычніку ён узначаліў Мазырскі райвыканкам, у адміністрацыйнае падпарадкаванне якога зараз уваходзіць і сам Мазыр — горад развітой індустрыі і адзін з цэнтраў айчыннай нафтаперапрацоўкі.

Творчая брыгада «Звязды» напачатку пабывала ў саўгасе-камбінаце, пазнаёмілася са справамі гаспадаркі. І выявілася, што ўсе свае вытворчыя поспехі яго працаўнікі самым непасрэдным чынам звязваюць з імем Дворніка. Пра Уладзіміра Андрэевіча мы чулі шмат і толькі добрае — як пра спецыяліста, сапраўднага прафесіянала, неабыякавага чалавека.

Пра гэта сведчыць і ўся яго працоўная біяграфія. Родам Уладзімір Андрэевіч з Рэчыцкага раёна, працаваў у Нараўлянскім, і пасля аварыі на ЧАЭС яго гаспадарка трапіла пад перасяленне. Вось дзе гартаваўся мужчынскі характар дваццацігадовага хлопца. Галоўны ветурач гаспадаркі, якому насамрэч было нямногім больш за 20, апошнім пераехаў разам з калгасным статкам у калгас «Дружба» Мазырскага раёна. Тут таксама працаваў галоўным ветурачом, а потым і намеснікам старшыні. Прафесіяналізм выпускніка Віцебскага ветэрынарнага інстытута заўважылі і прызначылі кіраўніком раённай ветэрынарнай службы.

— Дзівосны чалавек. Вельмі смелы, вельмі таленавіты, з чыста сялянскай практычнасцю і моцнай эканамічнай хваткай, — расказвала нам, пакуль разам ехалі ў машыне з «Зары» ў выканкам на сустрэчу з яго старшынёй, Ніна Івасюк, галоўны эканаміст саўгаса-камбіната і наш гід па гаспадарцы. Ніна Канстанцінаўна ведае Дворніка яшчэ па шматгадовай сумеснай працы ў раённым упраўленні сельскай гаспадаркі. — Не часта бывае, каб у адным чалавеку вы сустрэлі так шмат станоўчага. Гэтыя цудоўныя якасці праяўляюцца і цяпер. Яму нашы справы паранейшаму цікавыя, любую складаную праблему вырашаем разам. І нашым спецыялістам патрэбна быць заўсёды гатовымі адказаць на яго пытанні. Таму нам і лёгка, і складана, бо ўзрасла адказнасць. Чаму ўзрасла? Мы не хочам і не маем права падводзіць Дворніка.

Вялікая цана таму кіраўніку, былы калектыў якога і цяпер за яго — гарой.

— Уладзімір Андрэевіч, сёння «Зара» — у ліку самых лепшых гаспадарак Беларусі. Але так было не заўсёды. Цяпер, калі прыўнесены ў наша жыццё крызіс зачапіў сваім крылом эканоміку і нашай краіны, карысна будзе ўспомніць, што асабіста вам давялося ажыццяўляць сур'ёзную антыкрызісную праграму ў гэтай гаспадарцы...

— Магчыма, вам ужо расказвалі, як я трапіў у свой час у «Зару». Працаваў ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі галоўным ветэрынарным урачом раёна. Свінагадоўчы комплекс уваходзіў у склад эксперыментальнай базы «Крынічная». Адначасова на комплексе ўжо тады маглі ўтрымліваць 36 тысяч свіней. Калі сапраўды адносіны разваліліся, прадпрыемства пачало пакрысе з'язджаць уніз. І дайшло да таго, што там адчувальна зменшылася пагалоўе, комплекс працаваў ва ўбытак. На адной з нарадаў, якую праводзіў першы намеснік старшыні аблвыканкама, разглядалася пытанне, што рабіць з гэтым прадпрыемствам далей. У ходзе размовы нейкім чынам усё звялося да таго, што вінаватая ва ўсіх бедах комплексу раённая ветэрынарная служба. Я папрасіў слова і выказаў меркаванне, што на мой погляд праблема ў іншым — там не адчуваецца рука гаспадара, няма гаспадарскага падыходу. Мяне, тады самага маладога сярод галоўных урачоў раёнаў Гомельшчыны, гэтая сітуацыя вакол комплексу-гіганта, у які былі ўкладзены велізарныя народныя грошы, так кранула за душу, што я сказаў прыкладна так: калі вы лічыце, што вінаваты ветэрынарны ўрач раёна, то я гатовы сам туды пайсці працаваць, і паверце, што горш не будзе... Так і выйшла. Старшыня райвыканкама падтрымаў мяне, і дайшлі да таго, што вінаватая ва ўсім не ветэрынарная служба, а ўвесь раённы агракомплекс, які ўтрымліваў комплекс. Мяне прызначылі дырэктарам. Калектыў — дзве сотні чалавек, на ўтрыманні — 22 тысячы свіней, і перадаюць у наша распараджэнне 200 гектараў зямлі.

З гэтага мы пачыналі. Даўгі перавышалі кошт асноўных і абаротных сродкаў, гаспадарка — поўны банкрут, таму не крэдытавалася банкамі. Сёння нават чыста псіхалагічна складана прыгадваць усё тое, праз што мы прайшлі. Але, як кажуць, не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. Як толькі нас раздзялілі, на нас «павесілі» даўгі аб'яднанага калектыву за мінулую дзейнасць, і адразу дружна наваліліся ўсе крэдыторы: аддавай, што вінен. Калі камерсанты прыехалі па свае даўгі, то былі і пагрозы, і чаго толькі хочаш. Я ім дазволіў: ідзіце паглядзіце і забірайце. Але забіраць не было чаго, усё пагалоўе — худое, недакормленае. Самыя вялікія кандыцыі на адкорме — 60 кілаграмаў, і якраз ішоў масавы падзёж. Тады, у складаным 1996 годзе, кардынальна дапамагчы нам не маглі ні вобласць, ні рэспубліка.

Камерсантам я сказаў: калі хочаце вярнуць свае грошы, то дапамагайце. Бо інакш і жывёла, што засталася, прападзе разам з комплексам і са мной. Выйсця іншага проста няма. Яны задумаліся. Адным словам, я змог пераканаць, і ў іх твары атрымаў саюзнікаў. Яны пачалі нам пераводзіць грошы, дзякуючы чаму мы купілі камбікармы і пачалі карміць жывёлу. Крышку падтрымаў і бюджэт, мы сталі плацежаздольнымі. Хуценька заключылі дагаворы з усімі больш-менш блізкімі камбінатамі хлебапрадуктаў, і камбікармы пайшлі да нас вагонамі, мы суткамі іх разгружалі. Зрабілі практычна гадавы запас. І змаглі не проста накарміць свіней, але ўжо і думаць пра тое, як пачаць зарабляць грошы — думаць пра рэалізацыю, пра племянную работу — пра нейкую для сябе перспектыву. На працягу года ўдалося разлічыцца з асноўнымі даўгамі, а роўна праз год і тры месяцы выйшлі на «чысты» разліковы рахунак. Калектыў рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Саўгас-камбінат «Зара», створанага на аснове свінагадоўчага комплексу, паверыў у свае сілы.

Працаваць заўсёды стараліся рэнтабельна, эканомілі на ўсім, пралічвалі ўсё да капейкі. Увялі дакладны ўлік гаруча-змазачных матэрыялаў. У першы год нашай працы ацяпленне ў адміністрацыйным будынку і бытоўках было ўключана толькі 20 снежня, а 20 лютага ўжо адключылі. Людзі пераапраналіся ў спецовпратку пры мінусавай тэмпературы, але ніхто ў калектыве не пярэчыў супраць такой эканоміі. Нейкім чынам ужо ў самым пачатку ўдалося згуртаваць людзей, і такое адзінства было вельмі да месца. Мо таму і змаглі хутка набраць даволі высокія тэмпы ў сваім развіцці. Ужо на працягу першага года працы спынілі падзёж і забяспечылі прырост пагалоўя, павялічылі рэалізацыю.

(Працяг на стар. 4–5.)

Гэтыя здымкі зроблены ў самай буйной гаспадарцы Мазырскага раёна — саўгасе-камбінаце «Зара», якой да кастрычніка мінулага года кіраваў наш суразмоўца. Студзеньскія маразы не ўплываюць на зладжаны працоўны рытм падраздзяленняў. Не замаруджвае свой рух канвеер птушкафабрыкі (каля яго — птушніца Ніна СТРАХА), у цэху перапрацоўкі працягваюць вырабляць апетытную прадукцыю (гэтым заняты, у прыватнасці, работніцы Наталля КАРНЕЯВЕЦ і Наталля КУРДО). Штодзень хапае спраў і ў тых, хто захоўвае і перавозіць збожжа з новага збожжасховішча на ўласны камбікормавы завод.

ISSN 1990 - 763X

Рынак працы

МІНСК НЕ «ЗАЧЫНЯЕЦЦА»

І можа прапанаваць зарплату больш чым у 1,5 мільёна

Абвастрэнне сітуацыі на рынку працы сталіцы не прывядзе да «закрыцця» найбуйнейшага горада краіны для работнікаў з іншых рэгіёнаў. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміў намеснік старшыні, начальнік ўпраўлення занятасці Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Чэслаў РОЎБА.

У пачатку студзеня на ўліку ў службах занятасці сталіцы знаходзілася 4,5 тыс. чалавек, пры гэтым Мінск меў самы нізкі ў Беларусі ўзровень беспрацоўя — 0,4 працэнта ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Разам з тым, адзначыў Чэслаў Роўба, становішча на рынку працы стала больш напружаным, у прыватнасці, значна абвастрылася праблема няпоўнай занятасці — летась у такім рэжыме працавалі 78 тыс. мінчан. Фактам з'яўляецца і тое, што многія арганізацыі сталіцы прыкметна абмежавалі ўладкаванне новых работнікаў, правялі аптымізацыю персаналу, спынілі прапанову ў службы занятасці вакансій. У выніку колькасць звольненых не аднавілася прыёмам новых кадраў, а агульная прапанова для тых, хто шукае сабе месца, зменшылася на 29 працэнтаў.

У сувязі з гэтым у параўнанні з мінулым годам планы па стварэнні новых працоўных месцаў у Мінску павялічаныя на 10 працэнтаў. Сёлета ёсць намер арганізаваць 34,6 тыс. вакансій, 70 працэнтаў якіх прыйдзецца на традыцыйна запатрабаваную ў буйных гарадах сферу паслуг. Прычым, падкрэсліў Чэслаў Роўба, для падтрымкі наймальнікаў пры стварэнні новых працоўных месцаў ужо прынятыя пэўныя нарматыўныя акты, якія дазваляюць атрымліваць у бясплатнае карыстанне памяшканні. Паралельна для падтрымкі прадпрымальнікаў тут вызначаная магчымасць крэдытавання пад ільготныя працэнты.

Яшчэ адзін шлях стрымлівання беспрацоўя — выкарыстанне цяперашніх «рэзерваў». Мінск застаецца адзіным рэгіёнам, дзе колькасць вакансій усё ж адчувальна перавышае колькасць беспрацоўных. У пачатку студзеня службы занятасці горада мелі звесткі аб наяўнасці 12,5 тыс. свабодных працоўных месцаў.

Большасць вакансій у Мінску прыпадае на прамысловасць (14,9 працэнта ад агульнай колькасці), будаўніцтва (14,3 працэнта), ахову здароўя (12,3 працэнта), гандаль і грамадскае харчаванне (12,1 працэнта), транспарт (8,3 працэнта). Што да канкрэтных спецыяльнасцяў, то назіраецца значны попыт на бетоншчыкаў, муляраў, страхароў, маляроў, абліцоўшчыкаў-плітачнікаў, цесляроў, зваршчыкаў, машыністаў, мантажнікаў-электрамантажнікаў, тынкоўшчыкаў, электрыкаў-электраманцёраў, слесараў-сантэхнікаў, абутнікоў, вадзіцеляў аўтамабіля, кандуктараў, гандляроў, касіраў, кухараў, афіцыянтаў, кухонных і дарожных рабочых, памочнікаў выхавальніка, санітараў, прыбіральшчыкаў, а таксама — на выхавальнікаў, акушэраў, фельчараў, фармацэўтаў і ўрачоў розных профіляў, прарабаў, тэхнікаў-механікаў, супрацоўнікаў міліцыі. «Праблемнымі» з пункту гледжання працаўладкавання ў сталіцы застаюцца ўсяго некалькі пазіцый — у прыватнасці, дворнікі, аператары, эканамісты, бухгалтары.

Адначасова, заўважыў Чэслаў Роўба, меркаванне, што мінскія наймальнікі шукаюць супрацоўнікаў выключна на нізкааплатныя месцы, справядлівае не заўсёды. Ужо з пачатку студзеня ў гарадскую базу вакансій паступіла 118 заявак, «падмацаваных» зарплатай у 1,5 млн і вышэй — у першую чаргу ідзе гаворка аб электрагазазваршчыках, электразваршчыках ручной зваркі, электраманцёрах па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання, вадзіцелях катэгорыі «Е», мулярах, мантажніках будаўнічых канструкцый, электрамеханіках па сілавых сетках і электраабсталяванні.

Пры гэтым у «банк звестак» сёлета патрапіла 41 вакансія з зарплатай ў 1,8 млн рублёў і вышэй. Такія вакансіі разлічаныя на служачых, першнаперш у будаўніцтве (прараб, начальнік аддзела, майстар, галоўны архітэктар праекта, канструктар) і банкаўскай сферы (начальнік аддзела, галоўны спецыяліст). Былі высокааплатныя прапановы і ў арганізацыях іншых галін: начальнік бюро, вядучы эканаміст, начальнік сектара, урач, інжынер па камплектацыі абсталявання, спецыяліст па мытным афармленні. Праўда, нельга не заўважыць, што ўсе падобныя заяўкі разлічаныя на прэтэндэнтаў з высокай кваліфікацыяй і вялікім вопытам працы.

Сяргей ГРЫБ.

Паведамленні расійскіх СМІ аб тым, што Беларусь можа пачаць адбор прызначанай для Еўропы нафты, з'яўляюцца правакацыяй

Як правакацыю расцэньваюць беларускія ўдзельнікі перагавораў па пытаннях пастаўкі нафты паведамленні шэрагу расійскіх СМІ аб тым, што Беларусь можа пачаць несанкцыянаваны адбор нафты, прызначанай для еўрапейскіх спажыўцоў. Аб гэтым заявілі ў беларускай дэлегацыі.

«Гэтыя паведамленні не што іншае, як правакацыя, — падкрэслілі ў дэлегацыі. — Мы паказалі сваю вытрымку ў першыя дні студзеня, калі спыніліся пастаўкі расійскай нафты на беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы. У Еўропу тады нафта пастаўлялася ў поўным аб'ёме, пастаўкі склалі нават 102 працэнты адносна аналагічнага перыяду».

У дэлегацыі таксама назвалі глупствам сцвярджэнне аб тым, што ў бліжэйшы час беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы могуць спыніцца. «Трэба падпісваць пратакол аб пастаўках расійскай нафты ў Беларусь не таму, што заводы спыняцца, — гэта глупства, а таму, што трэба рухацца далей у нашых адносінах у энергетычнай сферы», — адзначылі ў дэлегацыі.

БЕЛТА.

МЗС Беларусі ўручыла паслу Польшчы ноту ў сувязі з дзеяннямі некаторых супрацоўнікаў дыппрадстаўніцтва

МЗС Беларусі ўручыла паслу Польшчы Генрыку Літвіну ноту ў сувязі з неадпаведнымі базавым міжнародна-прававым дакументам дзеяннямі некаторых супрацоўнікаў дыппрадстаўніцтва. Сустрэча з паслом адбылася ў Міністэрстве замежных спраў. Аб гэтым паведамілі ў беларускім знешнепалітычным ведамстве.

«Увага кіраўніка польскай загранустановы была прыцягнута да фактаў, якія датычацца дзеянняў асобных супрацоўнікаў Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь, якія не адпавядаюць базавым міжнародна-прававым дакументам, што рэгулююць дзейнасць замежных дыпламатаў у краінах акрэдытацыі. Па выніках праведзенай сустрэчы Генрыку Літвіну была ўручана адпаведная нота МЗС Беларусі», — сказалі ў ведамстве.

На сустрэчы беларускі бок пацвердзіў зацікаўленасць у паступальным развіцці добрасуседскіх адносінаў з Польшчай на аснове прынцыпаў раўнапраўя і ўзаемнай павагі.

БЕЛТА.

ПРАЦОЎНЫ ПІРОГ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Жаночая доля

Наталля запісалася на курсы, дзе яе навучаць **працаваць з камп'ютарам.**

— Цяжка быць беспрацоўнай, — уздыхае 33-гадовая жанчына. — Але мяне падтрымліваюць сваякі.

У яе адукацыя культмасавага работніка, потым вучылася на флярыста. Але сёння, расказвае Наталля, і ў сферы культуры, і ў кветкавым бізнэсе цяжка адшукаць добрае месца і дастойны заробак. Жанчына хоча стаць адміністратарам, але для гэтага патрабуецца веданне камп'ютара.

Сёння ў Магілёўскай вобласці пераважная большасць беспрацоўных — гэта жанчыны. Аднак большасць свабодных вакансій пасуе мужчынам.

— Амаль кожная жанчына хоча быць сакратаркай у прыёмнай кіраўніка, — расказвае **начальнік управління па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага гарвыканкама Віталь КІРЭЕЎ.** — Іх прыцягвае справаводства: як кажуць, перакладанне паперак. Але сёння і гэта справа патрабуе ведаў і кваліфікацыі. Тым больш што арганізацыі даўно не трымаюць «чыстых» сакратароў, а сумяшчаюць гэту пасаду з іншымі. Таму мы якраз рыхтуем **справаводаў з веданнем кадравай працы.**

Віталь Кірэеў раіць жанчынам цвяроза ацэньваць свае магчымасці:

— Аднойчы да мяне прыйшла дзяўчына, якая хацела быць толькі сакратаром. Я прадыктаваў ёй тэкст, а ў кожным слове — памылка. Мы пераканалі яе вучыцца на **кандытара**, гэта запатрабаваная прафесія, як і прадавец.

Магілёўскія жанчыны сёння не баяцца атрымаць прафесію **вадзіцеля тралейбуса** і ахвотна ідуць працаваць **кранаўшчыцамі**. А вось працоўнае месца **рыбіральшчыцы** ва ўстанове стала цяпер дэфіцытным.

Любімую прымаўку жанчын «Калі што здарыцца, пайду мыць падлогу» ажыццявіць даволі складана. Нягледзячы на нізкі заробак у 300—350 тысяч рублёў, свабодныя вакансіі прыбіральшчыцы здараюцца вельмі рэдка. Не толькі пенсіянеры, але і досыць маладыя жанчыны цэняць такое месца за непрацяглы працоўны дзень і адсутнасць адказнасці.

Начальнікі ў дэфіцыце

Сярод вакансій інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых перадусім патрабуюцца **галоўныя спецыялісты.** Такія пасады прапануюць і ў гарадах, і ў вёсках. Вольныя пасады галоўных механікаў, бухгалтараў, эканамістаў і энергетыкаў. А ў галоўных ветэрынарных урачоў і заатэхнікаў ёсць магчымасць атрымаць у сельскіх гаспадарках адразу і жыллё.

У Магілёўскай вобласці ёсць свабодныя вакансіі (прынамсі болей за 50): муляра, вадзіцеля, цесляра, падсобнага рабочага, прадаўца харчовых тавараў, тынкоўшчыка, рабочага ў сельскай гаспадарцы. Патрабуюцца таксама 30 урачоў і больш за 20 медыцынскіх сясцёр.

— Гэта праца з адказнасцю, — каментуе Вольга Ялавенка. — На ўліку ў нашых упраўленнях такіх людзей няма, мы не можам закрыць гэтыя вакансіі.

Не стала ахвотных кіраваць? Людзі зразумелі, што нервовая адказная праца адбірае здароўе і скарачае жыццё?

— Так, вялікая адказнасць пужае, — пагаджаецца Віталь Кірэеў. — Сапраўды, ёсць шмат такіх вакансій, прычым праца высокааплатная — заробак пад 2 мільёны рублёў. Аднак яе не можа заняць чалавек з вуліцы. Кіраўнік прад'яўляе патрабаванні да адукацыі, кваліфікацыі і вопыту галоўнага спецыяліста.

Хто зусім не хоча адказнасці, але грошы патрэбныя, таму прапануюць удзел у грамадскіх работах. Яны могуць стаць і падпрацоўкай для людзей, якім не хапае заробку па асноўным месцы працы альбо для пенсіянераў.

Праўда, хутчэй за ўсё, гэта будуць **сельскагаспадарчыя сезонныя работы** (ад пераборкі насення да збору ўраджаю і ўпакоўкі прадукцыі) і **летні рамонт у бюджэтных установах.**

Жыццё швачкі

Жанчына прывяла ва ўпраўленне па працы і занятасці сваю 23-гадовую дачку. Па прафесіі Кацярына — тэхнолаг швачнай вытворчасці, некалькі гадоў адпрацавала на адным з гарадскіх прадпрыемстваў спачатку швачкай, потым працаўшчыцай.

— Гэта было нібыта рабства, — прызналася дзяўчына. — Сыходзіла з дому а 6-й раніцы, вярталася а 6-й увечары. А заробак — 300 тысяч рублёў. Акрамя таго, на працы мне не давалі магчымасці пайсці здаваць тэсты, каб паступіць у ВНУ.

Цяпер Кацярына звольнілася і вучыцца на курсах для паспяховай здачы тэстаў, рыхтуецца да паступлення. Аднак і сумняваецца: «Можа, атрымаць яшчэ якую прафесію?»

— Мы раім дзяўчыне сканцэнтравацца на галоўнай справе, — тлумачыць **начальнік аддзела прафесійнай арыентацыі і прафесійнага навучання Таццяна САФОНАВА.** — Таму што атрыманне новай прафесіі патрабуе шмат часу і сілаў. Калі ж Кацярына потым захоча ўладкавацца швачкай, то мы можам прапанаваць ёй працоўнае месца на іншым прадпрыемстве, з заробкам у 500 тысяч рублёў.

Праўда, **попыт на швачак апошнім часам стаў меншым.** Яшчэ не так даўно менавіта гэта жаночая прафесія была вельмі запатрабаванай на рынку працы, але ў крызіс прадпрыемствы лёгкай прамысловасці зведваюць вялікія цяжкасці. Маці Кацярыны спадзяецца, што ў будучыні становішча выправіцца.

— Разумееце, гэта прафесія на ўсе часы, — кажа жанчына, якая сама ўсё жыццё адпрацавала швачкай. — Я нават у стужцы «Адмірал» бачыла, як высакародная дама шыццём займалася. І мая дачка не будзе хадзіць без бялізны і сукенкі, швачка заўсёды здолее зарабіць сабе на хлеб.

Крызіс і праца

Крызіс, безумоўна, адбіўся на рынку працы. Абвалу, якога ўсе баяліся, не адбылося, але сітуацыя са свабоднымі вакансіямі даволі напружаная.

— Калі на пачатак 2009 года было 4200 вакансій, то цяпер іх стала меней на 30 %, — растлумачыла Вольга Ялавенка. — **Цяпер на ўсю вобласць каля 3000 вакансій: на кожную з іх умоўна прэтэндуе 1,7 чалавека.**

У абласным цэнтры каэфіцыент напружанасці яшчэ большы: калі год таму на 1 беспрацоўнага было 2 вакансіі, то цяпер дакладна наадварот — 2 чалавекі на 1 працоўнае месца.

— Толькі ААТ «Магілёўхімвалакно» летась скараціла колькасць працоўных прыкладна на тысячу, — расказвае Віталь Кірэеў. — І я разумею, што людзі, якія прыходзяць сюды разгубленыя, апынуліся сапраўды ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Напрыклад, апаратчык з «Хімвалакно»: ён у свой час атрымаў добрую прафесію, працаваў на паспяховым прадпрыемстве, а цяпер з ім больш не працягваюць кантракт. А дзе можна ўладкавацца беспрацоўнаму апаратчыку, асабліва калі яму за 40?

Для таго, каб дапамагчы людзям перакваліфікавацца, працуюць спецыялісты ў справе прафесійнай арыентацыі і перанавучання. Яны нават праводзяць практычныя занятак: «Актыўны пошук працы»: тут чалавека не толькі псіхалагічна настрояць пачаць працоўнае жыццё наноў, але і дапамогуць практычнымі парадамі — як першым разам патэлефанаваць патэнцыйнаму працадаўцу, як паводзіць сябе на гутарцы і гэтак далей.

— Галоўнае — не панікаваць і праяўляць ініцыятыву ў пошуку працы, — раяць беспрацоўным.

Юрысты не патрэбныя

Большасць вакансій у вобласці — рабочыя. Але ёсць і свабодныя месцы для тых, хто мае вышэйшую адукацыю.

— Скажу, што **ўрачоў пастаянна не хапае,** — кажа Вольга Ялавенка. — Таксама на працягу апошняга дзесяцігоддзя **вельмі запатрабаваныя камп'ютаршчыкі, праграмісты.** А вось юрыстаў і эканамістаў перанасычэнне. Праўда, калі ў прыватных фірмах бачаць працаздольных і ініцыятыўных маладых людзей з такой адукацыяй, то ім часта знаходзяць сумежнае месца.

Увогуле спецыялісты па рынку працы цяпер даюць каштоўную параду выпускнікам ВНУ — **абавязкова ехаць па размеркаванні і адпрацоўваць:**

— Сёння выпадае ўспрымаць першае месца працы не як цяжар, а як прыступку да будучага. Маладым гараджанам не трэба шарахацца ад накіравання ў сельскую мясцовасць: калі набрацца вопыту і добра сябе зарэкамендаваць, то праз некалькі гадоў такі малады спецыяліст ніколі не застанецца без добрай працы і прыстойнага заробку. Затое маладыя людзі, якія праўдамі і няпраўдамі сыходзяць ад размеркавання, потым прыходзяць у службы занятасці і слёзна просяць дапамагчы.

У Магілёве беспрацоўны можа атрымаць новую прафесію: тынкоўшчыка, маляра і абліцоўшчыка, фрэзероўшчыка, токара, вадзіцеля, кухара, кандытара, прадаўца, афіцыянта, цырульніка, візажыста, майстра манікюру і іншых.

Праблемы з працай ёсць не толькі ў «зялёных» выпускнікоў, але і ў людзей пасля 40 гадоў, якія набліжаюцца да пенсіі: наймальнікі хочуць мець працаўнікоў з вопытам, але і перспектывай.

Хто шукае — заўсёды знойдзе

Гаворыць, што варыянты знайсці працу заўсёды ёсць. Пачынаць пошук трэба з візіту ў гарадское ці раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Там дапамогуць у пошуках працоўнага месца альбо накіруюць на перанавучанне.

Шанцы на вырашэнне праблемы добрыя: у 2009 годзе ў Магілёўскай вобласці створаны 19,5 тысячы новых працоўных месцаў, садзейнічанне ў працаўладкаванні аказана 27 тысячам людзей.

Калі людзі згодныя нават ехаць па працу, то ім у вёсцы прапануюць не толькі заробак і жыллё. Людзям са статусам беспрацоўных дзяржава кампенсуе перасяленне. Летась такіх перасяленцаў было на Магілёўшчыне 64.

— Я заўсёды кажу: **хто хоча працаваць — той знойдзе працу,** — настойвае Вольга Ялавенка. — Безумоўна, не заўсёды па пажаданай спецыяльнасці, але атрымаць працоўнае месца і заробак на жыццё здольны кожны, хто імкнецца.

Разам з тым, спецыялісты ўсё ж раяць мець у запасе дадатковыя навыкі і спецыяльнасці, каб у выпадку чаго манеўраваць на рынку працы.

— Гарантаванай сістэмы працаўладкавання, якая была калісьці пры сацыялізме, няма, — падкрэслівае Віталь Кірэеў. — За савецкім часам чалавек мог прыйсці на прадпрыемства ў 18 гадоў і працаваць там да глыбокай старасці. Цяпер жа рознае можа здарыцца, і таму трэба страхавацца, прыстасоўвацца да новых умоваў.

Паводле прагнозаў, сёлета рынак працы не пазбавіцца ад крызісных праяў. Асабліва праблемнай чакаецца першая палова года, і наплыў беспрацоўных, як і летась, можа быць ўвесну. **«А далей усё будзе залежаць ад таго, як мы ўсе ў краіне будзем працаваць»,** — такую выснову робяць у Магілёве.

ПАДАРАЖЭЛІ ЦЫГАРЭТЫ...

З учарашняга дня, у адпаведнасці з пастановай Мінэканомікі, узраслі рознічныя цэны на некаторыя маркі цыгарэт ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман».

На 4,3—12,5 працэнта, або на 50—150 рублёў за пачак, падаражэлі цыгарэты «Астра», «Прыма», «Кронан», «Магнат», «Мінск», «Мінск суперслімс», «Прэм'ер», «NZ», «VIP», «Queen Superslims». Павышаныя цэны на цыгарэты «Alliance» і «Viceroy», якія выпускаюць на фабрыцы па праграме імпартазамяшчэння, — на 7,7 працэнта і 7,9 працэнта адпаведна. Зацверджаная рознічная цана на новы від цыгарэт «Gauloises Blondes» у памеры 2700 рублёў за адзін пачак.

Ігар ГРЫШЫН.

БАНКАЎСКІЯ СПАКУСЫ

Больш за 44 мільёны рублёў выкрала супрацоўніца аднаго з банкаўскіх філіялаў у Жлобіне.

Для таго, каб ажыццявіць шматэтапную фінансавую аперацыю, 45-гадовая загадчыца сектара шляхам неабгрунтаванага ўстанаўлення лімітаў овердрафтаў па карт-рахунках, адкрытых на імя пяцярых грамадзян і на сваё імя, залічвала на гэтыя карт-рахункі грашовыя сродкі банка, якія потым абнаявіла і выкрала.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У НАТАРЫУСАЎ ПАВЫСЯЦЦА ТАРЫФЫ

Размова — пра тарыфы на дадатковыя платныя паслугі прававога і тэхнічнага характару дзяржаўных натарыяльных кантор, якія павялічаныя пастановай Мінэканомікі ў сярэднім на 4,5 %.

Неабходнасць павышэння тарыфаў абумоўленая ўвядзеннем у дзеянне з 1 студзеня гэтага года Асаблівай часткі Падатковага кодэкса і павелічэннем стаўкі падатку на дабаўленую вартасць з 18 да 20 %, а таксама павышэннем памераў надбавак да службовых акладаў дзяржслужачых.

Ігар ГРЫШЫН.

«БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ БУДЗЕ ЎМАЦОЎВАЦЦА...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На яго думку, у Беларусі, працуючы з насельніцтвам, трэба выкарыстоўваць толькі нацыянальную валюту, а долары, еўра, расійскі рубель выкарыстоўваць толькі за межамі краіны — пры паездках на адпачынак альбо ў камандзіроўкі. «Калі мы пачнём выдаваць крэдыты ў замежнай валюце, то рызыкі, у тым ліку ад хістання курсаў, мы перакладаем на сваё насельніцтва, — заўважае ён. — Што мы можам зрабіць, калі заўтра нешта здарыцца з адной з вядучых валют... Нашы грамадзяне атрымліваюць зарплату ў беларускіх рублях, і чаму яны павінны аддаваць крэдыты ў долярах, еўра, шукаць іх, купляць? Які сэнс у гэтым?» Цяпер жа праблема ў тым, што стаўкі па крэдытах у беларускіх рублях больш высокія, чым па крэдытах у замежнай валюце. Яе Нацбанк мае намер вырашаць — паступова зніжаць стаўкі па рублёвых крэдытах і вывесці іх на ўзровень валютных. У прыватнасці, Пётр Пракаповіч паведаміў пра тое, што да 1 ліпеня стаўку рэфінансавання плануецца знізіць да 12 працэнтаў гадавых. Гэта значыць, пойдуць уніз і стаўкі па крэдытах, якія сёлета прадугледжваецца знізіць да 12-15 працэнтаў гадавых. «Мы не будзем зацягваць гэтую працу да канца года, — адзначыў галоўны банкір. — Мы плануем завяршыць пераход на дакрызісныя працэнтныя стаўкі ўжо ў першым паўгоддзі. Мяркую, што да канца першага паўгоддзя нам удасца выйсці на гэтую працэнтную палітыку».

Адказваючы на пытанні журналістаў, Пётр Пракаповіч таксама паведаміў, што не выключае заключэння новага пагаднення з Міжнародным валютным фондам аб рэалізацыі праграмы стэнд-бай пасля заканчэння дзейнай праграмы. Між іншым, дзейная праграма будзе завершаная ў першым кварталe гэтага года, пасля чаго «мы прыступім да перагавораў аб далейшым супрацоўніцтве з МВФ». Кіраўнік Нацбанка заўважыў, што супрацоўніцтва з МВФ будзе толькі ўзрастаць як з пункту гледжання тэхнічнай падтрымкі, так і пры неабходнасці прыцягнення наступных пазык.

«У БЕЛАРУСІ ПЛАНУЕЦЦА...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ», АБО «БЕЛАРУСЬ». ТРЭЦЯГА НЯМА

«Назва нашай краіны дакладна замацавана заканадаўствам: Рэспубліка Беларусь, альбо Беларусь, — адзначыў міністр юстыцыі. — Нягледзячы на гэта, у асобных сродках масавай інфармацыі, дзяржаўных і іншых арганізацыях некаторых замежных краін не ўжываюць афіцыйную назву нашай краіны». У сувязі з гэтым быў накіраваны ліст з пажаданнямі называць беларускую дзяржаву правільна ў Міністэрства юстыцыі Расіі. Расійскі бок цалкам прызнаў сваю памылку. «Згодна з інфармацыяй, якая да нас паступіла, наша просьба перададзена ў адміністрацыю прэзідэнта Расіі». Падобныя лісты-пажаданні беларускае Міністэрства юстыцыі плануе накіраваць сваім калегам з шэрагу іншых краін. «Я думаю, мы «разрулюем» усе пытанні з улікам дзейнага нашага заканадаўства і нормаў ААН».

ЗАСНАВАЛЬНІКІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ ПРЫ ІХ РЭГІСТРАЦЫІ І ЗБОРЫ ПОДПІСАЎ ПАВІННЫ ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА БЕЛАРУСКАГА ЗАКАНАДАЎСТВА

«Я не сказаў бы, што ў Беларусі супержорсткі парадак рэгістрацыі палітычных партый, — кажа Віктар Галаванаў. — Аб гэтым сведчыць тое, што летась сталі на ўлік і зарэгістраваліся звыш пяці тысяч новых арганізацыйных структур (у тым ліку 18 арганізацыйных структур палітычных партый). Але не трэба гэты працэс пачынаць з маніпуляцый з подпісамі. Пачынаць працэс рэгістрацыі трэба чыстымі рукамі». У якасці прыкладу міністр юстыцыі прывёў БХД (Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя), якая спрабавала зарэгістравацца з грубымі парушэннямі, і ў выніку засталася «з носам». «Мы, паверце, рады любому грамадскаму аб'яднанню, якое праявіць жаданне зарэгістравацца. Але гэта павінна быць такая арганізацыя, у якую сапраўды паверылі б людзі». Усяго ў Беларусі на сёння налічваецца 60 тысяч грамадскіх арганізацый, прафсаюзных арганізацый і іх структур, а таксама палітычных партый.

СПЕКТР НАТАРЫЯЛЬНЫХ ПАСЛУГ БУДЗЕ ПАШЫРАНЫ

Міністэрства юстыцыі плануе сёлета разгледзець пытанне аб новым відзе натарыяльных паслуг. «Мяркуецца, што натарыус зможа выязджаць на пасяджэнні арганізацый, іншых структур, каб рэгістраваць удзельнікаў пасяджэння, рашэнні, якія на ім прынятыя, подпісы. Гэта патрэбна для таго, каб пасля пазбегнуць спрэчак унутры юрыдычных структур». Акрамя таго, нагадаў Віктар Галаванаў, з 2009 года грамадзяне могуць замаўляць у ЗАГСах урачыстыя рэгістрацыі шлюбу па індывідуальным сцэнары альбо з выездам да месца правядзення вяселля. Дарэчы, у параўнанні з 2008 гадам, летась колькасць зарэгістраваных шлюбаў узрасла амаль на 2 працэнты.

Абзац

◢ Новы ўчастак працягу другой лініі Мінскага метрапалітэна, а гэта тры станцыі, плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў 2012 годзе. Пачнуць працаваць станцыі «Міхалова», «Грушаўка», «Пятроўшчына», якія будуць праходзіць уздоўж праспекта Дзяржынскага. Цяпер праектуецца трэцяя лінія сталічнай падземкі ў напрамку плошчы Казінца. Яна праляжа ад аэрапорта Мінск-1, пройдзе пад чыгункай, будынкамі па вуліцы Маскоўскай.

◢ **Споўнілася 75 гадоў з дня нараджэння вядомага спевака, народнага артыста Беларусі Зіновія Бабія. З 1963 года яго творчы лёс звязаны з беларускай сталіцай, а слава перасягнула межы былога Савецкага Саюза. Пасля цяжкай аперацыі на сэрцы спявак быў вымушаны пакінуць оперную сцэну і перайшоў да канцэртнай дзейнасці. Памёр у 1984 г.**

◢ Учарашняй ноччу самая нізкая тэмпература паветра зарэгістраваная на метэастанцыі Езярышча Віцебскай вобласці. У 6 гадзін раніцы яна склала мінус 32,6 градусы.

◢ **Каля 300 качак і 42 лебедзі выбралі месцам зімоўкі навакольле Мінска — вадасховішча Дразды, дзе птушкі ратуюцца ад моцных маразоў. Пераканаць зіму ім дапамагаюць супрацоўнікі Мінскай лесапаркавай гаспадаркі: тут арганізаваная ахова і падкормка вадаплаўных.**

◢ У Літве ў выніку спецаперацыі, у якой удзельнічалі праваахоўныя органы некалькіх краін, затрымана буйная партыя какаіну. Наркотык быў знойдзены ў кантэйнеры з марожанай рыбай, які прыбыў у порт Клайпеды. Усяго было канфіскавана 500 кілаграмаў высакаякаснага какаіну. Партыя стала найбуйнейшай з тых, што канфіскоўваліся ў Літве. Аптовы кошт канфіскаванага наркотыку складае 50—100 мільёнаў літаў (20—40 мільёнаў доларaў). У розніцу за гэты какаін наркагандляры маглі атрымаць у некалькі разоў больш. Паводле звестак паліцыі, штогод у Літву ўвозіцца каля 200 кілаграмаў какаіну. Прыкладна палову ад гэтай колькасці паліцыі ўдаецца канфіскаваць.

◢ **Больш за 200 мінчан летась скончылі жыццё самагубствам. Найбольш высокі ўзровень суіцыду быў у Ленінскім і Партызанскім раёнах сталіцы, а найбольш нізкі — у Цэнтральным, Савецкім і Партызанскім. Сярод самазабойцаў 28% — жанчыны. Па сацыяльнай прыналежнасці самая высокая ўдзельная вага прыпадае на беспрацоўных (каля 39%), далей ідуць працоўныя (31%), пенсіянеры (25%). У стане наркатычнага ці алкагольнага ап'янення самазабойства здзейснілі 87 чалавек.**

Поўны абзац

◢ У ходзе рэйду «Вучэбны аўтамабіль», які на гэтым тыдні правядзіць Дзяржаўтаінспекцыя Брэсцкай вобласці, у абласным цэнтры выяўлены выкладчык адной з аўташкол горада, пазбаўлены правоў кіроўцы. Вучэбны аўтамабіль з курсантам за рулём і пад кіраўніцтвам згаданага выкладчыка быў спынены ў ходзе рэйду. Прэцэдэнтам для больш дэталёвай праверкі стала адсутнасць у аўтамабілі вогнетушыцеля. Якім жа было здзіўленне інспектараў, калі пасля праверкі па базе ДАІ высветлілася, што ў верасні 2007 года чалавек быў пазбаўлены правоў за кіраванне аўтатранспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення! У свой час ён не здаў вадзіцельскага пасведчання, заявіўшы, што згубіў яго. Вярнуць свае правы выкладчык мог у верасні г.г. Цяпер жа ён будзе чакаць гэтай падзеі яшчэ тры гады.

◢ **Румынскі мастак у дзень нараджэння дыктатара Мікалае Чаўшэску ўсталяваў у Бухарэсце трохметровую статую Уладзіміра Леніна з шакаладу, рысу і цукерак. Сваім творам ён хацеў напомніць, што камунізм застаецца часткай гісторыі Румыніі. Скульптуру паставілі на той жа пастамент, з якога помнік Леніну быў скінуты ў 1990 годзе ў ходзе антыкамуністычных дэманстрацый. Улады далі дазвол на знаходжанне там скульптуры на працягу ўсяго аднаго дня — 26 студзеня, у дзень народзінаў Чаўшэску.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ЗІ СЕЙФА ЗНІКЛІ ЗАЛАТЫЯ ЗЛІТКІ...

У Слуцку невядомы пранік у памяшканне офіса адной з камерцыйных фірмаў і «выпатрашыў» сейф, адкуль забраў грошы і зліткі з каштоўнага металу. Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, з заявай пра ўчыненае злачынства ў міліцыю звярнулася галоўны бухгалтар фірмы. Злодзей, якому ўдалося ўзламаць сейф, завалодаў 180 доларамі ЗША, што належалі дырэктару фірмы, а таксама 1200 доларамі, 920 тысячамі беларускіх рублёў і двума залатымі зліткамі на суму 4 мільёны 366 тысяч рублёў, уладальнікамі якіх была бухгалтар. З сабой злачынца прыхапіў таксама сотавы тэлефон, што знаходзіўся ў памяшканні фірмы.

Ігар ГРЫШЫН.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «АВТОМАГИСТРАЛЬ» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания бытового помещения, об.пл. 188,0 кв.м, расположенного по адресу: Могилевская область, Чаусский район, д. Атражье. Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 5 248 349 бел. руб. Площадь земельного участка 0,6600 га. Задаток 10 % от начальной цены. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 03.11.2009. Аукцион состоится **04.02.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.02.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

Выбары-2010

ПАРТЫІ СПЯЦЬ?

Ва ўсякім разе, пры вылучэнні ў тэрытарыяльныя выбаркамы яны не надта актыўнічалі

Учора быў апошні дзень, калі працоўныя калектывы, палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні і грамадзяне маглі вылучыць сваіх прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных выбарчых камісій. Першымі навінамі распачатай электаральнай кампаніі падзяліўся сакратар ЦВК Мікалай ЛАЗАВІК:

— Усяго павінна быць сфарміравана 1495 тэрытарыяльных выбарчых камісій. У тым ліку шэсць абласных, адна мінская гарадская, 118 раённых, 12 гарадскіх — гарадоў абласнога падпарадкавання, 14 гарадскіх — гарадоў раённага падпарадкавання, 56 пасялковых і 1288 сельскіх. Столькі Саветаў у адпаведных тэрытарыяльных узроўнях павінна быць сфарміравана ў Рэспубліцы Беларусь падчас выбараў, якія маюць адбыцца. У склад гэтых камісій вылучана 13106 прэтэндэнтаў.

Хто ж яны? Лідзіруюць у гэтым рэйтынгу прэтэндэнты, прапанаваныя грамадзянамі — шляхам падачы заяў: такіх было 7216 (а гэта ні многа, ні мала 55,1 %). Замыкаюць тройку працоўныя калектывы: яны пажадалі вылучыць 1590 кандыдатур (што склала 12,1 %). Пасярэдзіне ў абсалютных лічбах апынуліся палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні — 4300 асобаў (32,8 %). Аднак доля палітпартый, як высветлілася, наогул мізэрная — яны вылучылі ўсяго 149 чалавек. Нямногім больш за адзін працэнт у агульнай масе прэтэндэнтаў!

— І потым скардзіцца, што ўключылі мала прадстаўнікоў палітычных партый у склад тэрытарыяльных камісій, будзе проста нелагічна, — кажа М. Лазавік. — Такі працэнт вылучэння можа быць і не заўважаны.

Ну, і цяпер персаналізаваная статыстыка: у адпаведнасці з інфармацыяй сакратара Цэнтрвыбаркама, Камуністычная партыя Беларусі прапанавала больш за палову кандыдатур — 82 чалавекі, Беларуская партыя аб'яднаных левых «Справядлівы свет» (раней вядомая як Партыя камуністаў Беларуская) — 21 чалавека,

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

28 студзеня 2010 г. № 4 (198)

КУП І ПРЫБЫТАК – РЭЧЫ СУМЯШЧАЛЬНЫЯ,

але пры пэўных умовах

Летась на добраўпарадкаванне Янушкавіцкаму сельсавету Лагойскага раёна было выдаткавана 3 млн рублёў. Для тэрыторыі, дзе размешчана 37 населеных пунктаў і пражывае 1677 вяскоўцаў, а летам з'яўляецца ледзь не столькі ж дачнікаў, — грошы невялікія. У 2009-м выратавалі аўкцыёны, якія сельвыканкам паспеў правесці да 1 мая, пакуль не ўвайшоў у сілу новы ўказ (у спіс сельсаветаў, якім потым дазволілі па-ранейшаму прадаваць зямлю з таргоў, Янушкавіцкі сельсавет не патрапіў).

Тым не менш за першыя чатыры месяцы 2009 года ад аўкцыёнаў сельвыканкам атрымаў 28 млн рублёў, якія накіраваў на добраўпарадкаванне: аплацію работы па распілоўцы дроў для ацяплення будынка сельскага Савета, па вывазе смецця з кантэйнераў, па расчыстцы дарог, па ліквідаванні несанкцыянаваных звалак, зносе старых дамоў і г.д. Усім гэтым займаліся работнікі мясцовага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства (КУПа).

— У нас распрацаваныя схемы вывазу смецця па ўсіх населеных пунктах, — патлумачыў **старшыня Янушкавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Валерый ГАРАЧКА**, — але яны яшчэ не цалкам укаранёныя. Пакуль што КУПаўскі трактар па графіку аб'язджае вёскі і збірае смецце з кантэйнерных пляцовак. Калі гэты механізм будзе цалкам адрэгуляваны, мы мяркуем браць з насельніцтва за гэта аплату. А да таго часу за вываз смецця КУПу пералічае грошы сельскі выканаўчы камітэт.

Дзейных міні-палігонаў на тэрыторыі сельсавета з дзясятак. Усе яны перададзены на баланс жыллёва-камунальнай службе Лагойскага раёна. Але паколькі ў яе нестае тэхнічных магутнасцяў, добраўпарадкаваннем і ўтрыманнем міні-палігонаў у асноўным займаецца КУП. Зноў жа — за грошы сельвыканкама. «Галоўная мэта КУПа — атрыманне прыбытку, таму ён «падпісваецца» на любую работу, — працягвае старшыня Савета і дзеля справядлівасці дадае: — Праўда, нейкія нескладаныя дробныя работы на карысць сельсавета КУПаўцы часам робяць і бясплатна».

Пакуль яшчэ не ўсе дарогі на тэрыторыі сельсавета перададзены на баланс дарожных арганізацый (хоць такое рашэнне на ўзроўні вобласці прынятае). Іх стан выклікае нараканні. Зімой ёсць праблемы з расчысткай.

— Часам мы ў прыватным парадку дамаўляемся з трактарыстам нашага ДРБУ, каб ён расчысціў нейкі завулачак паблізу ад свайго асноўнага маршруту, — прызнаецца Валерый Мікалаевіч. — З расчысткай цэнтральных вуліц у саміх Янушкавічах дапамагае КУП, а таксама некаторыя работнікі мясцовага ДРБУ-165, якія пражываюць у гэтым населеным пункце. Акрамя таго, яны, бывае, праязджаюць са спецтэхнікай і па суседніх вуліцах тых населеных пунктаў, праз якія праходзяць іх маршруты.

На добраўпарадкаванне на 2010 год у бюджэт Янушкавіцкага сельсавета закладзена 3 млн рублёў. Асобнага расходнага артыкула на добраўпарадкаванне дарог увогуле не прадугледжана. З улікам таго, што сельвыканкам больш не мае права праводзіць аўкцыёны, на значныя дадатковыя даходы, якія можна было б скіраваць на добраўпарадкаванне, разлічваць яму не даводзіцца.

— Зямельныя ўчасткі ў нас запатрабаваныя, — патлумачыў Валерый Гарачка, — але мы іх цяпер можам прадаваць толькі па кадастравым кошце, а гэта невялікія грошы. У нас ёсць некалькі аб'ектаў дзяржмаёмасці (будынкі былой бібліятэкі і ФАПа), якія мы рыхтуем да продажу. Ахвотныя набыць ужо ёсць. Але справы замаруджваюцца з-за таго, што сам механізм продажу даволі складаны. Некалькі нашых будынкаў здаюцца ў арэнду і таксама прыносяць пэўны даход — хоць, безумоўна, з прыбыткам ад зямельных аўкцыёнаў гэта не параўнаць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РАТАВАЦЬ НЕ АЛКАГОЛІКАЎ, А ІХ ДЗЯЦЕЙ

...Вёска Асанава занесена снегам, аднак дарога прыдатная для праезду легкавога транспарту. Разам са спецыялістам Лебедзеўскага сельвыканкама (а па сумяшчальніцтве — сакратаром камісіі па справах няпоўнагадовых) Жаннай Нядзелькай заходзім у двор звычайнай вясковай хаты. Жанна Вацлаваўна стукае ў акно: «Гаспадары дома?». Маладая жанчына, апранутая па-хатняму (цёплы вязаны світар запраўлены ў спартыўныя штаны), выходзіць на двор, глядзіць на нас усхваляваным позіркам. «Гэта журналіст з Мінска, — паказвае на мяне Жанна Вацлаваўна. — Табой, Іна, цікавіцца». «Праходзьце, — дае дазвол гаспадыня. — Толькі я сабаку патрымаю».

Іна Аляксеенка — 28-гадовая мама траіх дзяцей. І, напэўна, наўрад ці я патрапіла б да яе ў госці, калі б не адна сумная акалічнасць. У пазамінулым годзе за празмерную цягу да спіртнога Іну паставілі на ўлік у камісіі па справах няпоўнагадовых. Умовы пражывання ў сям'і былі прызнаныя сацыяльна небяспечнымі, і хлопчыкаў (на той момант у Іны было толькі двое дзяцей) забралі на часовае ўтрыманне ў прытулак... Пасля гэтага Іна кінула піць, аформіла шлюб з грамадзянскім мужам Уладзімірам, давяла да ладу хату — і праз некалькі месяцаў дзяцей ёй вярнулі.

— Хлопчыкаў не было з вамі тры месяцы? — пытаюся ў Іны.

— Тры месяцы без аднаго тыдня і трох дзён, — папраўляе яна, міжволі даючы зразумець, якое значэнне мае для яе гэта недакладнасць.

— Сумавалі?

— Вядома, — яна апускае галаву і гаворыць ледзь чутна. Побач, у калясачцы, спіць дачка, якая нарадзілася нядаўна, ужо ад Валодзі. Муж таксама дома — адпачывае пасля ранішняй змены. Хлопчыкі ў школе. Упяцярых яны жывуць у адным пакоі. У другім, за сценкай — бабуля Іны, якой належыць хата.

...Некалі класік напісаў, што ўсе шчаслівыя сем'і падобныя адна на адну, а ўсе нешчаслівыя — нешчаслівыя па-свойму. Напэўна, сёння можна было б у пэўнай ступені абвергнуць гэта выказванне.

Трынаццаць сем'яў з Лебедзеўскага сельсавета Маладзечанскага раёна, якія знаходзяцца на ўліку ў камісіі па справах няпоўнагадовых, маюць шмат агульнага: мамы там выпіваюць і гуляюць, і, як вынік, ім не хапае часу на выхаванне дзяцей і выкананне іншых абавязкаў.

Жанна Нядзелька спачатку кладзе перада мной спіс сем'яў, якія стаяць на ўліку як сацыяльна небяспечныя, няўдалыя. А потым дадае спіс так званых «абавязаных», на якіх не падзейнічалі ніякія прафілактычныя і выхаваўчыя меры, і таму ў іх адабралі дзяцей, пазбавілі бацькоўскіх правоў (такіх 21).

— І ў першай групе, і ў другой «прычына» ўсіх бедаў — маці. Калі злоўжывае спіртным мужчына, гэта яшчэ палова бяды, такую сям'ю можна выратаваць. Калі да гарэлкі прызвычаілася жанчына, «чэйка грамадства» пачынае трашчаць па швах і развальвацца, як картачны домік. — кажа Жанна Вацлаваўна.

Сігнал пра небяспечную сітуацыю ў сям'і можа паступіць адкуль заўгодна. Скажам, аб дрэннай паспяховасці ці адсутнасці на ўроках без уважлівай прычыны часта паведамляе школа. Аб скандалах — стараста вёскі або суседзі. А ў некаторых выпадках па дапамогу звяртаюцца нават бацькі сямействаў: маўляў, жонка запіла, сышла, у хаце засталіся маленькія дзеці, не магу даць рады.

Спачатку з сям'ёй спрабуюць працаваць, прымяняючы методыку ўшчуванняў. Не дапамагае — ставяць на ўлік як няўдалую, сацыяльна небяспечную. Менавіта на гэтым этапе маці і бацьку (калі ён ёсць) знаёмяць з нормамі Дэкрэта № 18, якія маюць на ўвазе далейшае адабранне дзяцей і спагнанне з бацькоў грошай за іх утрыманне. Сям'ю папярэджваюць і бяруць на кантроль. З гэтага моманту члены камісіі па справах няпоўнагадовых (і мясцовай, і раённай) маюць права наведваць яе калі заўгодна — іх абавязаны пусціць у дом у любы час сутак.

Калі праз тры месяцы сітуацыя не палепшылася, бацькі не ўладкаваліся на працу, не звярнуліся ў наркалагічны дыспансэр па дапамогу — словам, ніяк не прадэманстравалі свайго жадання выправіцца, дзяцей у іх могуць адабраць і часова змясціць у прытулак. Але і пасля гэтага ў бацькоў яшчэ застаецца шанц на выпраўленне. Іх кадзіруюць, уладкоўваюць на працу (бо з моманту адабрання дзяцей яны абавязаны выплачваць дзяржаве грашовую кампенсацыю). Але, як паказвае практыка, вельмі рэдка мацярынскі інстынкт бярэ верх над цягай да разгульнага жыцця. У пераважнай большасці выпадкаў адабранне дзяцей заканчваецца пазбаўленнем бацькоўскіх правоў.

— Перавыхоўваць дарослых людзей, у якіх «дыягназ» напісаны на твары, амаль бессэнсоўна, — кажа Жанна Нядзелька. — У нас, я лічу, вельмі гуманнае заканадаўства ў дачыненні да няўдалых сем'яў. Мы бегаем вакол іх, папярэджваем, угаворваем... Амаль што за бясцэнак прывозім на двор дровы, купляем фарбу для рамонту, забяспечваем адзеннем, працім на іх свой уласны непрацоўны час — бо наведванні часта адбываюцца ўвечары. Ахвяруем — чаго граху ўтойваць — сваімі сем'мі. Наша камісія, куды ўваходзіць дзевяць чалавек, працуе на грамадскіх пачатках. Але, усведамляючы важнасць задачы, мы выкладваемся па поўнай праграме. Хоць, на мой погляд, даўно наспела неабходнасць «спусціць» на першасны ўзровень, у сельвыканкамы, дадатковую штатную адзінку, якая займалася б прафілактычнай работай — а яе тут непачаты край!

У канцы мінулага года, расказвае Жанна Вацлаваўна, з сям'і Бурдукоў забралі двух іх дзяцей і змясцілі ў прытулак. Вечарам таго самага дня занальны інспектар Маладзечанскага РУУС Аляксандр Грымаць зазірнуў да маці сямейства. А там — поўная хата гасцей... Ледзьве звязваючы словы, жанчына патлумачыла інспектару прычыну позняга застолля: «А ў мяне — гора!».

— Праўда, днямі яна заходзіла ў сельскі Савет, прасіла дапамагчы пачаць іншае жыццё, вярнуць дзяцей. Калі жанчына сапраўды гэтага захоча, мы заўсёды дапаможам. І з кадзіраваннем, і з уладкаваннем на працу. Можна хоць сёння паехаць у суседні калгас — СВК «Заскавічы», дзе даюць жыллё. Але там прыйдзецца працаваць! А ў нашых гора-бацькоў далей за абяцанні і п'яныя слёзы справа часцей за ўсё не ідзе.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Электаральны тлумачальны слоўнік

Што ж, чарговая кампанія распачалася. І неабходныя ўмовы для старту ёсць: зацверджаны каляндарны план — тэрміны кожнага этапа выбараў, а таксама вырашана самае галоўнае пытанне, без чаго немагчымыя ні адны выбары — размеркаваныя грошы на іх. Так, у сярэднім адной участковай камісіі можна будзе патраціць каля 1,7 млн рублёў. Цалкам жа выбарчая кампанія абыдзецца дзяржаўнаму кашальку ў 19,5 млрд рублёў. Куды пойдуць грошы? На абсталяванне памяшканняў для галасавання, друкарскія мэты, расходы кандыдатаў у дэпутаты, набыццё канцылярскіх прыладаў, аплату паслуг сувязі і транспарту, заробкі супрацоўнікаў выбаркамаў...

На мінулым пасяджэнні ЦВК таксама быў вызначаны парадак накіравання назіральнікаў на пасяджэнні выбарчых камісій і ўчасткі для галасавання.

— Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі, дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў, даверaныя асобы кандыдатаў маюць права быць назіральнікамі на пасяджэннях выбарчых камісій і на ўчастках для галасавання без папярэдняга паведамлення аб тым, што яны будуць прысутнічаць, — патлумачыла **член Цэнтрвыбаркама Надзея КІСЯЛЁВА**. — Яны паказваюць дакумент, якія пацвярджае іх статус. Калі парламентарыі маюць права быць назіральнікамі ў любой камісіі і на любым участку, то дэпутаты мясцовых Саветаў — толькі на пасяджэннях выбаркамаў і ўчастках, размешчаных на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, у склад мясцовага Савета якой яны абраныя.

Нядаўнія папраўкі ў выбарчае заканадаўства пашырылі правы назірання для палітычных партый:

— З улікам змяненняў выбарчага заканадаўства прадугледжана, што палітычная партыя, іншае грамадскае аб'яднанне, працоўны калектыў арганізацыі ці калектывы яе структурных падраздзяленняў, а таксама група выбаршчыкаў могуць накіроўваць назіральнікам свайго прадстаўніка. Прадстаўнікі могуць не з'яўляцца членамі палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання, працоўнага калектыву. Арганізацыі і грамадзяне накіроўваюць у камісію аднаго прадстаўніка, аднак са згоды камісіі могуць накіроўваць і большую колькасць.

Было таксама патлумачана, якім чынам накіроўваюцца назіральнікі. Скажам, кіруючыя органы палітпартый, іншых рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў могуць накіроўваць назіральнікаў на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі, абласныя арганізацыйныя структуры партыі і ГА — на пасяджэнні абласных, акруговых і ўчастковых выбаркамаў, а таксама ўчасткі для галасавання, размешчаныя на тэрыторыі вобласці, і гэтак далей. Адпаведна, первічныя арганізацыі — на пасяджэнні ўчастковага выбаркама і ўчастак для галасавання, на тэрыторыі якога знаходзіцца пярвічная арганізацыя. Назіральніка можа накіроўваць і звычайная група выбаршчыкаў (пры ўмове, што іх не менш чым 10 і пражываюць яны на адпаведнай тэрыторыі) — для гэтага трэба будзе падпісаць заяву.

— Працэдура акрэдытацыі назіральнікаў вельмі простая, — падкрэсліла Надзея Кісялёва, — уносіцца запіс у журнал акрэдытацыі назіральнікаў на падставе прад'яўленых дакументаў. Дакумент аб накіраванні назіральніка павінен быць пададзены ў адпаведную камісію не пазней за дзень, які папярэднічае дню пасяджэння, дню галасавання. Паўнамоцтвы назіральніка ва ўчастковай выбарчай камісіі і на ўчастку для галасавання спыняюцца пасля падвядзення вынікаў падпісу галасоў на ўчастку, а ў астатніх камісіях — пасля ўстанаўлення вынікаў выбараў.

Член Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў зрабіла акцэнт на тым, што прадстаўнікі СМІ назіральнікамі не з'яўляюцца, аднак пры асвятленні выбарчай кампаніі яны маюць права прысутнічаць на пасяджэннях усіх выбаркамаў і на ўчастках для галасавання, у тым ліку пры падліку галасоў.

Вялікая ўвага была нададзеная растлумачэнню **парадку збору подпісаў у падтрымку кандыдатаў**. Адпаведныя палажэнні Выбарчага кодэкса зазналі істотныя змяненні падчас нядаўніх заканадаўчых рэнавацый. І хоць абноўленыя нормы куды прасцейшыя за папярэднія, яны маюць патрэбу быць патлумачанымі асабліва, бо папросту пакуль незнаёмыя шырокай грамадскасці. Збор подпісаў у календары бягучай электаральнай кампаніі прызначаны з 14 лютага па 15 сакавіка. Ён можа весціся толькі членамі ініцыятыўнай групы (у іх пры сабе павінны быць дакумент, які сведчыць асобу, і спецыяльнае пасведчанне, выдадзенае адпаведным выбаркамам).

— Не дапускаецца збор подпісаў у падпісных лістах, у якіх адсутнічаюць звесткі пра асобу, што вылучаецца ў кандыдаты, — падкрэсліла Надзея Кісялёва.

Так што, шаноўныя выбаршчыкі, будзьце пільнымі. Падтрымаць сваім подпісам нейкага кандыдата можа кожны грамадзянін Беларусі, якому ўжо споўнілася 18 і які валодае выбарчым правам (а таксама грамадзянін Расіі, які пастаянна пражывае на тэрыторыі нашай дзяржавы). Дарэчы, мы маем права раздаваць свае подпісы направа і налева — у сэнсе, падтрымаць такім чынам адразу некалькі кандыдатур, якія спрабуюць вылучыцца па адпаведнай выбарчай акрузе. Аднак за адну і тую ж асобу двойчы падпісацца не атрымаецца — у падпісным лісце мы можам зрабіць толькі адзін подпіс.

— Збор подпісаў можа праводзіцца ў форме пікетавання, — адзначыла новаўвядзенне выступоўца. — Спецыяльнага дазволу на гэта не патрабуецца — калі яно праводзіцца ў месцах, не забароненых мясцовымі распарадчымі і выканаўчымі органамі.

Па-новаму будуць і завярацца падпісныя лісты:

— Цяпер яны завяраюцца самімі членамі ініцыятыўнай групы, а раней іх трэба было засведчваць у мясцовых выканаўчых і распарадчых органах.

Ала МАЧАЛАВА.

* * *

Пройдзеная ўжо невялікая вешка буйной кампаніі — 26 студзеня завяршылася вылучэнне прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных выбаркамаў (абласных, Мінскай гарадской, раённых, гарадскіх — у гарадах абласнога і раённага падпарадкавання, пасялковых і сельскіх тэрытарыяльных выбарчых камісій). Ужо заўтра ўсе камісіі павінны быць сфарміраваныя (прэзідыумамі адпаведных Саветаў дэпутатаў і выканкамаў).

Напарадзе — утварэнне выбарчых акруг. Іх спіс (з указаннем найменняў, нумароў, межаў, колькасці выбаршчыкаў, месцаў знаходжання выбаркамаў) будзе апублікаваны не пазней за трэцяга лютага. Вылучэнне прадстаўнікоў у склад акруговых выбарчых камісій адбудзецца да 5 лютага, а ўчастковых — да 7 сакавіка.

*Пра новыя асаблівасці цяперашняга этапа, што ўзніклі пасля заканадаўчых зменаў, мы папрасілі расказаць **сакратара ЦВК Мікалая ЛАЗАВІКА**.*

— Змяненні і дапаўненні, унесеныя ў выбарчае заканадаўства, далі магчымасць палітычным партыям і грамадскім аб'яднанням больш актыўна ўключыцца ў працэс фарміравання выбарчых камісій. Цяпер для гэтага не патрабуецца наяўнасць ніжэйшай арганізацыйнай структуры партыі ў канкрэтнай мясцовасці. А гэта для іх своеасаблівая індульгенцыя, палёгка ў арганізацыйнай рабоце, што асабліва адчувальна для партый, якія не маюць разгалінаванай структуры і канцэнтруюцца ў гарадах. Ім цяпер усе карты ў рукі, каб праявіць сваю палітычную актыўнасць.

Паглядзім, ці скарыстаюць яны гэтыя магчымасці...

ВЫГАДА ДЛЯ СЕЛЯНІНА

БУЛЬБА ЗАМЕСТ МАЛАКА?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Невысокія памеры заробкаў і пенсій з'яўляюцца амаль што «традыцыйнымі» асаблівасцямі вёскі. Праўда, у параўнанні з большасцю гараджан тыя ж вяскоўцы маюць пэўную перавагу: магчымасць атрымліваць дадатковы даход ад прысядзібнай гаспадаркі. Аднак само стаўленне да гэтай крыніцы паступова змяняецца. Практыка апошніх гадоў сведчыць пра тое, што «ўласнікі» надаюць усё меншую ўвагу малаку. І ў той жа час больш актыўна зарабляюць на агародніне.

Праблема — вольны час

Свае малако, смятана і масла, а калі застаюцца лішкі — то і магчымасць зарабіць на хлеб. Не сакрэт, што амаль заўсёды карова лічылася асновай любой сялянскай гаспадаркі, сапраўднай «карміцелькай сям'і» і стабільнай крыніцай даходу. Аднак гэта — ужо амаль у мінулым. Цяпер на 11 тысяч «прыватных» падворкаў Стаўбцоўскага раёна прыпадае ўсяго 1,4 тысячы рагуль. І іх колькасць скарачаецца штогод.

— Усім, хто трымае кароў, аказваецца падтрымка, — распавядае старшыня райсавета Уладзімір Бычко. — Сёння няма праблем з выпасам жывёлы, кожны можа атрымаць як мінімум паўгектара пашы. Не ўзнікае праблем з кармамі, пры гэтым, як правіла, іх нарыхтоўкай займаюцца сельгаспрадпрыемствы — замест таго, каб касіць самастойна, людзі маюць магчымасць атрымліваць ужо гатовае сена з дастаўкай на ўласны падворак. Тыя ж СВК практыкуюць выдачу збожжа «на зароблены» рубель. У дадатак практычна паўсюль наладжаная закупка малака, выключэнне тут складаюць толькі вельмі малыя і аддаленыя вёскі. Аднак наяўнасць дапамогі не змяняе агульнага малюнка — жаданняў зарабляць становіцца ўсё менш.

Догляд каровы — заўсёды цяжкая праца, тым часам насельніцтва вёскі пакрысе старэе, змяншаецца колькасць людзей, у якіх «хапае сілаў». Аднак гэта — прычына не адзіная. Пачынае адыгрываць усё большую ролю і развіццё сельгаспрадпрыемстваў. З аднаго боку, праца тут становіцца больш інтэнсіўнай, яна забірае шмат часу, а адсюль абвастраецца праблема «выбегчы на абед». Калі падаіць і пакарміць карову ранкам ці ўвечары яшчэ рэальна, то зрабіць тое ж у сярэдзіне дня могуць толькі сем'і, дзе ёсць падлеткі або пенсіянеры. Пры гэтым заробкі ў СВК растуць. А дэфіцыту малочных прадуктаў у вясковых крамах даўно не існуе.

Сістэмы крэдытавання, прывабнай для большасці сялян-прыватнікаў, па сутнасці няма. А яна патрэбная.

— Многія, асабліва моладзь, лічаць, што малочныя прадукты лепш купіць, асабліва калі ўзяць пад увагу невялікія закупныя цэны — 660 рублёў за літр, — працягвае Уладзімір Бычко. — Дзеля справядлівасці скажу, што самі людзі знаходзяць і выйсце. У нас ёсць прыклады, калі ўласныя падворкі здаюць у год 15 і больш тон малака, але ёсць і іншыя рэаліі: здачай займаецца толькі кожны другі ўладальнік кароў. Бо хтосьці прадае лішкі па 1000—1100 рублёў за літр на рынку, іншыя могуць атрымліваць такія ж грошы пры рэалізацыі малака дачнікам, трэція — і гэта адна з новых тэндэнцый — носяць малако суседзям-пенсіянерам, дзеці якіх з'ехалі ў горад, а цяпер згодныя плаціць і такім чынам падтрымліваць сваіх бацькоў.

Нарэшце, некаторыя перапрацоўваюць малако самі, робяць добрыя смятану і тварог, вараць смачныя сыры, а потым «кааперуюцца» з суседзямі і па чарзе возяць прадукцыю на рынак у горад. Балазе, попыт ёсць — па сутнасці тут ужо склалася сталае кола пакупнікоў.

Займацца лепш... усім

Адным з вынікаў скарачэння статку «прыватных» кароў стала змяншэнне ва ўласных гаспадарках колькасці свіней. Кіслае малако ці сыроватка традыцыйна ўваходзілі ў «рацыён» парсюкоў, без гэтага выкарміць свойскую жывёлу складана. Тым не менш пакуль свінагадоўля — напрамак больш папулярны. Свіней маюць пад 70 працэнтаў вяскоўцаў раёна: адны выключна «для ўласнай патрэбы», а іншыя — на продаж. Прычым, тут перавага таксама аддаецца гандлю на рынках.

— На жаданне трымаць свіней уплывае тая ж завяздзёнка выдаваць збожжа на зароблены рубель у сельгаспрадпрыемствах, — заўважае Уладзімір Бычко. — Акрамя таго, людзі прыстасоўваюцца да новых рэалій, напрыклад, апошнім часам у раёне ўсё часцей саджаюць гарбузы. Культура гэта не «капрызная», сам па сабе прадукт — карысны і да таго ж выгадны пры кармленні свіней. Гарбузы не трэба гатаваць — іх дастаткова пасекчы і дадаць крыху мукі.

Зноў жа даволі распаўсюджанай крыніцай даходаў становяцца агуркі, капуста, цыбуля, морква. Некаторыя вяскоўцы наважваюцца на «замену» старых садоў і вырошчваюць таварныя яблыкі. І практычна ўсе займаюцца бульбай.

— Пры гэтым большасць не робіць стаўку на нешта адно, — адзначае Уладзімір Бычко. — Калі настае выхадны, нашы людзі могуць загрузіць у легкавік 3-4 мяшкі бульбы, скрыню яблыкаў, крыху морквы, цыбулі — і рушыць на Мінск. Там пастаяць на рынку, атрымаюць 200—300 тысяч рублёў, пройдуцца па крамах, а праз тыдзень вязуць новую партыю. Справа відавочна выгадная. Але галоўнае тут — прапанаваць танную і якасную прадукцыю.

Падтрымка «б'е» па беспрацоўі

У свой час для падтрымкі ўласных гаспадарак у раёне вывучалі магчымасць стварэння камунальных унітарных прадпрыемстваў. Але ад ідэі вырашылі адмовіцца. Бо дапамогу ў апрацоўцы ўчасткаў аказваюць жыллёва-камунальная гаспадарка, «быткоўка», фермеры і, безумоўна, сельгаспрадпрыемствы. Пры гэтым пралічылі: з улікам большых аб'ёмаў работ іх паслугі ў параўнанні з КУПамі абыдуцца вяскоўцам танней.

Што ж да якасці прадукцыі, то тут гаворка асобная. Яблыкі з садоў 30-гадовага «ўзросту» могуць пайсці хіба што на перапрацоўку. Гэтаксама нельга атрымаць вартыя грошы і за дробную бульбу. Цяпер ці не кожны ўжо разумее: варты даход з уласнай гаспадаркі могуць даць толькі папярэднія ўкладанні. Але набыццё высокапрадукцыйных гатункаў — гэта грошы. Разам з тым, прывабнай для большасці прыватнікаў сістэмы крэдытавання па сутнасці няма. А яна патрэбная. Тое, што вяскоўцы трымаюць усё менш коней, не так страшна. Праблему з апрацоўкай глебы і перавозкай прадукцыі магла б цалкам «зняць» міні-тэхніка, прычым кошт мотаплуга або мотакультыватара «завоблачнымі» назваць нельга. Бяда ў іншым: адшукаць «цяпер і адразу» 3,5-5 мільёнаў рублёў магчыма не заўсёды.

— Наўрад ці варта разлічваць, што прыватнікі з рыдлёўкай і віламі накормяць краіну, будучыня якраз за буйнымі сельгасвытворцамі — выдаткоўваць сродкі на сучасныя тэхніку і тэхналогіі змогуць толькі яны, — зазначае Уладзімір Бычко. — Але несумненна і тое, што ўласным гаспадаркам неабходная падтрымка. Разгалінаваная сістэма дзяржаўных датацый, вызначэнне больш высокіх у параўнанні з рынкавымі закупных цэнаў на сельгаспрадукцыю ў краінах Захаду тлумачыцца не толькі жаданнем матэрыяльна падтрымаць жыхароў вёскі. Бо не ў апошнюю чаргу там перакананыя: прэферэнцыі — сродак супраць беспрацоўя.

Магчыма, падтрымка прыватніка больш прывабнымі цэнамі — насамрэч «лішнія» выдаткі. Аднак не сакрэт, што тэма «незапатрабаваных» працоўных рук становіцца актуальнай і для нас. Дзякуючы пераабсталяванню жывёлагадоўчых фермаў, неабходнасць у супрацоўніках тут скарацілася ў 3-4 разы, сёння ўжо няма сэнсу прыцягваць сотні чалавек для праполкі цукровых буракоў — 500 гектараў здольныя апрацаваць усяго 6 механізатараў. Словам, цяжкасці з працаўладкаваннем — перспектыва даволі рэальная. У той жа час зразумела: развіццё прыватных гаспадарак можа павялічыць колькасць фермераў. І, адпаведна, зменшыць напружанне з занятасцю ў вёсцы.

Сяргей ГРЫБ.

Стаўбцоўскі раён.

ЗАДАЧА ДЛЯ «ЗАРЫ»: НАКАРМІЦЬ ПАЛЕССЕ

«АГРАРНЫ СЕКТАР — НЕКРАНУТЫ КУТОК БІЗНЭСУ. А МАЗЫРСКІ РАЁН — ДРУГАЯ ГАЛАНДЫЯ»

(Працяг. Пачатак на стар. 1.)

Крыху пазней да нас далучылі некалькі больш слабых калгасаў, мы прынялі на сябе іх страты. Гаспадарчым спосабам падбудавалі цэх забою жывёлы і цэх перапрацоўкі, па сутнасці — невялікі, кампактны мясакамбінат, які цяпер выпускае 62 віды каўбасных вырабаў, 40 — вэнджаных і 70 — паўфабрыкатаў, усяго за змену 7—10 тон прадукцыі. Адзін за адным узвялі ўласныя аб'екты гандлю, бо вытворчасць павялічылася ў разы. Калі мы пачыналі працаваць, то ўдзельная вага гаспадаркі ў рэалізацыі прадукцыі жывёлагадоўлі ў раёне была 10 працэнтаў. Летась паказчык перавысіў 70 працэнтаў. Як кажуць, адчуйце розніцу.

Ад аўтаўру. Праз пяць гадоў працы вытворчыя паказчыкі «Зары» былі такімі, што Уладзіміру Дворніку прысвоілі званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь». Па выніках гаспадарчай дзейнасці за 2000 год у рэйтынгу сто лепшых сельгаспадпрыемстваў Беларусі, складзеным Акадэміяй навук, «Зара» заняла другое месца пасля агракамбіната «Сноў». А ўжо ў 2003-м роўных ёй па прыбытковасці — памеры прыбытку ў разліку на бала-гектар — у краіне не знайшлося, яна займае першае месца. (Забягаючы наперад, зазначым: і паўтаране гэты вынік у 2007 і 2008 гадах.)

Гаспадарку наведаў Прэзідэнт А.Р. Лукашэнка. Ён ухваліў маладога дырэктара за высокую культуру і эфектыўнасць вытворчасці і парэкамендаваў вопыт «Зары» да пашырэння. Патрабаванні, выказаныя кіраўніком краіны падчас знаходжання ў Гомельскай вобласці, паслужылі новымі арыенцірамі для калектыву. Па выніках працы за 2006 год ён быў занесены на Рэспубліканскую дошку гонару. Нагорш, за трынаццаць гадоў работы па-новаму калектыў сем разоў выходзіў перамажцам спаборніцтва з занясенneным на Рэспубліканскую дошку гонару.

— У ходзе візіту Прэзідэнта атрымала пазітыўную ацэнку і ваша практыка арганізацыі фірменнага гандлю, якая дазваляе вытворцам сельгаспрадукцыі мець жывыя грошы...

— Саўгас-камбінат разгарнуў цэлую істопна пашырае ўласную гандлёвую сетку. Ён не байцца канкурэнцыі з боку буйных мясакамбінатаў. Тым больш што прадукцыя запатрабавана.

— Скажыце, а тэўстасценныя памяшканні для ўтрымання жывёлы, якія таксама прыцягваюць увагу вашых гасцей, — гэта чыя была ідэя?

— Такую «крамольную» думку (бо яна ішла ў разрэз з існуючымі СНІПамі) я прывёз з семінара на Брэстчыне, падчас якога мы наведалі Белую вежу ў Каменцы і пабачылі як трохметровыя ў таўшчыню сцены, якія дазвалялі людзям пры любой асадзе знаходзіцца ўнутры працяглы час. Там не быває холадна — за кошт цяпла, якое выдзяляе цела чалавека. Зараз усе жывёлагадоўчыя памяшканні ў «Зары» маюць па гэтым прынцыпе нетрадыцыйную таўшчыню сцен — да метра, што дазваляе не баяцца за здароўе пагалоўя і ў выніку эканоміць мільёны. Не патрабуюць падагрэву нават птушнікі, нясучыя самі абаграваюць сябе. А раней дымілася кацельня і спальвала ў сваіх топках народныя грошы. Цеплавую энергію пастаўляла і раённая ЦЭЦ, пакуль мы не адмовіліся ад яе паслуг.

— Свае жывёларазвядзенчыя кропкі ў 1996-м і пазней вы і тыя, хто вам дапамагаў, вырашылі не толькі вытворчыя праблемы, але і паспрыялі таму, што ў працоўным калектыве, у сем'ях усталяваліся нармальны маральна-псіхалагічны клімат, няма п'янства.

— Эфектыўна гаспадарыць на зямлі можна толькі ў такой атмасферы. З цяжкой галавой. П'янага работніка нават жывёла цярпець не будзе.

— Калі вы згаджаліся на сённяшнюю пасаду, то разумелі, што даведзецца кіраваць не адной гаспадаркай, а ўсімі аграрыямі раёна. Не кажучы ўжо пра горад — буйны індустрыяльны цэнтр. Але мы сённяшнія гаворым пра справы ў вёсцы. Якімі вам бачацца ўзаемадносіны «вертыкалі» з аграрным сектарам эканомікі?

— Я цяжка сыходзіў з гаспадаркі, для мяне гэта было складана і крыху трывожна. Калі ўжо так здарылася, што зараз працую тут, то буду старацца, каб лепшае, што накоплена працоўнымі калектывамі горада і раёна, захавалася, у тым ліку вытворчыя здабыткі і сапраўды цудоўны маральны, псіхалагічны клімат «Зары». Каб таго таўшчыню калектыўны вопыт стаў заходнім пунктам для далейшага развіцця Мазырскага края. Магчыма, мы зможам дапамагчы гаспадаркам наблізіцца да ўзроўню «Зары». Асабіста я лічу, што аграрны сектар сёння — гэта некраны куток бізнэсу. Гэтую агульную для нас усіх перспектыву проста патрэбна разумець, па-расійску кажучы, прочувствовать. І мае першыя крокі на новай пасадзе скіраваны на тое, каб перабудаваць людзей у гэтым накірунку. Перакананць іх. Бо слай такія пытанні не выпрашаюцца. Я хацеў бы, каб з боку кожнага кіраўніка гаспадаркі, кожнага, без перабольшання, спецыяліста было дасягнута разуменне таго, што ён робіць. І разуменне, як дабіцца, каб прадукцыя пайшоў і фермер быў рэнтабельнай і прыносіла карысць, грошы і — звычайнаю чалавечую радасць. Як гэта ні дзіўна гучыць, але не ўсе разумеюць, што яны робяць.

Будучыня ў нас ёсць, мазырскі рэгіён быццам спецыяльна створаны для жывёлагадоўлі, гэта другая Галандыя. І роля «вертыкалі» ў тым і заключаецца, каб прывезці ў дзяленне багатыя магчымасці — прыродныя, кадравыя, эканамічныя. Выкарыстаць наяўны патэнцыял, каб у выніку атрымаць умовы для рэалізацыі праграм сацыяльнага развіцця края, за якімі — жывыя людзі. З такім настроем працуем я і мае калегі.

Калі гаварыць пра крызіс, рэха якога дакацілася і да нашых абшараў, то жыццё перакоснае, што бязвыхадных сітуацый не бывае. Толькі выйсце варта шукаць не самому, не аднаму, а разам з людзьмі, якім не менш, чым табе, патрэбна удалае раашэнне. Зыдсёды карысна дзяверыцца спецыялісту. Мы ў «Зары» заўсёды толькі так і працаавалі. Усё, што там зроблена, зроблена дзякуючы калектыўнай думцы і агульнаму стараанню. Хацелася б дабіцца такой аднадушнасці і ў машабах раёна.

— Мінулы год быў дастаткова складаным для эканомікі. Як мазыране завяршылі яго — у гарадзе і вёсцы?

— Важна, што і прамысловасць, і аграрны сектар выказалі практычна зроблена дзякуючы калектыўнай дуль- ўсе прагнозныя паказнікі. Безумоўна, ў адных калектывах гэта атрымлівалася лепш, у іншых — крышку інакш, тым не менш у цэлым вынікі года нармальныя. Ёсць некаторыя праблемы з рэалізацыяй прадукцыі, але атмасфера ў калектывах здаровая, маркетынгавыя службы працуюць прафесійна, і ўсё павінна наладзіцца.

Аператар Любоў ДЗЯНІСЕНКА і начальнік участка № 2 Андрэй БАКЛАН паказалі нам і маленькіх, і дарослых сваіх задаванцаў.

3. ЗУБРЫ З «ЗАРЫ»

Наш наступны суразмоўца — кіраўнік аддзялення № 1 **Аляксандр СВІСТУН:**

— Барбарова — адно з вытворчых падраздзяленняў гаспадаркі. Тут некалі быў адстаюч калгас «Серп і молат», які ў 2000 годзе далучаны да свінакомплексу.

Зараз мы з вамі на ферме «Млынок», дзе ўтрымліваюцца цялушкі, бычкі на дарошчванні, знаходзіцца адкормачнік. Усяго паўтары тысячы галоў жывёлы. Працуе толькі шэсць чалавек. Кармленне — двухразовае, утрыманне — беспрывязное, на глыбокай падсцілцы.

Утрыманне жывёлы ў нас кардынальна адрозніваецца ад практыкі іншых гаспадарак. Калі паўсюдна жывёла ўтрымліваецца на ланцугах, на падлогах, то ў нас жывой істоце дадзена больш волі, і на тоўстым слоі цёплага подсцілу ёй куды больш камфортна. Самае галоўнае, каб было суха. У нас гэта ўмовы, якія ў Беларусі ў 3 мільярда. У гэтых двух лагерах утрымліваецца ў летні час больш за 700 галоў, у зімовы перыяд — 550.

Жывёла на паўнавартасным сіласна-канцэнтратным рацыёне атрымлівае па 9 і больш кармавых адзінак. Тэмпература пітной вады падтрымліваецца на ўзроўні 5—7 градусаў з «плюсам», нават калі на дварэ было мінус 21. Бычкі паелі, папілі і гуляюць па прасторнай выгарадзьі, што хочуць, тое і робяць. Спяць таксама тут, пад навесам, абсталяваві ім «спальны месцы» — боксы, у якія жывёла кладзецца на падсцілку. Гэта таксама навука Уладзіміра Андрэевіча: «Паназіраўшы цяхенька, як жывёла сябе паводзіць. Яна табе падкажа, што ёй патрэбна». Так і ёсць. У пяць гадзін раніцы едзем на працу, глядзім — усе адпачываюць, ніводная не топчацца каля кармавога стала.

Кормім — у адзін час, узвавакаем — у адзін дзень месяца, жывуць яны спакойна, без стрэсаў. У мінулым месяцы, у снежні, нагулялі на свежым паветры такі апетыт, што далі па 900 грамаў прыбаці. А месяц быў, калі памятаеце, халодным. У летні перыяд тут, на лагеры, прываі перавышаюць кілаграм (1100—1170). Як і ў памяшканні на глыбокай падсцілцы. Восьмі паглядзіце, бычкі падышлі да кармушак — якія яны чыстыя, бо ў лагеры чыста, і якія ў іх апноткава круглыя спіны. Не мерзнуць, не хварэюць, у нас нямя падзяжу, усе здаровыя. Гэта ж не бычкі, а сапраўдныя зубры з Палесся.

За месяц-паўтара бычок круглее, становіцца укормленым, і ў свой цэх перапрацоўкі мы адпраўляем у год больш за 1200 галоў высокай кандыцыі. І не разумеем тых гаспадароў, у якіх жывёлы стратная.

Аляксандр Аляксандравіч пазнаёміў нас і з умовамі ўтрымання і тэхналогіяй вырошчвання зусім маленькіх цялят, а таксама цялушак больш сталага ўзросту. Падзяліўся вопытам племянной работы. Цікава, што пастаўленая яна такім чынам, каб жорстка рэгуляваць раўнамернасць ацёлаў. Гэта дазваляе прымацць прадукцыйнасць дойнага статку на адным узроўні, летам і зімку малака надойваецца адналькава. Значыць, паступае яно ва ўласны перапрацоўчы цэх раўнамерна, і там няма прычын для прастояў ці наадварот, штурмавічыны. Нагрузка на даярку, на цялятніцу таксама раўнамерная.

— З лагера, калі жывёлы дасягнулі 380—400 кілаграмаў жывой вагі, іх перавозім вось у гэтае памяшканне, на заключны адкорм, — вядзе нас далей Аляксандр Свістун. — Набіраюць тут масу 500 і больш кілаграмаў. А гэта ў выніку дае больш чым 700 тон высакаякаснай ялавічыны. Тэмп здачы залежыць ад загрузкі нашага цэха перапрацоўкі.

Тэхналогія тут таксама грунтуецца на бесприкормным утрыманні жывёлы на глыбокім подсцілне. Не шкадуем рулонаў саломы. Па графіку з дапамогай спецыяльнага навясноага абсталявання на трактар класа МТЗ ідзе выдзеленне гною. Бачыце, у агульным стойле чыста, суха, мякка, цёпла, жывёла — чыстая. Сцены свежавыбеленыя, даражэі вымеценыя, паветра свежае — ніякіх «арамататў», санаторый адным словам. Вось адкуль бярэцца штодзённая прывара больш за кілаграм.

Памяшканні ўсе адкрытыя, летам і зімой. Зачынілі — пагаршаецца мікраклімат. Бо адкрыў жывёлі свабоду тэмпературу дае і гной. Ад выпарэнняў з'явіцца вільгаць, сцены і столь пачнуць цямнець. Праўда, там, дзе ўтрымліваюцца маленькія цяляты, дзверы з аднаго боку зачыняем.

Участак птушкагадоўлі ўзначальвае Ніна МІШОТА. Аператар Аляксей МІШЧАНКА і вятурач Станіслаў ЧАРНІКАЎ прадстаўляюць тут кагорту маладых працаўнікоў.

4. ПРЫВУЧЫЛІ ПЯСТРУШКУ ПРЫХАРОШВАЦЦА

На малочнатварнай ферме, дзе таксама стаіць высокапрадукцыйная жывёла, прыбранне — кожныя два дні, каб вымя ў каровы, ды і сама яна былі чыстымі. Прадугледжана, здаецца, да дробязяў, нават мачымасць каровы («прыхарашышца») — пачасаць шыю, спіну, для чаго закуплі спецыяльныя масажныя шчоткі і гарызантальна ўстаявалі на вышыні росту жывёлы.

— Вось тут утрымліваем 400 галоў дойнага статку, — тлумачыць начальнік участка **Віктар ВІТКОУСКІ.** З першага дня пасля заканчэння інстытута ён — у «Зары». Стаў прафесіяналам сваёй справы, шмат вядае і умее.

— У кожнай групы кароў свой рацыён — у тых, якія знаходзяцца ў запуску, у тых, якія раздойваюцца пасля ацёлу, і ў астатніх, у залежнасці ад надою.

Першы час пасля ацёлу маладое «папаўненне» ўтрымліваецца разам з маці, потым адсяляецца ў «прафілакторый» — мініяцырная дамкі на адну «персону», і дваццаць дзён праходзіць адначасова загартоўку і карэкцыю, каб абараніцца ад любых знешніх вірусаў, ад самага нязначнага інфіцыравання. Наступны насельнік у тэхі дамок трапляе толькі недзе праз чатыры месяцы, за гэты час адбываецца санацыя — дэзінфекцыя і выветрыванне самой такой крытай клеткі з невялічкай плацоўкай перад ёю. Утрымліваецца ў «прафілакторыі» 35 галоў.

На раздоі асобна трымаем траіх апаратараў, каб найлепшым чынам раздаіць пасля ацёлу карову ці нецель. З захаваннем усіх належных у такім выпадку мерапрыемстваў — масажу вымя, падмывання яго і гэтак далей.

— З раздою каровы трапляюць у цэх па вытворчасці малака, там патрэбна ў масажы адпадае, — працягвае свой расказ кіраўнік аддзялення. — Тут ужо два апаратары на дальняй устаноўцы, яны чаргуюцца праз дзень, бо рэжым такі напружаны, што нашы нельга, чаловеку патрэбна дзень адлачаць. На двухразовае даенне, каб нязмяшць графік, перайсці нельга, бо статак вышэйпаказаны.

Што датычыцца рэалізацыі малака, то да апошняга часу палову яго мы прадавалі мясцоваму гармазлазводу класам «Экстра» (гэта дапамагала летась давесці раўнамернасць нашай вытворчасці да 60 працэнтаў), а палова паступала ва ўласны перапрацоўчы цэх. Клас яго, як вы разумееце, таксама высокі, адсюль і высокая якасць канечнага прадукту. Калі дабавілася сваіх крамаў — адрэпі іх амаль на ўсіх суседніх раёнах вобласці, то на малаказавод можам адпусціць не больш за 20 працэнтаў надоенага малака, астатняе ідзе на перапрацоўку і ва ўласную гандлёвую сетку.

Крыху пазней некалькі штрыхоў да агульнай карціны дадала і галоўны заатэхнік **Таццяна САМБУК:**

— Малако на перапрацоўку прымаем толькі ад адналаг свайго аддзялення, штодзённа пяць тон. І ўсё яно разыходзіцца. Наша задача — не страціць пакупніка. Таму не выкарыстоўваюцца кансерванты ці іншыя рэгулятары. Мы адны працуем на жывых грыбках — у якасці закваскі, калі размова пра кефір. Гэта чысты натуральны прадукт. Што атрымалі, тое і запакіравалі. А што датычыцца свінінны, то ў апошнія гады шмат увагі надаем бекончным парасятам. Таму свініна вельмі смачная і карыстаецца попытам. У асноўным працуем з пародамі буйнай белай, ландрасы і дзюрок. Дзве апошнія, выведзеныя на аснове беларускай буйной белай — гэта мясныя пароды. Кнырэў купляем на пеплых селекцыйна-гібрыдных цэнтрах і вядзём даволі карпатліву селекцыйную работу (падрыхтоўка кадраў даўдзе), у выніку чаго ад здаровых свіноматак і атрымалі летась 59 тысяч здаровых парасят.

У аддзяленні № 1 можна убачыць добра абсталяваныя і дагледжаныя памяшканні для буйной рагатай жывёлы. Кіруе аддзяленнем вопытны спецыяліст Аляксандр СВІСТУН (на здымку). Малады спецыяліст Віктар ВІТКОУСКІ пазнаёміў нас з сучасным абсталяваннем дальняга участка.

5. ЖАР-ПТУШКА ХАЙСЕКС

Начальнік участка на птушкагадоўлі **Ніна МІШОТА** ганарыцца гэтым фактам.

— Калі бальню Мазырскую птушкафабрыку далучылі да нас у 2004 годзе, то яна «лажала». Даўгі складалі 1,3 мільярда. У цэлым тарэмны, у тым жа 2004 годзе, мы запусцілі зрабіць адметны рывок — павялічыць пагалоўе курэй у 2,5 раза. Прадукцыйнасць узрасла ў тры разы, а вытворчасць ня — у 4,7 раза. Рэнтабельнасць дасягнула 25 працэнтаў. Што дазволіла нам выйсці на такія паказчыкі і надалей таксама працаваць эфектыўна? Рацыянальная арганізацыя работы ўчасткаў, энергазберагальныя тэхналогіі, поўнае абяздзеленне кармавога пагалоўя, калі замест простых нясучак завезлі элітных гандзінскія. Тым ж хайсексы пачынаюць несціся раней і здольныя даваць на добрую сотню яек у год больш, чым прадстаўнікі мясцовых парод.

Зараз вось у тым памяшканні, дзе мы з вамі знаходзімся, утрымліваюцца 27 тысяч кур-нясушак. А ўсяго ў нас пяць такіх птушнікаў. Прадукцыйнасць птушкі ў гэтым участку — 93 працэнты. У сярэднім ад кожнай нясушкі атрымалі летась больш за 330 яек. Уведзі мікраклімат забяспечвае аўтаматыка, дзякуючая змена тэхналогіі сочыць, каб заздаленыя параметры тэмпературы (18—19 градусаў) і вільготнасці паветра вытрымліваліся. Пры неабходнасці камп'ютар уключае вентылятары. Асветленасць памяшканняў залежыць ад узросту птушак, у птушанят — значна мацнейшая, чым у дарослых.

У мэнеу абслугоўваюць такую колькасць курэй-нясушак адна птушніца і слесар. Машына сартуе яйкі па катэгорыях — у залежнасці ад вагі, далей яны паступаюць на склад і там штамуюцца.

Супрацоўніцы лабараторыі Галіны МУРАШКІНА (яна правадзіць мікрабіялагічны аналіз) і Святлана СЦЕПАНКОВА (занятая радыялагічным аналізам сыравіны).

6. ФЕРМЫ НА МЕСЦЫ РУЙНАЎ

Кіраўнік аддзялення № 2 **Васіль ЕФІМОВІЧ:**

— Асноўная вытворчасць у аддзяленні — гэта вытворчасць яек на птушкафабрыцы (да 40 мінаўшчу штук), але і ўтрыманне буйной рагатай жывёлы таксама прыцягвае 12 чалавек, а астатнім таксама патрэбна дабра працы. Шматпрофільнасць заўсёды добра з пункту погляду занятасці людзей.

Там, дзе цяпер дзейнічае ферма, да гэтага быліся сапраўдныя руйны жывёлагадоўчых памяшканняў адной з дапаможных гаспадарак. Шмат хто райу дырэктараў: прыганяйце бульдозер, хай усё зраўняе, толькі не будзе. Ён адказаў: так — пягучай за ўсё, але я падумаю.

За адзін год на гэтым месцы падбудавалі новую ферму, і цяпер тут стаяць дзве з пальцай тысячы свіней. На іншай, чым на комплексе, тэхналогіі: на глыбокай падсцілцы, са «шведскім сталом». І ферма дала летась прыклада 600 тон мяса — дадатково да таго, што было.

За кошт дзяржаўнай падтрымкі і грунтавання на глыбокім падсцілце прывазі і сярэднім складаюць да 700 грамаў.

Разам з Ефімовічам абыходзім яго «уладанні». У памяшканні цёпла — 17 градусаў, і чыста, свежанабелена, ніякіх непрыемных пахаў.

Пераканаемся, што ў аддзяленні створаны ўсе належныя умовы для жывёлавадоўцы (як, дарэчы, і для механізатараў на сусветным мехдварэ). Адведзены пакоі для прыёму ежы з мікрахвалёўкай і іншым кухонным «начыннем», ёсць душавыя і нават прыгожы, бытавая «Хопка» вызелены ў асобных дамках, і там па-сапраўднаму ўтульна.

— Для сваіх работнікаў мы паставілі душавыя кабіны, абсталявалі сауну, — знаёміць нас з бытавымі ўмовамі жывёлагадоўцы ўпраўляючы аддзяленнем № 2 Васіль ЕФІМОВІЧ.

7. «МЫ ПРАДБАЧЫЛІ, ШТО БУДЗЕ ГОД ЯКАСЦІ»

У корпусе, дзе размешчана сауна-на перапрацоўчы, перш-наперш зайшлі ў вытворчую лабараторыю. Сустрэў нас загадчык **Іван МАЎКАЛА:**

— У лабараторыі, якая прайшла спецыяльную атэстацыю і акрадытацыю, чатыры аддзелы — радыялогіі, ветсанэкспертызы, фізіка-хімічны і мікрабіялагічны. Па апошнім ужо ў нашым Сацыяльна-эканамічным свае прадукцыю, каб гарантаваць спажыўцу ве бяспечнасць. Працуем вельмі цесна з вытворчымі падраздзяленнямі, у выніку наводзіцца характэрам тахналагічны працэс.

На прадпрыемстве функцыянуе сістэма кіравання якасцю ISO 9001 ве патрабаванні расійскага стандарта ISO 9001 ве патрабаванні расійскага стандарта на мяса ў тушах і паўтушах і яйкі харчовыя курыныя, — уключаецца ў расію сістэмы ве якасці **Сістэма АНАЦЫКА.** — А цяпер пры метадычнай падтрымцы Калінкавіцкага цэнтра стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі вядзецца распрацоўка сістэмы менеджменту і аддзяленасці з СТБ ICO 22000 па бяспечнасці харчовых прадуктаў. Яна павінна ўступіць у сілу ў 2011 годзе. Мы выкарыстоўваем на адкорме, укормленне ве складае працэнтаў 70 рацыёну, толькі дадаём крышачку камбікорму, бялкі, вітамінаў. Гэта для нас жывое золата. Сабекошт такога зерня нізкі, а кашто'ўнасць — высокая.

На плацоўцы для круглагадовага утрымання маладняка на адкорме (здымак злева). Цялятны пад наглядам Наталлі БУРНАТАВАЙ атрымліваюць заклану на свежым паветры ў спецыяльна падабраных маленькіх дамках.

— Прадукцыя нашай жывёлагадоўчай галіны адпавядае самім строгім стандартам, — зазначае начальнік малочнага цэха Валянціна КАНОПЛІЧ (на здымку ў цэнтры).

8. ДАРЫ АД «ЗАРЫ»

Фірменная крама № 2 працуе ў Мазыры сем гадоў, і ўвесь час ёй загадвае **Аляксандра МІНЧУК.**

— Таксі шырокі асартымент на нашых плошчах, таксама прыгожая выкладка — пастаянная, — тлумачыць Аляксандра Генадзьеўна. — Тавар заўсёды свежы, смачны, няма такога выпадку, каб ён заляжэўся. Мы адчуваліна дапамагаем гасподыням карміць сем'і. Кожны дзень бяром на свайм прадпрыемстве 3,5—4 тоны прадукцыі, і усе яна разыходзіцца. Перша мясцовыя выхадзіць раніцой, падвоз прадыкцыя ца праіцу дня. Адных галубоў рэалізуем штодня 200-250 кілаграмаў, 350-400 кілаграмаў жывой вагі, ім мець такія апетыты, нашым пакупнікам трэба як мінімум вельмі паважаць прадукцыю «Зары». А чаму б і не паважаць, калі гаспадарка і ішыня якасці ў ёе — вышэйшая?

Прадаўцы ў нас — ветлівыя, дружныя, трымаюцца за свае працу. Цукучасці кадраў няма, адно толькі ў дзяўчаты па чарзе ходзяць у дэкрэтны водпуск. Мінулы год у гэтым сэнсе быў асабліва «ўрадзяйным» — у дэкрэт пайшлі восем прадаўшчы. Нашы пастаянныя пакупнікі, якія ў курсе справы, жартуюць: хочаш стаць маладой маці — купляй дары ад «Зары».

Супрацоўніцы лабараторыі Галіны МУРАШКІНА (яна правадзіць мікрабіялагічны аналіз) і Святлана СЦЕПАНКОВА (занятая радыялагічным аналізам сыравіны).

ВІНШУЕМ, ЖАДАЕМ ПОСПЕХУ

Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, стала вядома, што дырэктарам перадавой гаспадаркі прызначаны Алег Міхайлавіч СЛІНЬКО. Алег Міхайлавіч — чалавек мясцовы, скончыў некалі разам з бацькамі перакаў у Мазыр з Гродзеншчыны. Было гэта у 1986-м, часу прайшло дастаткова, каб ён скончыў у Мазыры сярэдняю школу і пачаць сабе тутэйшым. Спецыяльнасць вышэйшую адукацыю і дыплом заатэхніка атрымаў у славутай нашай сельскагаспадарскі кадраў — Горацкай акадэміі. І адразу трапіў у «Зарю» пабываці кіраўнікі і спецыялісты з усяго раёна.

Віншуем новага кіраўніка «Зары» і жадаем поспеху.

Уладзіміру Андрэевіку Дворніку на яго вельмі клапатлівай пасадзе — таксама.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Віктар ПАЗНЯКОЎ і Яўген ПЯСЕЦКІ.

Ад дадзенай. Тэкст быў падрыхтаваны да друку, а потым і апублікаваны ў «Звяздзе» выказвае цьчырую падзяку галоўнаму экзаменатару «Зары» Ніне Канстанцінаўне Власок за шматгадовую і кваліфікаванную дапамогу ў падрыхтоўцы гэтай публікацыі.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 400408726 ад 01.10.2009 года, выдадзена Мазырскім райвыканкамам. ТЧК 2010

Загадчыца фірменнай крамы № 2 Аляксандра МІНЧУК з прадукцыяй Людмілай РЭУТ і Наталлі МОЦЬКІ. На здымку яны ў момант нашага візіту. Яны не толькі добры прадаўцы, але і здольны мастак: малюнкамі Вераніка упрыгожаны інтэр'ер фірменнай крамы № 5.

РАТАВАЦЬ НЕ АЛКАГОЛІКАЎ, А ІХ ДЗЯЦЕЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

За час работы ў камісіі Жанна Нядзелька нагледзелася на ўсякае. Прызнаецца, што, здараецца, не вытрымліваюць нервы — бярэ прадстаўніцу «цудоўнай паловы» за каўнер і пачынае трэсці, каб прывесці ў больш-менш адэкватны стан.

— Не так даўно паехалі мы па адным «сігнале». Заходзім у хату, а там, на паскіданых у кучу анучах, спіць мужчына. Побач, у тых жа анучах, ляжыць немаўлятка з бутэлечкай малака, якое ад старасці ўжо перабрадзіла і ў камякі збілася... Я гэта дзіцятка на рукі ўзяла, а яно ні на што не рэагуе. «Спіць», — патлумачыла мама. Ну, я ёй і выдала... Ад душы, не шкадуючы слоў... Вечарам пасля працы прыйшла я дадому, сваіх дзяцей пакарміла, а ў самой душа не на месцы. Села ў машыну — і ў Заскавічы, да той мамы. Гляджу, парадак яна збольшага навяла, а вось дзіцятка вачэй так і не адкрывае... Мне не па сабе стала, патэлефанавала ў амбулаторыю: так і так, прыйдзіце, паглядзіце. Адтуль прыйшлі, паслухалі немаўля — аказалася, цяжкае запаленне лёгкіх. Калі б хоць на дзень спазніліся, «згарэлі» б лёгкія, і малое не выратавалі б.

«Калі да гарэлкі прызвычаілася жанчына, «ячэйка грамадства» пачынае трашчаць па швах і развальвацца, як картачны домік».

Жаночы алкагалізм — штука жорсткая, практычна непераадольная, ды яшчэ і перадаецца «ў спадчыну». Калі бацькі не «прасыхаюць», у дзевяці выпадках з дзесяці лёс дзяцей мала чым будзе адрозніваца ад іх лёсу. Спачатку — прытулак, потым — інтэрнат, далей — вучылішча і... вяртанне на ўласную жылплошчу, дзе жывуць усё тыя ж бацькі. І з гэтага кола не вырвацца — застаецца хіба што спадзявацца на падтрымку з боку больш адэкватных родных (якіх не так многа) ці дзяржавы. Але дзяржава абараняе дзяцей ад бацькоў толькі да 18 гадоў. Далейшы выбар яны павінны зрабіць самі. Толькі якім ён будзе? У «хэпі энд» (або шчаслівы зыход) мала хто, шчыра кажучы, верыць. Ва ўсякім разе, не тыя, хто па прычыне сваіх абавязкаў, службовых ці грамадскіх, пастаянна сутыкаецца з цяжкім «кантынгентам».

Зразумела, з кожнага правіла ёсць выключэнні. Да гэтага часу Жанна Нядзелька ўспамінае Раісу Сасянкову, з якой некалі працавалі разам на ферме сельгаспрадпрыемства «Лебедзева», Жанна Вацлаваўна была загадчыцай, Раіса — даяркай.

— Адзін раз яна запіла і на працу не выйшла, другі, трэці... Паехала я да яе, дачакалася, пакуль яна з «трансу» выйдзе, і сказала: рабі выбар. Або я цябе пастаўлю на ўлік і пазбаўлю бацькоўскіх правоў, або давай кадзіравацца... І закадзіравалі, два гады ўжо трымаецца. Зусім іншы чалавек цяпер, як наноў нарадзілася. Па-ранейшаму працуе даяркай — адна з лепшых, муж таксама ў сельгаспрадпрыемстве. Давялі да ладу дом — прыемна паглядзець, трымаюць сваю гаспадарку, купілі машыну. Дзеткі ходзяць дагледжаныя, прыгожа апранутыя... Да гэтага часу яна да мяне забягае, калі ёсць што добрае сказаць. Нядаўна заходзіла: «А я на правы здала!». Калі калектывам адзначаюць святы, ёй, акрамя кока-колы, нічога не наліваюць... Гэта раней на закадзіраваных у вёсцы пальцамі паказвалі, а цяпер столькі народу кадзіруецца, што ўжо і пальцаў тых не хапае... Так што цуды здараюцца. Але пры ўмове, што чалавек сам гэтага хоча.

Цяпер, кажа Жанна Вацлаваўна, працаваць у камісіі стала лягчэй — да праблемы падключыліся і школы, і медустановы, і клуб, і кіраўнікі прадпрыемстваў, і мясцовыя дэпутаты (кожны з іх замацаваны за праблемнай сям'ёй). А ўзначальвае камісію старшыня Лебедзеўскага сельскага Савета Леанід Семашкевіч.

Ёсць актывісты — напрыклад, сацыяльныя педагогі Лебедзеўскай і Турэц-Баярскай школ Тамара Анікеева і Таццяна Сарока — якія працуюць у камісіі не за страх, як кажуць, а за сумленне. Няўдалыя сем'і яны наведваюць ледзь ці не праз вечар. Глядзяць, што дзеці елі, як апранутыя, які ў іх настрой... І бацькі, ведаючы гэта, ужо не расслабляюцца, як звычайна.

— Дзяржава можа падстаўляць няўдалай сям'і плячо, даваць шанц, але не бясконца, — упэўненая Жанна Нядзелька. — З тымі, хто гэтага не разумее, трэба размаўляць па-іншаму. На маю думку, больш жорстка, чым дазваляе цяперашняе заканадаўства. Не распыляючы сілы на перавыхаванне дарослых, а строга спаганяючы сродкі, якія спатрэбяцца дзецям. Без усялякіх «зніжак».

Наталля КАРПЕНКА.

Маладзечанскі р-н.

КУП І ПРЫБЫТАК — РЭЧЫ СУМЯШЧАЛЬНЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У 2010 годзе распачнём новую для сябе форму работы — збор добраахвотных ахвяраванняў грамадзян. Некалькі гадоў таму ў новым аграгарадку Калачы мы вырашылі паспрабаваць прыцягнуць насельніцтва да ўдзелу ў аплаце новых агароджаў. Меркавалася, што палову сумы дае сельвыканкам, а палову — жыхары. Але надарыўся крызіс, і ініцыятыва заглохла.

Добраўпарадкаванне — такая тэма, ад якой раз і назаўсёды не пазбавішся. Учора абкасіў — заўтра зноў касіць давядзецца.

— У такой сітуацыі КУП для нас — добрая падмога, — адзначыў старшыня Савета. — Мне, напрыклад, не трэба вызвоньваць тых жа дырэктараў нашых СВК, шукаць дапамогу дзесьці ў іншым месцы, каб, напрыклад, вывезці смецце на міні-палігоны. Дзякуючы КУПу, у нас няма праблем і са зносам старых дамоў (у прадпрыемства ёсць і неабходная тэхніка, і людзі). Абкосам тэрыторыі, добраўпарадкаваннем могілак таксама займаецца наша камунальнае ўнітарнае прадпрыемства.

У КУПа даволі вялікі парк спецыялізаванай сельгастэхнікі, што дазваляе зняць напружанне ў плане дапамогі насельніцтву ў апрацоўцы прысядзібных участкаў. Гэта выдатна, таму што, напрыклад, не ва ўсіх нашых СВК ёсць тэхніка, якая магла б развярнуцца на невялікіх участках зямлі. А ў КУПа ёсць усё, акрамя збожжаўборачнага камбайна. Ён можа выканаць вельмі шырокі спектр сельгасработ (узараць, забаранаваць, пасадзіць і выбраць бульбу, скасіць сена, высушыць, спрасаваць у рулоны і прывезці чалавеку дамоў).

Увогуле, Янушкавіцкі КУП — структура шматпрофільная. Акрамя добраўпарадкавання і апрацоўкі прысядзібных участкаў, яго супрацоўнікі займаюцца вырабам драўлянай агароджы, рамонтам хат. Але асноўны артыкул даходаў КУПа — дрэваапрацоўка (у яго ёсць свая піларама).

— Безумоўна, вялікую ролю ў жыццядзейнасці КУПа адыгрывае яго матэрыяльна-тэхнічная база. Нашаму камунальнаму ўнітарнаму прадпрыемству пашанцавала — некалькі гадоў таму на набыццё тэхнікі з абласнога бюджэту яму было выдаткавана 158 мільёнаў рублёў. Калі матэрыяльная база ёсць, тады справа стварэння КУПа таго вартая. А калі КУП у эканамічным плане знаходзіцца ў зародкавым стане, выйсці на рэнтабельнасць яму вельмі складана. Там, дзе на тэрыторыі сельсавета ёсць моцны СВК, магчыма, КУП і не патрэбны — замест яго ёсць сэнс стварыць участак ЖКГ. Мае значэнне і колькасць насельніцтва на пэўнай тэрыторыі і яго структура. Дырэктар нашага КУПа — чалавек ініцыятыўны, які не сядзіць склаўшы рукі, а няспынна шукае новае поле дзейнасці, новыя магчымасці зарабіць грошы. Менавіта таму эканамічныя паказчыкі ў КУПа вельмі добрыя. Сёння КУП аказвае 20 відаў паслуг. Магчыма, у хуткім часе мы перададзім яму і функцыі па зборы малака ў насельніцтва. Пакуль што гэтым займаецца сельвыканкам.

Камунальнае ўнітарнае прадпрыемства ў Янушкавіцкім сельсавеце ўтварылася ў 2005 годзе на месцы прыватнага прадпрыемства (піларамы), якое разарылася. Статутны фонд на пачатак дзейнасці складаў усяго 3 мільёны, выдаткаваныя КУПу сельвыканкамам.

— У нас вялікі сельсавет — і ні адной піларамы, апроч нашай, на ўсю акругу. Людзям не было дзе лес пілаваць, — патлумачыў дырэктар КУПа Мікалай ШОРАЦ. — Першапачаткова мы аказвалі паслугі толькі па распілоўцы дрэва і рытуальныя паслугі (хавалі нябожчыкаў, прадавалі рытуальную прадукцыю). Пачалі з 3 чалавек, потым узялі яшчэ аднаго работніка, потым яшчэ аднаго. Так і пайшло. Сёння ў нас у штаце 10 чалавек (8 рабочых, бухгалтар і дырэктар).

У 2007 годзе, пасля таго як з вобласці выдаткавалі грошы на набыццё сельгастэхнікі, КУП змог значна пашырыць спектр сваіх паслуг за кошт апрацоўкі прысядзібных участкаў. Зімой, калі колькасць заказаў скарачаецца, выручае піларама, дае аб'ём работ. Яна ж па-ранейшаму застаецца і асноўнай крыніцай прыбытку. «На паслугі, якія аказваем насельніцтву, мы ўстанаўліваем мінімальныя расцэнкі, — працягвае Мікалай Шорац, — абы толькі самім быць не ў страце і даць магчымасць людзям нядорага зрабіць заказ».

З гэтай прычыны сельскагаспадарчая дзейнасць асабліва даходу КУПу не дае, але, дзякуючы попыту на прадукцыю піларамы, прадпрыемства працуе з прыбыткам. За 2008 год ад продажу тавараў і аказання паслуг КУП зарабіў 163 млн (з іх ад насельніцтва — 75 млн), у 2009-м — 178 млн (у тым ліку ад насельніцтва — 134 млн). Чысты прыбытак у 2008-м склаў 7 млн, у 2009-м — 16 млн рублёў. Рэнтабельнасць КУПа ў 2008 годзе раўнялася 4 працэнтам, летась — 9,9.

– Раней драўніну даводзілася набываць праз аўкцыён (што прыводзіла да павышэння сабекошту). У 2009 годзе ўвялі свабодны продаж лесапрадукцыі, адпаведна выросла наша рэнтабельнасць. На 2010-ы зноў вярнулі аўкцыёны, выжываць будзе цяжэй. Да таго ж, мы займаем стары будынак, які застаўся ад былой сельгасарганізацыі, цяпер прыйшлі новыя інвестары, прыбралі будынак да рук і прызначылі нам арэнду — 2 мільёны ў месяц, якія пацягнуць нас на дно. Для КУПа выключна важна мець і сваю тэхніку, і сваё памяшканне. Але мы знаходзім іншыя крыніцы папаўнення даходу. Набылі грузапасажырскі аўтамабіль «Газэль», цяпер аказваем паслугі грузаперавозак (у вёсцы, бывае, няма каму труну з нябожчыкам на могілкі адвезці). У найбліжэйшы час мяркуем яшчэ заняцца бетоннымі работамі — набыць абсталяванне для вырабу бардзюра і тратуарнай плітак, — гаворыць дырэктар КУПа.

За пяць гадоў існавання КУПа ні адзін яго работнік не зволіўся па ўласнай ініцыятыве. Людзі трымаюцца за такую працу, хоць бывае ўсякае. Сярэдні заробак летась склаў 560 тысяч рублёў. Сума залежыць ад канкрэтнага заказу і ад аб'ёму работы.

Інга МІНДАЛЁВА.

ПАЖАРНЫЯ АПАВЯШЧАЛЬНІКІ АБ'ЯДНОЎВАЮЦЦА

За мінулы год на Гродзеншчыне ўсталявана больш за 50 тысяч аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў. Пры гэтым праводзіцца праца па аб'яднанні некалькіх прыбораў, размешчаных у суседніх дамах, у адзіную сетку.

Да пачатку ацяпляльнага сезона ўсім людзям, якія адносяцца да катэгорыі сацыяльна неабароненых, адрамантавалі пячное ацяпленне. Аднак праблемы застаюцца. Шмат выпадкаў узгаранняў звязаны з парушэннем правілаў эксплуатацыі бытавых электрапрыбораў (самаробныя абагравальныя прыборы, «жучкі» замест засцерагальнікаў у электралічыльніках). Летась 96 чалавек (76 працэнтаў) загінулі ў пажарах з-за неасцярожнага курэння, 100 аховраў агню знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення.

Вышэйзгаданыя прычыны вогненных трагедый (за тры тыдні студзеня пажары спынілі на Гродзеншчыне трынаццаць жыццяў) пераважаюць і сёлета. Па рашэнні аблвыканкама гродзенскія выратавальнікі з 25 студзеня правядуць месячнік супрацьпажарнай бяспекі. У кожным раёне за гэту працу будзе адказваць міжведамасны штаб у складзе супрацоўнікаў МНС, УУС, службы сацыяльнай абароны і іншых.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

ПАБУДАВАЛІ ДОМ З ДАПАМОГАЙ КРЭДЫТУ.

Ці можам атрымаць бязвыплатную пазыку?

З пасёлка Навапалескі Салігорскага раёна ў рэдакцыю па кансультацыю адносна жыллёвага пытання звярнулася сям'я Чорных. Дакладней, не столькі ўласна жыллёвага, колькі фінансава-крэдытнага.

— Наша сям'я — гэта муж, жонка і двое дзяцей: дачка, студэнтка трэцяга курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, і сын, вучань 10 класа. Мы маем прыватызаваную двухпакаёвую кватэру агульнай плошчай 44,1 квадратнага метра (жылой — 25 квадратных метраў). Ёсць зямельны ўчастак плошчай 0,168 гектара ў пасёлку, згодна з дзяржрэгістрацыяй ад 2005 года. На ім мы пабудавалі драўляны дом агульнай плошчай 86,9 квадратнага метра, жылой — 51,5 «квадрата». На будаўніцтва дома быў выдзелены льготны крэдыт пад 5 працэнтаў на 20 гадоў у суме 31 753 000 рублёў (дагаворы ад 1.08.2006 г. і 1.08.2007 г.). У чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў мы сталі 8.06.2005 года. У дом яшчэ не засяліліся: не падведзены газ, не зроблена тэхнічная дакументацыя. Пытанне ў нас такое: ці мае права наша сям'я на аднаразовую бязвыплатную пазыку? Даходы сям'і складаюць у суме 1 700 000 рублёў, — даводзіла сутнасць пытання гаспадыня Ніна Чорная.

Як патлумачылі нам у службе «Адно акно» Салігорскага райвыканкама, грамадзяне могуць разлічваць на атрыманне вышэйназваных аднаразовых бязвыплатных пазык у тэрмін з моманту адкрыцця крэдытнай лініі да здачы дома ў эксплуатацыю. Мяркуючы па словах заяўніцы, гэта ўмова выконваецца. Аднак павінны быць захаваныя і некалькі іншых істотных момантаў. Так, стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў як маладая сям'я Чорныя павінны былі да верасня 1996 года. (Гады нараджэння мужа і жонкі адпаведна 1967-ы і 1969-ы. Для таго каб стаць у чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў як маладой сям'і, трэба, каб на верасень 1996 года аднаму з дарослых членаў сям'і — мужу ці жонцы — было менш за 31 год). Тут таксама ўсё ў парадку. Далей, паведамілі нам у «Адным акне», летась аднаразовыя бязвыплатныя пазыкі даваліся тым маладым сем'ям, якія стаялі ў чаргзе да 1 студзеня 2001 года. Які год пастаноўкі ў чаргу (адзін або адразу некалькі) можа стаць «выходным пунктам» сёлета, гаварыць пакуль не выпадае: сродкі пад гэтыя мэты выдзяляюцца звычайна крыху пазней. Летась гэта адбылося ў пачатку лютага. Зноў жа, пакуль невядомы і аб'ём грашовых сродкаў, што будуць выдзеленыя сёлета.

Яшчэ адной перадумовай выдзялення пазыкі, як удакладніла начальнік Бюро прыватызацыі і выдзялення пазык КУП «Разлікова-касавы цэнтр г. Салігорска» Вольга ЛАПЦІК, з'яўляецца памер даходаў на кожнага члена сям'і. На сёння ён не павінен перавышаць 1 163 070 рублёў на чалавека. Так што і па гэтым крытэрыі сям'я Чорных можа разлічваць на станоўчае вырашэнне свайго пытання. Канкрэтны памер пазыкі разлічваецца асобна, зыходзячы з памеру жылплошчы. Больш канкрэтную інфармацыю па момантах, што цікавяць заяўнікаў, яны змогуць атрымаць у службе «Адно акно», якая знаходзіцца ў будынку райвыканкама ў пакоі 107.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЛАГАПЕД–НАЛЁТЧЫК

Лёгкага заробку шукаў 21-гадовы спецыяліст установы адукацыі «Шапчыцкі вучэбна-педагагічны комплекс». Як расказаў намеснік начальніка РАУС Рагачоўскага раёна Леанід Прорашняў, малады чалавек апоўдні прыйшоў у адно з аддзяленняў «Альфа-банка» ў Рагачове і падаў касіру ў акенца паперу з наступным тэкстам: «У мяне пісталет. Ціха складзі грошы ў пакет і без глупстваў». Пры гэтым ён перадаў жанчыне поліэтыленавы пакет. Аднак ён хутка зразумеў, што супрацоўніца банка націснула трывожную кнопку і выклікала міліцыю. Злодзей паспрабаваў знікнуць з месца здарэння, але ж дарогу яму адразу перагарадзіў супрацоўнік банка, а праз секунды і спецыялісты дэпартамента «Ахова» МУС. Як высветлілася, зброі ў налётчыка, лагапеда па асноўнай спецыяльнасці, не было.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
НАВІЦКІ Г.В., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні
БАЙКОЎ В.М., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце
АЦЯСАЎ А.Я., старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў
СЦЕПАНЕНКА А.М., адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
ПРЭДКА С.У., старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці
МАКСІМЕНКА С.А., старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:
Наталля КАРПЕНКА.
Кантактны тэлефон
292 21 03.

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»

БЫЛА ТАКАЯ ВУЛІЦА — ЮРЗДЫКА...

У нумары «МС» за 9 снежня 2009 г. пад назвай «Новы Свержань чакае...» быў апублікаваны ліст прафесара Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Аляксея Пяткевіча. У ім аўтар выказаў свае меркаванні наконт мінулага і цяперашняга вёскі Новы Свержань, што ў Стаўбцоўскім раёне. На яго думку, мясцовыя ўлады — і сельская, і раённая — маглі б надаваць больш увагі як захаванню гістарычнай мінуўшчыны населенага пункта, так і яго сённяшняму вонкаваму выгляду, а таксама добраўпарадкаванню тэрыторыі.

Рэдакцыя атрымала пісьмовае рэагаванне Стаўбцоўскага райвыканкама, у якім паведамляецца, што матэрыял «Новы Свержань чакае...» разгледжаны ў Навасвержанскім сельвыканкаме і на пасяджэнні раённага выканаўчага камітэта.

Пытанні, узнятыя ў публікацыі, знаходзіліся і пастаянна знаходзяцца ў полі зроку сельвыканкама, раённага выканаўчага камітэта і грамадскасці раёна, паведамляецца ў рэагаванні. За перыяд падрыхтоўкі да святкавання 580-годдзя вёскі Новы Свержань быў праведзены шэраг мерапрыемстваў культурнай і гістарычнай накіраванасці, а таксама работы па добраўпарадкаванні населенага пункта. У Навасвержанскім доме культуры адбыліся тэматычныя вечары, прысвечаныя гісторыі вёскі, свята сям'і, ушанаванне ветэранаў вайны і працы, старажылаў вёскі. З мая па жнівень у фае Дома культуры дзейнічала выстава матэрыялаў «Летапіс маёй вёскі», вырабаў майстроў народнай творчасці, дзіцячых малюнкаў. Асобная праца па вывучэнні гісторыі вёскі праводзілася настаўніцкім і вучнёўскім калектывам Навасвержанскай СШ.

Прадпрыемствамі і грамадзянамі, гаворыцца ў рэагаванні, былі здзейсненыя запланаваныя мерапрыемствы па добраўпарадкаванні вытворчых аб'ектаў і прыдамавых тэрыторый. Толькі асабіста грамадзянамі пастаўлена 600 пагонных метраў новай агароджы, больш за 400 метраў яе адрамантавана, каля 4000 — пафарбавана. У межах падрыхтоўкі да свята вёскі праводзілася конкурсы сярод жыхароў в. Новы Свержань на лепшы падворак і лепшы кветнік, па выніках якіх пераможцам падчас свята былі ўручаныя сувеніры.

Здзяйсняўся і шэраг іншых мерапрыемстваў, у тым ліку з удзелам царквы і касцёла. Па водгуках жыхароў, свята пакінула аб сабе добрыя ўспаміны. Застаўся і матэрыяльны «адбітак» — у выглядзе добраўпарадкаваных прыдамавых тэрыторый, культавых збудаванняў і грамадскіх месцаў.

«Так, на вялікі жаль, радыкальна добраўпарадкаваць вёску мы не змаглі, — паведамляе Стаўбцоўскі раённы выканаўчы камітэт, — ды і ў хуткім часе наўрад ці зможам. Асфальтаванне дарог і ўкладка тратуараў патрабуюць велізарных сродкаў, якіх сёння недастаткова. Трэба аддаць належнае вяскоўцам, якія разумеюць сітуацыю і спадзяюцца на вырашэнне гэтых праблем у будучыні».

Пытанне ўсталявання памятнага знака аб гістарычным мінулым в. Новы Свержань разглядаецца сельвыканкамам сумесна з архітэктурнай службай раёна і пасля распрацоўкі адпаведнага праекта будзе вынесена на разгляд грамадскасці.

Пытанне аб перайменаванні вуліцы Наднёманская ў вуліцу Юрздыка таксама патрабуе пэўнай прапрацоўкі. Адпаведна з заканадаўствам, перайменаванне населеных пунктаў і вуліц здзяйсняюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы з улікам меркавання мясцовага насельніцтва. Папярэдняе апытанне, праведзенае сельвыканкамам, дало наступныя вынікі. Сёння на вуліцы Наднёманскай налічваецца 33 домаўладанні, дзе пражывае 65 чалавек. Адносна перайменавання вуліцы Наднёманская ў вуліцу Юрздыка быў апытаны 61 жыхар гэтай вуліцы. 59 чалавек выказаліся супраць такога перайменавання і толькі двое грамадзян — станоўча.

Напэўна, з цягам часу праца, якая будзе праводзіцца з грамадзянамі ў гэтым кірунку, сфарміруе ў іх іншую думку, аднак сёння прыняць адміністрацыйнае рашэнне аб перайменаванні вуліцы немагчыма.

«Мы ўдзячныя нашаму земляку прафесару А. Пяткевічу за клопат аб сваёй малой радзіме, за яго ўклад у вывучэнне і прапаганду гісторыі нашага края, цэнім яго намаганні, накіраваныя на захаванне гістарычнай спадчыны нашых продкаў. Гэта цалкам супадае і з тымі намаганнямі, якія кіраўніцтва раёна і грамадскасць прыкладаюць па развіцці нашага рэгіёна. Спадзяёмся на ўзаемнае супрацоўніцтва з А. Пяткевічам і будзем рады даведацца аб яго меркаваннях адносна перспектывы развіцця в. Новы Свержань», — гаворыцца ў рэагаванні.

РЭФОРМА

СЕЛЬСАВЕТЫ ТРАПІЛІ ПАД СКАРАЧЭННЕ

У Магілёўскай вобласці скасаваны 9 сельсаветаў, а больш за два дзясяткі іх змянілі свае межы

Магілёўскі абласны Савет дэпутатаў прыняў рашэнне аб змяненні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага парадку ў шэрагу сельскіх раёнаў. Цяпер у рэгіёне няма сельсаветаў з колькасцю насельніцтва, ніжэйшай за 500 чалавек.

Увогуле спыняць сваё існаванне Гарадзецкі сельсавет Быхаўскага раёна, Кіраўскі Глускага, Цемналескі Дрыбінскага, Грыбавецкі Кіраўскага, Віркаўскі Клічаўскага, Брылёўскі Магілёўскага, Яноўскі Хоцімскага, Дужаўскі і Прудкоўскі сельсаветы Чавускага раёна.

Ва ўсіх скасаваных сельсаветах загадзя прайшлі вясковыя сходы, у раёнах гэтыя пытанні разглядаліся на сесіях. Людзі, зразумела, па-рознаму паставіліся да рэформы. Многіх турбуюць змяненні і тое, як яны адаб'юцца на штодзённым жыцці.

— Тым не менш жыццё дыктуе нам неабходнасць ліквідаваць малаколькасныя сельсаветы, гэта рашэнне наспела, — пракаментаваў старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Панцюхоў. — У выніку адбудзецца пераразмеркаванне супрацоўнікаў і тэхнічных рэсурсаў у сельсаветы, на тэрыторыі якіх жыве шмат людзей і дзе папросту не хапала сілаў і рук, каб дайсці і даехаць да кожнага чалавека.

Для таго, каб наладзіць сталую транспартную сувязь вёсак з новымі цэнтрамі сельсаветаў, зробяць змены ў раскладзе аўтобуснага руху. Аўтакрамы з таварам даедуць да кожнай вёсачкі, у складзе якога б сельсавета яна ні знаходзілася.

— Калі мы разглядалі пытанне аб ліквідацыі сельсаветаў, то кіраваліся адным прынцыпам — «Не нашкодзь!», — патлумачыў Уладзімір Панцюхоў. — Я разумею, што вяскоўцы прызвычаіліся да пэўнага ладу жыцця і да мясцовай улады таксама. Ім будзе нязвыкла. Але разам з тым, мы тлумачым людзям, што сельсавет, на тэрыторыі якога жывуць, напрыклад, тры сотні жыхароў, — гэта не эфектыўна. Малаколькасныя вёскі паступова выміраюць, і нам выпадае ўслед за сельскімі гаспадаркамі ісці шляхам цэнтралізацыі і ўзбуйнення сельсаветаў.

Кіраўнік аблсавета ўпэўнены, што ўсе супрацоўнікі скасаваных сельскіх Саветаў уладкуюцца на новую працу ў выніку ўнутранага пераразмеркавання кадраў. Дабротныя адміністрацыйныя будынкі, спадзяецца Уладзімір Панцюхоў, будуць запатрабаваныя іншымі сельскімі ўстановамі — напрыклад, медыцынскімі альбо бытавымі. Сродкі, запланаваныя ў бюджэце, не скароцяцца: іх атрымаюць сельсаветы, да якіх далучаны новыя населеныя пункты.

Дарэчы, змены межаў сельсаветаў звязаныя не толькі са скасаваннем суседніх. Цяпер межы і цэнтры сельсаветаў супадаюць з межамі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, у сувязі з чым змяніліся і некаторыя назвы. Напрыклад, у Чавускім раёне Благавіцкі сельсавет перайменаваны ў Каменскі, з адпаведным цэнтрам у аграгарадку Каменка, які з'яўляецца і цэнтрам гаспадаркі.

У перспектыве ўлады мяркуюць правесці і другі этап скарачэння малаколькасных сельсаветаў. На другі раз мяркуецца ліквідаваць сельсаветы, дзе жыве меней за 1000 чалавек. Такіх будзе ўжо больш за паўсотні. Але новы этап, прагназуюць у аблсавеце, адбудзецца не раней чым праз год, калі будзе ўлічаны вопыт цяперашняй адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы.

«Ніхто людзей не кіне,» — запэўніваюць улады. У былых цэнтрах сельсаветаў нават пакінуць спецыяльныя пакоі, якія стануць філіяламі мясцовай улады і куды па графіку будуць прыязджаць сакратар ці старшыня сельскага Савета для стасункаў з вяскоўцамі і вырашэння іх жыццёвых праблем.

Ілона ІВАНОВА.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

❖ Оценка оборудования и транспортных средств
❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ

№ лота	Наименование объекта	Адрес объекта	Продавец	Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Изолированное помещение (столовая и магазин)	г. Гомель, ул. Объездная, 12	Управляющий в деле о банкротстве УП «Торговый дом «Гомельпласт»	Год постройки – 1985, материал стен – кирпич, ж/б панели, общая площадь изолированного помещения – 867,8 м², в том числе: площадь столовой 822,4 кв.м, площадь магазина 45,4 кв.м. Изолированные помещения расположены в 4-этажном здании.	200 205 420	10 010 270
Срок подачи заявления		**До 17.00 3 февраля 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а				
Дата, время, место проведения аукциона		**4 февраля 2010 г. в 12.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»				
Условие продажи		Без условий. Цены указаны без НДС. Шаг аукционных торгов – 8 %, вознаграждение – 4 %				
1	Изолированное помещение № 3 – 2-й этаж в двухэтажном кирпичном здании. Общая площадь изолированного помещения 1214,4 кв.м	г. Гомель, ул. Циолковского, 121	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Администрации Советского района		733 160 930	73 300 000
Срок подачи заявления		**До 17.00 10 февраля 2010 г.**, по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а				
Дата, время, место проведения аукциона		**11 февраля 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»				
Условие продажи		Без условий. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 4 %				
Номер р/с для перечисления залога		Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509				
Условие пользования		Объекты продаются в собственность				

Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).

УНП 102353509.

ШТО ЧАКАЕ ГАРАДЗЕНСКІ «НОВЫ СВЕТ»,

альбо Як знайсці кампраміс паміж гістарычнымі каштоўнасцямі і нармальнымі ўмовамі жыцця?

ПА электроннай пошце рэдакцыя «Звязды» атрымала ліст з Польшчы. Казімеж Нехвядовіч (sobotniki@poczta.onet.pl) прыводзіць публікацыю ў газеце «Rzeczpospolita» пад назвай «Барацьба за гарадзенскі «Новы свет». У артыкуле гаворыцца, што быццам улады Гродна маюць намер разбурыць каля двухсот будынкаў у гэтым квартале, супраць чаго пратэстуюць гісторыкі. «Ці магла б ваша газета выказацца па гэтай вельмі важнай справе?» — пытаецца спадар Нехвядовіч.

Наш карэспандэнт (дарэчы, аўтар артыкула «Прагулка па «Новым свеце», які «Звязда» надрукавала летась) паспрабаваў гэта зрабіць. Не прэтэндуючы, як кажуць, на ісціну ў апошняй інстанцыі, а абапіраючыся на меркаванні людзей, якія так ці інакш маюць дачыненне альбо інтарэс да гэтай тэмы.

— У непаўторных рысах адзінага гісторыка-культурнага ансамбля можна ўбачыць розныя архітэктурныя напрамкі і стылі, — зазначае аўтар кнігі «Новы свет і яго навакольле» **гісторык Андрэй ЧАРНЯКЕВІЧ** і запрашае на прагулку па гэтым раёне.

Спыняемся каля будынка з чатырма калонамі на вуліцы Рэймanта, пабудаванага ў 30-х гадах мінулага стагоддзя.

— Гэта тыповы будынак для свайго часу, кажуць, што тут жыў вайсковец. І менавіта таму, што такіх у Гародні толькі два (яшчэ адзін на вуліцы Мядовай), ён становіцца элітарнай рэччу, бо адлюстроўвае архітэктурную ідэю мінулай эпохі, — лічыць Андрэй Чарнякевіч.

Потым ён распавядае пра асаблівасці заходнебеларускага канструктывізму 1920—30-х гадоў у жыллёвым будаўніцтве (на вуліцах Розы Люксембург, Славацкага і 17 Верасня), паказвае пабудаваныя на пачатку мінулага стагоддзя драўляныя дамы, дзе жылі расійскія чыноўнікі:

— Звярніце ўвагу на гэтыя прыгожыя драўляныя канькі ў расійскім стылі «мадэрн». Прыязджала гісторык архітэктуры з Вільні — вельмі ўзрушана пра іх казала. А ці бачылі вы дзверы з такім дэкорам?

Так, яны не ў лепшым стане. Але ж людзі, якія ў гэтым доме цяпер жывуць, не мяняюць іх на сучасныя. Пэўна, гісторыя, памяць — гэта не проста словы.

Але не толькі рознымі архітэктурнымі напрамкамі і дэкаратыўнымі элементамі мінулай эпохі (аздабленне вокнаў, дзверы, дэкор фасадаў) вызначаецца аблічча «Новага свету». Асобная і не менш цікавая тэма, якую, дарэчы, можна таксама выкарыстаць у мэтах гістарычнай адукацыі і турызму — людзі, што пражывалі ў гэтым квартале.

— На гэтым доме, як бачыце, няма мемарыяльнай дошкі, але менавіта тут у 1930-х гадах жыў на кватэры заснавальнік музея прыроды Станіслаў Жыўна, — расказвае Андрэй Чарнякевіч. — Непадалёк жылі стваральнік заапарка Ян Каханоўскі, маці Алешы — аўтара «Трох таўстуноў». Захаваўся і будынак, дзе жыў генерал Кайгародаў, які адыграў даволі трагічную ролю ў абароне Гародні ў 1914—1915 гадах...

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА.

На сучасных картах горада над Нёманам квартала ці, кажучы па-сучаснаму, мікрараёна пад назвай «Новы свет» (паміж вуліцамі Горкага і Ажэшкі, літаральна побач з гістарычным цэнтрам) не існуе. Аднак у экспазіцыі Дома-музея Максіма Багдановіча можна ўбачыць канверт з такім адрасам: «гор. Гродна, Новы свет, дом Агульнікава». Гэты канверт (у ім былі ноты для ігры на фартэпіяна) маці паэта Марыя Апанасаўна атрымала з Пецярбурга. Адам Ягоравіч Багдановіч месца жыхарства сваёй сям'і пасля пераезду ў Гродна ў 1892 годзе таксама звязвае з Новым светам: «Жылі мы на ўскраіне горада, на Новым свеце па Садовай, займалі кватэру ў апошнім доме злева...»

Першыя пабудовы ў гэтым квартале з'явіліся ў 1770-х гадах пры гарадзенскім старасце Антоніі Тызенгаўзе, а найбольш актыўна ён пачаў развівацца напрыканцы XIX стагоддзя. У 20—30-х гадах мінулага стагоддзя, калі горад быў у складзе Польшчы, тут будуюцца драўляныя і мураваныя дамы ў стылі канструктывізму, які імкнецца да стварэння зручнага і камфортнага жыцця.

Цікава і тое, што на цаглінах шэрагу размешчаных у гэтым раёне мураваных будынкаў па сёння захаваліся зробленыя на пачатку і ў 30-х гадах мінулага стагоддзя надпісы — салдатаў рускіх, польскіх і савецкіх, дзіцячыя. Быццам урыўкі з гарадзенскай кнігі пра тагачаснае жыццё, «музей графіці» пад адкрытым небам.

Аднак ёсць у «Новым свеце» і, так бы мовіць, другая праўда.

— «Новы свет» — гэта комплекс забудоў з XIX стагоддзя па 30-я гады XX стагоддзя. Дык якой жа каштоўнасцю валодаюць нашы трухлявыя баракі 1954 года зборкі? — напісала ў газету «Вечерний Гродно» **Раіса Аркадзьеўна ЛАГІНОЎСКАЯ**. — Дарэчы, знос іх плануецца яшчэ 65-м, 72-м і ў 80-я гады мінулага стагоддзя... Ванны няма, прыбіральня ў двары. У 1978 годзе ў дамах па вуліцы праводзілі цэнтральнае ацяпленне, думалі зрабіць перапланіроўку і ўсталяваць санвузел. Але ад гэтай задумы былі вымушаны адмовіцца, паколькі дамы маглі абрушыцца з-за зносу больш чым на семдзясят працэнтаў...

Дык што ж гэта: гістарычная каштоўнасць ці ганьба горада?

— Так, адно — гэта разважаць аб архітэктурных дэталях, гістарычных каштоўнасцях, а іншая рэч — умовы жыцця канкрэтных людзей, — зазначае Андрэй Чарнякевіч. — Як пачынаеш займацца толькі архітэктурай — забываюцца людзі. Як пачынаеш казаць пра нейкія патрэбы людзей — забываецца архітэктура. Тое, што піша ў лісце гэта жанчына, — праблема, якая існуе. Сапраўды, большасць будынкаў на вуліцы Рэймanта і асабліва на вуліцы Славацкага не вельмі прытульныя. За выключэннем тых асабнякоў, якія ўжо перапрацаваныя і часткова страцілі сваю аўтэнтычнасць, па сутнасці гэта халупы і баракі. Прынамсі тыя, якія былі пабудаваныя ўжо пасля Другой сусветнай вайны. Насамрэч гэтыя дамы не з'яўляюцца ніякай каштоўнасцю. Але, разам з тым, да нашага часу захаваліся і тыя дамы, якія могуць і павінны стаць асновай гэтага, на мой погляд, агульнага комплексу, цікавай гістарычнай з'явы «Новы свет». Таму трэба вызначыць тое, што ні ў якім разе нельга зносіць. І вызначыць тыя межы, да якіх можна нешта перарабляць. Такім чынам, знайсці «кампраміс» паміж гістарычнымі каштоўнасцямі і нармальнымі ўмовамі жыцця. Улада павінна выпрацаваць нейкі алгарытм дзеянняў у гэтым пытанні. Каб людзі, якія пражываюць у гэтым раёне, не былі закладнікамі сітуацыі: з аднаго боку, кепскія ўмовы жыцця — трэба дом знесці, з іншага — не паляпшаем умовы жыцця, бо перспектыва — знос.

— Улады павінны заявіць, што «Новы свет» для Гародні важны, — лічыць Андрэй Чарнякевіч. — Мяркую, што на гэтым гарадзенскае самакіраванне можа стварыць свой імідж. Трэба не спрачацца з палякамі, маўляў, мы дамы зносім, а сказаць: «Не, вы памыляецеся, гэта для нас вельмі каштоўнае. Запрашаем вас да супрацоўніцтва».

На думку **гісторыка архітэктуры Ігара ТРУСАВА**, трэба ў рэшце рэшт вызначыцца, што з гэтай забудовы будзе так ці інакш разбурана (бо горад — гэта жывы арганізм), а што з'яўляецца архітэктурнай, гістарычнай каштоўнасцю. Затым выдзеліць хоць бы частку найбольш цікавых і важных аб'ектаў і накіраваць адпаведныя дакументы ў рэспубліканскую навукова-метадычную раду па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры, каб узяць гэтыя аб'екты пад дзяржаўную ахову.

Дарэчы, Андрэй Чарнякевіч і яго калегі ўжо падрыхтавалі сваё бачанне каштоўнасці і перспектыў шэрагу будынкаў «Новага свету» і накіравалі гэтыя матэрыялы ў Міністэрства культуры. Адпаведныя даследаванні (каб угледзецца ў сітуацыю па самых розных параметрах, ацаніць умовы, каштоўнасць аб'ектаў і зрабіць нейкія высновы) па заказе гарвыканкама некалькі гадоў таму распачаў, але пакуль у поўным аб'ёме не выканаў, і інстытут «Гроднаграмадзянпраект». У пратаколе пасяджэння рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры (красавік 2007 года) на гэты конт сказана: «Звярнуць увагу заказчыка і праектнай арганізацыі на неабходнасць дэталёвага вывучэння забудовы 20—30-х гадоў XX стагоддзя з мэтай выяўлення традыцыйных і найбольш выразных у архітэктурна-мастацкім плане будынкаў... дзеля іх захавання і адаптацыі ў горадабудаўнічую тканіну... Рэкамендаваць разгледзець пытанне наконт стварэння адзінага квартала, які адлюстроўвае характэрныя рысы горадабудаўнічага асяроддзя 20—30-х гадоў XX стагоддзя».

Канкрэтных дзеянняў у гэтым кірунку пакуль няшмат, хоць іх важнасць і не аспрэчваецца.

— Да тэрыторыі, якая з поўначы прымыкае да цэнтральнай часткі горада, мы абавязаны ставіцца беражліва, бо гэта наш набытак па многіх параметрах, — кажа **начальнік упраўлення архітэктуры і горадабудаўніцтва Гродзенскага гарвыканкама Уладзімір АНІСІМАЎ.**

— Сёння ў нас нейкай працы па праектаванні будаўніцтва ў гэтым квартале не праводзіцца, і за апошнія два гады не прымалася ніводнага адпаведнага рашэння. Па меры інтэнсіўнасці асваення гэтых тэрыторый мы будзем углядацца і беражліва ставіцца да таго, што сапраўды з'яўляецца гістарычным набыткам. Будзем наводзіць парадак і з тым нязграбным, што таксама мае месца ў гэтым раёне.

— Ці існуюць, як сцвярджаецца ў польскай газеце, планы зносу каля двухсот будынкаў у гэтым квартале?

— Гэта домыслы, я такіх фактаў не ведаю.

— Наколькі мэтазгодна, на вашу думку, уключыць найбольш каштоўныя аб'екты гэтага раёна ў сістэму дзяржаўнай аховы?

— Для таго, каб уключаць, трэба дасканала вывучыць. І не выбарачна, а ў комплексе, па ўсіх параметрах. Таму будзем рабіць дэталёвы план гэтага раёна і тады дадзім комплексную ацэнку ўсяму.

Калі ж будзе такая ацэнка і сапраўднае жаданне, як сказана ў вышэйзгаданым пратаколе навукова-метадычнай рады Міністэрства культуры, захаваць і адаптаваць гэты раён у горадабудаўнічую тканіну, то будуць шукацца адпаведныя магчымасці і шляхі дзеянняў. У прыватнасці, можа быць карысным існуючы ў Еўропе вопыт захавання драўлянай гістарычнай забудовы (напрыклад, у Рызе, Юрмале, у Швецыі), яе арганічнага спалучэння з новымі архітэктурнымі тэндэнцыямі і сучаснымі матэрыяламі. Мо, ёсць чаму павучыцца і ў суседзяў з Падляскага ваяводства, дзе орган мясцовага самакіравання праводзіць конкурс сярод гаспадароў такіх драўляных дамоў з грашовым заахвочваннем тых, хто лепш за ўсё захоўвае аўтэнтычнасць будынка, і адпаведнай шыльдай на ім.

Мажліва, з'явяцца і варыянты забеспячэння іншым жыллём жыхароў асобных дамоў з перадачай апошніх новым уласнікам (зразумела, з умовай захавання гістарычных асаблівасцяў гэтых будынкаў) пад крамы і іншыя прадпрыемствы сферы абслугоўвання, культурныя ўстановы. Як гэта зроблена, напрыклад, па вуліцы Дзяржынскага, 10 у пабудаваным у 30-х гадах мінулага стагоддзя доме Вагнераў, дзе цяпер майстэрня і крама з сувенірамі *(на здымках)*.

Гісторык архітэктуры Ігар Трусаў звяртае ўвагу і яшчэ на адно прынцыповае пытанне:

— Бюджэт Мінска фарміруецца па мадэлі абласнога, а гэта азначае, што ў ім закладзеныя сродкі па артыкуле «Рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры». Калісьці наш горад таксама меў права прафінансаваць нейкі праект па рэстаўрацыі. Аднак гэты артыкул, як і ўсім абласным цэнтрам, у 1990-я гады з бюджэту выключылі. Хоць, паверце мне на слова, толькі зарэгістраваных помнікаў архітэктуры ў Гродне ў дзясяткі разоў больш, чым у сталіцы. І калі мы хочам па-сапраўднаму клапаціцца аб гістарычным цэнтры (ёсць нават задумы, каб ён увайшоў у спіс помнікаў ЮНЕСКА), то «рэстаўрацыйны» артыкул трэба вярнуць у бюджэт горада.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Вярнуць Лідзе карону 830-годдзя

Спрэчны ліст

Уладзімір КСЕНЗ

Думаю, што з 1980 года наш горад у «крыўдзе» на нас за тое, што яго амаладзілі на цэлых 200 гадоў. Ды і нашы продкі, там на нябёсах, глядзяць на нас з нямым пытаннем: мы што — не жылі, чаму нас выкраслілі з зямнога жыцця, прычым не адно пакаленне?

Гістарычная навука, археолагі не будуць спрачацца, што на тэрыторыі Лідскага раёна ў X—XII стагоддзях пражывалі дайноўцы, чарнарусы, ліцвіны — беларусы, крывічы. У гэты час тут размяшчалася Дайноўскае княства з цэнтрамі Дайнова, Жырмуны, Ліда. І другім цэнтрам пасля Дайновы была Ліда, якая пазней стала цэнтрам Дайноўскага княства, маю смеласць гэта сцвярджаць, і вось чаму.

Вядомыя даследчыкі Літвы Нарбут і Юшкевіч у сваіх працах зазначалі, што Ліда ўпершыню ўзгадваецца ў летапісах у 1180 годзе. Абапіраліся яны на архіўную перапіску графа Тызенгаўзена, які ў каралеўскім архіве Панятоўскага знайшоў дакументы, дзе ўзгадваецца наш горад. З іх зрабіў копію і даслаў у Ліду. Гэтая выпіска была зроблена з візантыйскай крыніцы, і можна сказаць, з'яўлялася своеасаблівым пашпартам нашага горада. Захоўвалася яна ў архівах нашага замка, які быў вывезены ў 1812 годзе ў Маскву, дзе і згарэў падчас уваходжання Напалеона ў Маскву.

Графы Еўстафій і Канстанцін Тышкевічы таксама сцвярджалі, што Ліда была цэнтрам Дайноўскага княства ў XII—XIII стагоддзях і мела ўсе атрыбуты княскай стаўкі з умацаваным драўляным замкам. Пазней на месцы старога драўлянага замка быў пабудаваны каменны замак Гедыміна, які мы бачым цяпер. Спасылаліся яны зноў на Тызенгаўзена і дакументы князя Чартарыйскага, які атрымаў іх ад Сперанскага — міністра пры Аляксандры I. Сперанскі курыраваў працу Карамзіна па напісанні гісторыі Расійскай дзяржавы. Усё, што не ўкладалася ў рэчышча палітыкі Масквы—Пецярбурга, замоўчвалася ці знішчалася.

Размова вядзецца аб працы Тацішчава за XVIII стагоддзе, дзе гэты гісторык спасылкай на старажытныя дакументы паказаў існаванне двух цэнтраў Русі: Літвы і Масквы. Паводле Тацішчава, прарадзіма славян аказалася на тэрыторыі Літвы і Белай Русі, а не ў Ноўгарадзе і Кіеве, а гэта ішло ўразрэз з палітыкай Расійскай імперыі. Сперанскі перадаў Чартарыйскаму шэраг дакументаў, якія належалі Тацішчаву.

Яшчэ ў 1971 годзе я ўпершыню пачуў ад свайго настаўніка, дырэктара школы Мікалая Івашына (хто вучыўся ў першай школе ў тыя гады, памятаюць, наколькі добра і аб'ёмна гэты чалавек ведаў гісторыю), што дата заснавання нашага горада — 1180 год, пры гэтым ён спасылаўся на крыніцы варагаў у Стакгольме і на Тацішчава... У 1989 годзе практычна падобны варыянт аб узгадванні Ліды я пачуў ад пісьменніка Валянціна Пікуля, які расказваў мне пра князя Міндоўга і залаты абоз татарскіх ханаў Шэйбака і Баклая, якіх разбіў Міндоўг, пра гэта я раней пісаў у «Звяздзе» ў матэрыяле «Беларускі залаты трохкутнік». Пікуль тады сцвярджаў, што Міндоўг быў Дайноўскім князем на рэках Вілі і Жыжме і быў нашчадкам княскага роду Рагвалодавічаў.

Візантыйцы апісвалі пасольства шведскага канунга, якія прыбылі на перамовы з імператарам Візантыі ў 1180 годзе. Акрамя дзяржаўных пытанняў варагі-русы прасілі ў кесара-нашчадка дапамагчы ім у адной справе: па дарозе ў Канстанцінопаль яны спыняліся і гасцявалі ў Дайноўскага князя на рацэ Вілі, у гарадах княства Жырмунах і Лідзе. Прымаў іх князь Давід з малалетнім князем Рынгольдам у Лідзе. Давід прасіў варагаў знайсці яго брата, калі той жывы, і яго дзяцей. Плату ён за гэта даў вялікую і прыставіў да пасольства сваіх людзей у дапамогу. Ён расказваў, што ў Лідзе і Дайнове ён у малалецтве аказаўся са сваім дзядзькам князем Маўкольдам у 1128 годзе, калі кіеўскі князь Мсціслаў Уладзіміравіч разбіў і ўзяў у палон яго вотчыну горад Полацк. Дзядзьку і яму ўдалося збегчы з палону, бо іх замянілі надзейныя людзі. Князя Расціслава полацкага, брата яго Давіла з сынам, сем'і іх Мсціслаў адправіў у Канстанцінопаль у палон. Вось Давід і шукаў свайго бацьку Давіла і брата.

Маю смеласць падумаць, што Тызенгаўзен менавіта з гэтага дакумента здымаў копію, дзе Ліда ўзгадваецца ў 1180 годзе.

Міндоўг быў жа сынам Рынгольда, які ўзгадваецца ў візантыйскіх крыніцах.

Шкада, што многія працы і дакументы графоў Тышкевічаў згарэлі падчас Другой сусветнай вайны.

Думаю і ўпэўнены, што знойдзецца больш за тысячу чалавек, якія пастаянна жывуць у Лідзе, якія пацвердзяць мае словы, што да 1980 года на слупах, што стаялі пры ўездзе ў наш горад, датай заснавання Ліды называўся 1180 год. Дык, чаму ж у 1980 годзе наш горад «амаладзілі» на цэлых 200 гадоў? Можа палічылі, што нейкая Ліда ледзь-ледзь не дацягвае да 800-годдзя Белакаменнай (1147), а гэта абуральна!..

Лічу і прапаноўваю ўсім светам вярнуць нашаму гораду страчаныя гады і адзначыць сёлета 830-годдзе Ліды.

г. Ліда.

Фота Пятра ФАМІНА.

Павел ЛАТУШКА:

«НА ФІЛЬМ «ДНЯПРОЎСКІ РУБЕЖ» ПАТРАЧАНА Br6 МІЛЬЯРДАЎ, ВЕРНУТА — 100 МІЛЬЁНАЎ...»

....ПРА ДАСЯГНЕННІ

— 2009 год быў багаты на падзеі і культурныя дасягненні. Сярод іх — увод у дзеянне пасля капітальнага рамонту Вялікага тэатра оперы і балета, працяг рэканструкцыі помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны — палацава-паркавага комплексу ў Нясвіжы і замкавага ў Міры, адкрыццё новых устаноў культуры. У тым ліку двух музеяў, дзесяці бібліятэк, трыццаці сямі новых тыпаў клубных устаноў у аграгарадках. Праведзеныя на высокім міжнародным узроўні фестывалі — «Славянскі базар» у Віцебску, кінафестываль «Ліставад», форум тэатральнага мастацтва «Панарама» ў Мінску, «Залаты шлягер» у Магілёве... Новым творчым праектам з'явіўся рэспубліканскі конкурс «Зорка ўзышла над Беларуссю», першы этап якога паспяхова прайшоў у гарадах і раёнах краіны. Летась быў рэалізаваны шэраг важных культурных праектаў. Праведзены год культуры Расіі, дні культуры Кітая, у Маскве праведзеныя дні культуры Беларусі. Падпісаны міжурадавыя і міжведамасныя пагадненні аб культурным супрацоўніцтве з Францыяй — дарэчы, некалькі дзён таму — з дзяржавай Катар, Літвой, Туркменістанам. Падпісаная праграма Года культуры Беларусі ў Расіі. Падрыхтаваныя да падпісання дакументы аб супрацоўніцтве з Італіяй, Грэцыяй, Польшчай і Украінай.

...ПРА НЕДАПРАЦОЎКІ

— ...Аднак існуюць і недапрацаваныя моманты. Германавіцкі музей культуры і побыту з унікальнай калекцыяй Язэпа Драздовіча не мае фондасховішча і памяшкання для працы супрацоўнікаў. На Брэстчыне патрабуюць капітальнага рамонту будынкі абласнога краязнаўчага музея, адміністрацыйны будынак філіяла «Камянецкая вежа», Музей беларускага Палесся, Івацэвіцкі краязнаўчы музей... Неабходна пабудаваць фондасховішча ў Музеі гісторыі Брэста, Мотальскім музеі, пашырыць фондасховішча ў Ганцавіцкім краязнаўчым музеі...

...ПРА АХОВУ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

— На працягу мінулага года 124 адзінкамі папоўніўся Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў — і цяпер ён налічвае 4911 значных аб'ектаў. Неабходна падкрэсліць, што пры рэстаўрацыйна-аднаўленчых работах на гісторыка-культурных каштоўнасцях асаблівая ўвага павінна надавацца безумоўнаму захаванню аўтэнтычнасці элементаў і канструкцый помнікаў архітэктуры. Нельга пад выглядам рэстаўрацыі займацца будаўніцтвам! Вынікі нашай працы па рэстаўрацыі гісторыка-культурных каштоўнасцяў будуць ацэньвацца не толькі намі, але і нашымі нашчадкамі. Неабходна на аб'ектах забяспечваць высокую ступень узаемадзеяння заказчыка, падрадчыка і навуковага кіраўніка на ўсіх этапах праектавання і рэстаўрацыі. Ад Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў найбліжэйшы час чакаю канкрэтных прапаноў па аднаўленні вертыкалі па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Прашу прапрацаваць унясенне адпаведных зменаў у нарматыўна-прававую базу. Спадзяюся на актывізацыю адпаведнай працы з боку ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, раённых аддзелаў культуры. ...Апроч дзяржаўнага фінансавання неабходна шукаць іншыя крыніцы. Гэта могуць быць сродкі прыватных — як беларускіх, так і замежных — інвестараў, а таксама выхадцаў са славутых родаў. Мы павінны прапанаваць зацікаўленым набыццё маёнткаў, сядзібаў пры ўмове іх рэстаўрацыі з навуковым наглядам міністэрства.

...ПРА ХРУЦКАГА І ЛУЎР

— Неабходна працягваць працу па далейшым развіцці супрацоўніцтва з музеямі замежжа. Мы спадзяёмся, што важным вынікам дамовы аб супрацоўніцтве Нацыянальнага мастацкага музея з сусветна вядомым музеем Луўр стане арганізацыя на працягу гэтага года шэрагу сумесных праектаў, сярод якіх выстава ў Парыжы да 200-годдзя беларускага мастака Хруцкага.

...ПРА НЕТРАДЫЦЫЙНЫЯ СРОДКІ ЗАВАБЛІВАННЯ НАВЕДНІКАЎ

— ...У якасці прыкладу можна прывесці ўвядзенне пячатак Мірскага і Нясвіжскага замкаў, экскурсій з факеламі па Нясвіжскім падземным ходзе, канцэрты і спектаклі каля сценаў Нясвіжскага замка, выстава адной карціны па замове аднаго наведніка і іншае. Такіх ідэй можа быць шмат — трэба актыўней аналізаваць і пераймаць досвед расійскіх і еўрапейскіх музеяў.

...ПРА БІБЛІОБУСЫ

— Як вядома, кожны другі жыхар краіны з'яўляецца карыстальнікам публічных бібліятэк. Аднак сетка бібліятэк мае пэўную тэндэнцыю да скарачэння: зачыняюцца сельскія бібліятэкі ў маланаселеных пунктах... Выйсцем з гэтага становішча павінна стаць далейшае развіццё нестацыянарных пунктаў абслугоўвання, і ў першую чаргу — бібліобусаў.

...ПРА ІНТЭРНЭТ У БІБЛІЯТЭКАХ

— Сёння ў краіне камп'ютарызавана 32 % дзяржаўных публічных бібліятэк. Ад агульнай колькасці цэнтральных бібліятэк больш за 70 % маюць свае інтэрнэт-старонкі. Новым падыходам павінна стаць забеспячэнне ў кожнай бібліятэцы магчымасці доступу ў інтэрнэт. Што, перакананы, дазволіць адначасова больш шырока прыцягваць моладзь да карыстання кніжнымі фондамі бібліятэк. Гэта тым больш істотна з улікам таго, што яшчэ 14 % бібліятэк наогул не тэлефанізаваныя!

...ПРА ДОЛЮ БЕЛАРУСКІХ СПЕКТАКЛЯЎ

— Істотнай праблемай для тэатраў з'яўляецца адсутнасць пастановак сучасных аўтараў. Доля беларускай драматургіі ў рэпертуарах тэатраў ледзьве дасягае 25 %! Гэта супярэчыць прыярытэтам развіцця нацыянальнай культуры. Міністэрствам будуць прыкладзеныя намаганні, каб выправіць гэтае становішча. Кожны тэатр павінен будзе надаваць адпаведную ўвагу гэтаму пытанню і ўнесці прапановы па канкрэтных дзеяннях.

...ПРА РАЗЛІКІ З МАСТАКАМІ

— Міністэрства ў 2009 годзе разлічылася з усімі мастакамі, творы якіх, пачынаючы з 2004 года, былі рэкамендаваныя для набыцця. Летась набыта твораў на суму каля 700 мільёнаў рублёў. Гэта рэкордная сума за апошнія 10 гадоў.

...ПРА КІНО

— У мінулым годзе мы адзначылі 85-годдзе беларускага кіно. Мы ганарымся тым, што зроблена за мінулыя гады. Але час не стаіць на месцы. Сусветная кінавытворчасць ідзе наперад — а значыць, і мы, калі хочам быць канкурэнтаздольнымі, павінны ісці далей. Весці разумную жанравую і актыўную маркетынгавую палітыку. Эканамічны эфект вытворчасці мастацкіх стужак пакуль не ўсцешвае. Як прыклад — «Дняпроўскі рубеж». Выдаткі на вытворчасць — 6 мільярдаў рублёў дзяржаўных сродкаў. Выручаная сума з нацыянальнага паказу склала 100 мільёнаў рублёў (у 60 разоў менш! — **Аўт.**).

...ПРА СТУДЭНТАЎ-КІНОШНІКАЎ

— Мы часта гаворым пра неабходнасць падрыхтоўкі высокакваліфікаваных прафесійных кадраў для кіно. І гэтую задачу мы павінны вырашыць. У тым ліку — праз стварэнне факультэта экранных мастацтваў у Акадэміі мастацтваў. Але мы павінны звярнуць увагу і на тое, што ляжыць на паверхні: каля 60 грамадзянаў Беларусі з'яўляюцца студэнтамі Маскоўскага і Санкт-Пецярбургскага інстытутаў кіно. Трэба зацікавіць іх вяртацца на працу ў Беларусь. Наспеў час адзначыць неабходнасць адпаведнага фінансавання для выезду на стажыроўкі і вучобу студэнтаў па спецыяльнасці «кіно» ў еўрапейскія краіны.

...ПРА КУЛЬТУРНУЮ СТАЛІЦУ ГОДА

— Важнай грамадска-культурнай падзеяй павінен стаць праект «Культурная сталіца года». Сімвалічна, што ён распачаўся ў Полацку — сталіцы старажытнага княства, адкуль бярэ вытокі беларуская дзяржаўнасць і культура. У будучыні на гэтае званне змогуць прэтэндаваць іншыя гарады — што дазволіць нам узбагаціць культурную палітру, актывізаваць мясцовыя ініцыятывы і стварыць шырокія ўмовы для даступнасці найлепшых здабыткаў нацыянальнай культуры мясцовым жыхарам.

...ПРА КРАІНУ ЗАМКАЎ

— Нам неабходна працаваць над стварэннем культурна-турыстычных брэндаў краіны, якія маглі б яскрава і дакладна прадстаўляць нашу краіну за мяжой. У якасці прапановы можна прывесці пазіцыянаванне брэнда «Беларусь — краіна замкаў».

...ПРА ПАМЯТНЫЯ ДАТЫ

— Важная дата гэтага года — 65-годдзе вялікай Перамогі, святой для кожнага беларуса. Памятаючы наша гістарычнае мінулае, мы павінны годна адзначыць 600-годдзе Грунвальдскай бітвы. Мы правядзём шэраг мерапрыемстваў да 80-годдзя Уладзіміра Караткевіча. Важнай справай павінна стаць усталяванне помніка Караткевічу ў Кіеве.

...ПРА ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Сёння мы працуем над надзвычай актуальнай праблемай — аднаўленнем дзейнасці Інстытута культуры Беларусі. Інстытут павінен заняцца навукова-метадычным забеспячэннем сферы культуры, распрацоўкай стратэгіі развіцця, больш актыўна прасоўваць беларускую культуру за мяжу. ...Будзе актывізавана праца па пашырэнні супрацоўніцтва з беларусамі замежжа. Міністэрства плануе працягнуць дзейнасць, скіраваную на развіццё супрацоўніцтва ў галіне культуры з суседнімі краінамі, краінамі — стратэгічнымі партнёркамі, і ў межах ініцыятывы Еўразаюза «Усходняе партнёрства» — з выкарыстаннем дадатковых фінансавых магчымасцяў.

...ПРА МОВУ

— Абсалютна натуральным асяроддзем для пашырэння выкарыстання беларускай мовы з'яўляецца наша сфера — сфера культуры. Пры гэтым важна падкрэсліць, што ў гэтай справе недапушчальным з'яўляецца прымус. Гэта павінен быць шлях усведамлення патрэбы захавання нашай мовы. Як падкрэсліў народны пісьменнік Беларусі Іван Мележ: «Мова — гэта вялікая народная скарбніца, яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ».

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

Дык колькі гадоў Лідзе?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ

Калі прыйшоў гэты ліст, першае банальнае журналісцкае ўражанне: «запахла смаленым». Насамрэч, да 1980 года датай заснавання Ліды лічыўся 1180 год. Сапраўды цікава, чаму горад стаў «маладзейшым», тым больш, што ў дачыненні да населеных пунктаў больш характэрна прыплюсоўваць узрост. Але шмат з таго, што змешчана ў тэксце аўтара, насцярожвае, дакументы, на якія ён спасылаецца, не захаваліся. Між іншым дата, устаноўленая ў васьмідзясятых гадах мінулага стагоддзя, з якой адлічвалася гісторыя Ліды (1180), літаральна пару гадоў была зменена на 1323. Дык колькі зараз гадоў гэтаму гораду? Каб разабрацца з гэтым, я звярнулася па дапамогу да навукоўцаў.

Супрацоўнікі Лідскага гісторыка-мастацкага музея мяркуюць, што годам нараджэння горада трэба лічыць 1323-і, калі тут пачалося будаўніцтва замка вялікім князем Гедымінам, тым больш што пытанне пра дату, з якой трэба адлічваць гісторыю горада, неаднойчы ўзнімалася, праведзены сур'ёзныя даследаванні. «Сёння няма крыніц, якія могуць пацвердзіць, што першыя згадкі пра горад адносяцца да 1180 года, археалагічныя раскопкі, што праводзіліся ў сямідзясятых—васьмідзясятых гадах, таксама не пацвярджаюць гэтага», — заўважае супрацоўнік музея Настасся Каладзяжная. Яна падказала, што пытанню наконт заснавання Ліды прысвечаны артыкул у часопісе «Лідскі летапісец», № 1 за 1997 год. Ужо не першы год вядуцца спрэчкі наконт даты, якую трэба браць за пункт адліку гісторыі горада. Лічбы 1180 прытрымліваўся дарэвалюцыйны гісторык Міхаіл Шымялевіч, які меркаваў, што людзі абжылі гэту тэрыторыю яшчэ ў X стагоддзі, тут існавала пасяленне, характэрнае для племені яцвягаў, якія засялялі Панямонне ў X—XIII стагоддзях. Летапісы ўзгадваюць 1283 год, калі існавала Дайноўскае княства, якое размяшчалася на землях Лідчыны ў XII—XIII стагоддзях і цэнтрам якога была вёска Дайнова (якая існуе і цяпер).

Самая старажытная дата з'яўлення Ліды была змешчана ў Польскай вялікай усеагульнай энцыклапедыі, том 6. З'явілася гэта дата дзякуючы двухсэнсавай фразе вядомага польскага гісторыка XIX стагоддзя, жыхара Лідскага павета Тэадора Нарбута. Да пятага тома свайго вялікага дзевяцітомнага даследавання па гісторыі Літоўскага княства Т. Нарбут дадаў невялікае сачыненне на чатыры старонкі «Крыху з гісторыі горада Ліды», якое пачынаецца так: «Гэтае месца пасля заваёвы княства Дайноўскага каля 1180 года, у якім размяшчалася, ёсць паселішча Літоўскае». Неканкрэтнае па сэнсе меркаванне з цягам часу ператварылася ў перакананне, што Ліда была заснаваная ў гэтым годзе, і падтрымліваецца сучаснымі літоўскімі энцыклапедыямі.

Яшчэ адна дата, звязаная з гісторыяй горада, узгадваецца ў гісторыка-эканамічным нарысе «Ліда», які быў надрукаваны ў 1976 годзе. Там напісана пра нашэсце татар, што «ў 1242 годзе літоўскі князь Міндоўг адбіў іх напад ля Ліды». Але аўтар нарыса, не паведаміў пра першакрыніцу, з якой узятыя гэтыя звесткі, і таму іх немагчыма праверыць. У 1242 годзе татарскія плямёны ўварваліся ў Панямонне, але пад Васілішкамі пацярпелі паражэнне, і іх кіраўнік Шайбак-хан быў забіты (захаваліся назвы Шайбак-поле і вёска Шайбакі).

Але большасць гісторыкаў прытрымліваецца даты 1323, калі тут пачалося будаўніцтва Лідскага замка. Дата гэта называецца і Тэадорам Нарбутам, які піша, што ў гэтым годзе быў закладзены замак. У 1341 годзе Гедымін памёр, але ў пастаменце, які ён пакінуў, апісваецца, што ён завяшчае сваім сынам. Там узгадваюцца 15 гарадоў, сярод якіх і Ліда (менавіта горад, а не замак).

У 1980 годзе, калі многія гарады святкавалі юбілеі, кіраўніцтва Ліды таксама вырашыла зрабіць вялікае свята. Калі савецкая сістэма трашчала, меркавалася, што гэта будзе штуршком для развіцця горада. Дату 1380 прапанаваў Аляксандр П'янкоў — адзін з аўтараў гісторыі Беларускай ССР, выдадзенай у Мінску ў 1961 годзе, якая пасля

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Пяць хвілін на роздум

Задача-жарт



Белыя: Крg5, Лf7, Кg6, п. g7(4)
Чорныя: Крh7(1)
Мат за 1 ход.
М. Вукчэвіч

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

Белыя: Крa2, Фf7, Лd7, Лh6, Сb2, Сf3, Кd6, Кe4, пп. b5, e6(10).
Чорныя: Крd5, Фf4, Лh4, Сf2, п. e6(5).
Мат за 2 хады.
Чакаем вашых адказаў!

Праверце вашы адказы

Змяшчаем рашэнні заданняў № 11, № 12 конкурсу рашэнняў, апублікаваных 30 снежня 2009 г.

Заданне № 11. В. Неідзе. 1. Крf2 g1Ф+! 2. K:g1 h2 3. Kh3! h1K+! 4. Крg2 Kg3 5. Ce6+ Kf5 6. Крh2!

Заданне № 12. 1. c7 Лa8 2. Ca2 e6 3. Крb1 Cf4 4. g6 Ce5 5. g7! C:g7 6. h8Ф! C:h8 7. C8Ф Л:c8 8. b3+ і пасля адыходу караля белым правільны пат з актыўна замураваным сланом. Эцюд складзены таленавітым шведскім мастаком Эрнстам Хальмам (1879—1941).

Тыповыя пазіцыі пешка — цвік

Так вобразна называюць пешку, якая прыносіць сябе ў ахвяру з мэтай зрабіць цяжэйшым развіццё сілаў праціўніка або разбурыць прыкрыцце варожага караля. Фактычна — гэта элемент тактыкі, і сустрэцца з ім можна ўжо ў дэбютнай частцы гульні.

Абарона Кара-Кан

1. e4 c6 2. d4 d5 3. e5 Cf5 4. h4!?, ход, які атрымаў выпрабаванне ў матчы Таль — Батвіннік у 1961 г. 4... h6 5. g4 Ch7? 6. e6! «Цвік» забіты 6... fe 7. Cd3 C:d3 8. Ф:d3 Фd6 9. f4 і пасля Kg1—f3—e5 у белых перавага.

Пазнаёмцеся з кароткай партыяй, згулянай у міжнародным турніры, у якой рашаючае «слова» належыць такой «цвіковай» пешцы.

Н. Рукавіна — Б. Ларсен
Галандская абарона

1. c4 g6 2. d4 Cg7 3. g3 c5 4. d5 d6 5. Cg2 Ka6 6. Kf3 f5 7. o-o Kf6 8. Kc3 o-o 9. Ke1 Лb8 10. Фd3 Cd7 11. b3? Ke4 12. C:e4 fe 13. Фc2 Ch3 14. Kg2 Kb4 15. Фd2 e3! 16. fe Л:f1 17. Кр:f1 e6 18. Cb2 ed 19. cd Фg5 20. Лd1 Ce5 21. e4 Фg4 22. Крg1 Лf8 23. Ke3 Фg5 24. Kg2 Фh5 25. Лe1 C:g2 26. Кр:g2 Лf2+ 27. Кр:f2 Ф:h2+ 28. Крf1 Фh3+ і белыя здаліся.

Сам сабе псіхолаг

20 способаў захаваць нервовую сістэму

1. Стаўце перад сабой толькі станоўчыя мэты, дасягненне якіх прынясе задавальненне і вам, і навакольным.

2. Знайдзіце сваё прызванне. Ваша праца павінна быць цікавай, захапляльнай і добра аплатнай (ва ўсякім разе, да гэтага трэба імкнуцца).

3. Плануйце свае справы, эфектыўна размяркоўвайце час, каб пазбегнуць напружаных сітуацый, «запаркі». Пасля цяжкай працы пастарайцеся добра адпачыць.

4. Старанна выбірайце сяброў, будзьце разборлівымі ў знаёмствах. Старайцеся, каб адносіны з навакольнымі былі роўныя, спакойныя, паважлівыя.

5. Асвойце прыёмы расслаблення і «адасобленага» погляду на тое, што адбываецца.

6. Спадзявайцеся на лепшае. Аптымістычнае ўспрыманне рэчаіснасці прывядзе вас да мэты значна хутчэй, чым песімістычны падыход.

7. Паводзьце сябе свабодна і натуральна, як мага менш «іграйце ролю».

8. Устанавіце працоўны стол, абсталюйце працоўнае месца так, каб погляд, падняты ад папер, спыняўся на пакаёвых кветках, прыгожай карціне, акварыуме з рыбкамі; «павесьце» на экран камп'ютара карціну, на якую вам будзе прыемна глядзець.

9. Хваліце сябе і іншых. Пахвала неабходная не толькі дзецям, але і дарослым. Калі вас не хваляць сябры, сваякі, начальнік — пахваліце сябе самі!

10. У вашым жыцці павінны быць элементы размеранасці і пастаянства, астраўкі стабільнасці. Напрыклад, абавязковая ранішняя гімнастыка, снеданне ў адзін і той жа час, штодзённы прагляд любімай тэлеперадачы, традыцыйная вячэрняя прагулка — усё гэта павышае адчуванне стабільнасці, а значыць і надае ўпэўненасці ў сабе.

11. Адстойвайце свае правы, абараняйце свае інтарэсы, але не пераходзьце пры гэтым рамкі прыстойнасці, не апускайцеся да зневажэння апанентаў.

12. Не рабіце іншым таго, чаго не хочаце, каб рабілі вам.

13. Падтрымлівайце і развівайце свае карысныя звычкі, пазбаўцеся ад шкодных.

14. Захоўвайце добрую фізічную форму, пастарайцеся паўнацэнна харчавацца.

15. Вядзіце рэгулярнае і стабільнае сэксуальнае жыццё без перагібаў у той ці іншы бок. Захоўвайце, так бы мовіць, «залатую сярэдзіну».

16. Смейцеся, усміхайцеся, жартуйце як мага часцей! У тым ліку і з сябе. Развівайце ў сябе пачуццё гумару.

17. Атрымлівайце асалоду ад жыцця! Атрымлівайце задавальненне ад кожнага пражытага імгнення, знаходзьце прыемнае ў любой падзеі, у кожным, самым нязначным эпізодзе свайго жыцця.

18. Для нервовай сістэмы дарослых карысная гульня з дзецьмі 3-4 гадоў — у гэтым узросце малыя адчуваюць натуральную цікавасць да жыцця. І яна перадаецца дарослым.

19. Падчас спрэчкі пастарайцеся пераключацца на пабочныя аб'екты. Напрыклад, паглядзіце, ці ёсць пыл на стале або падваконні. Такім чынам вы можаце страціць ніць гутаркі (праўда, часцей за ўсё гэта самая ніць у напружаных абставінах адсутнічае). «Выпаўшы» з атмасферы гневу, вы перастанеце хваравіта ўспрымаць тое, што адбываецца.

20. Зрабіце сваім лозунгам: «Сонца свеціць мне СЁННЯ, каб я не думаў пра ўчарашні дзень!» прама цяпер, з гэтай хвіліны. Тады і стрэс, і дэпрэсія будуць абыходзіць вас бокам.

Калі ж вам не ўдалося скарыстацца гэтымі парадамі, і вы перажылі глыбокі стрэс, то памятайце, што ва ўздзеянні інфармацыі на псіхіку дзейнічае правіла трох дзён: праз суткі пасля пэўнай падзеі мы можам аднавіць яе ў памяці (ва ўсіх дэталях) на 70 %, на працягу другіх сутак — на 40 %, а на трэція суткі яркасць і глыбіня адчуванняў роўная ўсяго 10 %. Гэта значыць, праз тры дні падзея страціць сваю вастрыню і драматызм.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПОДПІС — З ХАРАКТАРАМ

Хочаце-верце...

ДАЎНО вядома, што характар чалавека, як кажуць, з галавой выдае яго почырк. Маючы перад вачамі ўзор пісьма, спецыяліст можа скласці падрабязны псіхалагічны партрэт, вызначыць пол, прыкладны ўзрост. Пэўную інфармацыю аб чалавеку дае і яго подпіс. Джэймс Раскін для аналізу подпісу вылучае больш за 40 прыкмет. У тым ліку:

Памер подпісу: *размашысты* (сцвярджае аб глабальным сістэмным мысленні); *кампактны* подпіс (канкрэтнае мысленне).

Даўжыня подпісу: *доўгі* (здольнасць глыбока ўнікаць у сутнасць праблем, уседлівасць, залішняя прыдзірлівасць і нуднасць); *кароткі* (здольнасць хутка схопліваць сутнасць падзей, немагчымасць займацца манатоннай працай).

Тып подпісу: *акруглы* (вызначае мяккасць, дабрыню, ураўнаважанасць); *вуглаваты* (нецярплівасць, раздражняльнасць, рэзкасць, незалежнасць, славалюбства, упартасць).

Адлегласць паміж літарамі: *значная* (шчодрасць, транжырства); *«шчыльная»* (эканомнасць, сквапнасць — асабліва калі літары дробныя).

Прысутнасць у подпісу розных элементаў: *круг* (зацыкленасць на праблемах і ідэях); *пяцелькі* (асцярожнасць, упартасць); *малюнкі* (творчае мысленне); *камбінаванне элементаў* (памкненне аптымізаваць сваю дзейнасць).

Ухіл подпісу: *улева* (сваволь-насць, ярка выражаны індывідуалізм); *управа* (збалансаванасць характару, здольнасць да разумення); *прамы ўхіл* (стрыманасць, прамалінейнасць, высокі інтэлектуальны ўзровень); *рознатыповы ўхіл* (скрытнасць, няшчырасць); *літары, якія «ляжаць»* (сведчаць аб наяўнасці сур'ёзных псіхалагічных праблем).

Кірунак заключнага штрыха: *уверх* (прыкмета аптымізму); *уніз* (схільнасць да песімізму); *прама* (збалансаваны характар).

Даўжыня «хваста» подпісу. Чым больш доўгі «хвост», тым больш чалавек не церпіць чужога меркавання. Гэта таксама прыкмета абачлівасці і асцярожнасці. Чым карацейшы «хвост», тым чалавек больш летуценны.

Падкрэсліванне подпісу: *знізу* (самалюбства, крыўдлівасць, залежнасць ад чужога меркавання); *зверху* (гонар, славалюбства); *перакрэслены подпіс* (самакантроль, незадаволенасць сабой, сумненні).

Прыкметы сіметрыі: *сіметрычны подпіс* (надзейнасць); *асіметрычны* (няўстойлівы характар, перапады настрою); *скачкападобны* (эмацыянальнасць, неўраўнаважанасць).

Складанасць і прастата: *просты подпіс* (чалавек жыве па прынцыпе «няма праблем»); *«нагружаны»* (часта схільны рабіць з мухі слана); *арыгінальны* (вялікі творчы патэнцыял).

Разборлівасць: чым больш зразумелы подпіс, тым больш адкрыты чалавек.

Уціск: *празмерны* (агрэсіўнасць); *слабы* (скрытнасць); *моцны* (упэўненасць).

Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.



Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 3 (335)

Праблемы саду зімой

Многія дачнікі лічаць, што неабавязкова ездзіць у сад зімой, калі ўся прырода адпачывае. Адпаведна, толькі ўзімку і самім можна адпачыць. Але такое меркаванне не зусім правільнае. Зімой трэба сачыць за дрэўцамі, і асабліва за маладымі. Паглядзіце, колькі ў садзе слядоў на снезе, тут і там — памёт. Відаць, тут ужо пабывалі зайцы, казулі. У час снежных і суровых зімаў яны лёгка пераскокваюць цераз агароджу.

Каб абараніць сад ад зайцоў і іншых лясных жыхароў трэба, пакуль не позна, дрэвы абгарнуць перфарыраваным або сеткавым матэрыялам. Многія садаводы выкарыстоўваюць лапкі, капронавыя калготкі або плёнку. Але не кожнаму пад сілу нарыхтаваць лапкі, а плёнкі і сінтэтычныя матэрыялы прамакаюць і прымярзаюць да дрэва, што яму не на карысць. Лепш за ўсё для гэтых мэтаў выкарыстаць капронавую сетку, якую летам вешаюць на форткі ад мух і камароў. Нарэзанымі палоскамі патрэбнай вышыні і шырыні абгарніце дрэва і замацуйце ў 2-3 месцах.

Калі ж няма магчымасці купіць і такую ахову, то ствол дрэўца можна засцерагчы ад пашкоджанняў, абгарнуўшы яго грубай паперай, мешкавінай. Ні ў якім разе не выкарыстоўвайце плёначныя мяшкі з-пад мінеральных угнаенняў. Пад такой «аховай» вясной у сонечныя дні кара дрэва моцна награваецца, дрэва пачынае вегетацыю, а ўначы пры вялікім зніжэнні тэмпературы і хуткім ахаладжэнні кары і вонкавых слаёў драўніны ўзнікае небяспека з'яўлення ранаў і апёкаў.

Цяпер па ўсёй тэрыторыі снегу намяло дастаткова, таму абтоптвайце снег, гэтым вы выратуеце свой сад. Праз цвёрды, утаптаны снег мышы не палезуць да дрэва, яны прабіраюцца па рыхлым снезе да ствала дрэва і выгрызаюць кару да самай драўніны. Так што, па магчымасці, наведайце сваё лецішча з карысцю.

У садзе паміж дрэвамі...

На невялікім участку зямлі дарагі кожны яе кавалачак, таму дачнікі часта выкарыстоўваюць тэрыторыю паміж радамі садовых дрэў. Што ж можна вырошчваць? Культурамі, якія найбольш падыходзяць для вырошчвання ў радах паміж дрэвамі, з'яўляюцца бабовыя. Да ўсяго яны ўзбагачаюць глебу азотам і паляпшаюць яе структуру. Асабліва падыходзіць для гэтых мэтаў фасоля, якая сцелецца. Між радоў можна вырошчваць караняплодныя і клубняплодныя расліны. Яны слаба высушваюць глебу, патрабуюць рэгулярнай апрацоўкі і вялікай колькасці пажыўных рэчываў. Дык вось пры іх вырошчванні прымяняюцца павышаныя дозы ўгнаенняў і шматразовыя рыхленні глебы. Дзякуючы гэтаму караняплоды і клубняплоды не аказваюць шкоднага ўплыву на рост і плоданашэнне пладовых культур. Гарбузовыя і агародныя расліны падыходзяць для вырошчвання ў радах маладых садоў, таму што ў радах дарослага саду ім не вельмі падабаецца, бо яны дрэнна пераносяць зацяненне. Рэгулярныя ўгнаенне і арашэнне агародных культур добра адбіваецца на развіцці пладовых дрэў.

Вырошчванне такіх культур, як перац, таматы, баклажаны не вельмі дабратворна адаб'ецца, калі іх размясціць у радах костачкавых культур.

У зімовыя месяцы

Паколькі была доўгая цёплая восень, мала снегу ў снежні, многія работы, якія трэба было зрабіць у пачатку зімы, давядзецца паўтарыць.

Агледзьце бульбу ў сховішчах, праверце яблыкі і перабярыце іх, выкінуўшы падгнілыя, каб не заражалі астатнія. Праверце, ці многа снегу на падзімніх пасевах морквы, цыбулі, часнаку. Магчыма, трэба дадаткова прыкрыць торфам, кампостам, лапкамі.

Самая адказная работа для садавода — нарыхтоўка чаранкоў пладовых культур для зімовай і веснавой прышчэпкі. Наразаць іх трэба пасля маразоў. Пры гэтым майце на ўвазе наступныя правілы нарыхтоўкі чаранкоў.

Не нарыхтоўвайце чаранкі з хворых, нізкаўраджайных і маладых раслін.

Зразайце іх толькі з паўднёвага боку кроны, з самых моцных галін.

Бярыце галіну даўжынёй да 40 см з нармальна развітымі пупышкамі. Не прыдатныя для чаранкавання ваўчкі (доўгія, тонкія аднагадовыя парасткі), моцна пакарочаныя галінкі з блізка размешчанымі пупышкамі.

На чаранкі адразу навешвайце этыкеткі. Для часовага захоўвання зрэзаныя галінкі загарніце ў вільготную тканіну, паперу, мешкавіну. Захоўваць у снезе, рэгулярна прытоптваючы снег, каб выратаваць ад грызуноў, або ў склепе, прысыпаўшы іх вільготным пяском на 1/3 даўжыні чаранка.

Агледзьце кроны дрэў, страсіце засохлыя плады, лісты і спаліце — там гнёзды шкоднікаў.

Паклапаціцеся аб тым, каб ваш сад не пакідалі сінічкі. Рэгулярна запраўляйце кармушкі крошкамі сухароў белага хлеба, семачкамі. Можна павесіць на галінкі кавалачкі несалёнага сала.

У другой палове лютага можна ўжо сеяць на расаду перац, пятрушку, сельдэрэй, фізаліс, памідоры. Таму загадзя паклапаціцеся пра насенне. Арганізуйце праграванне насення, праверку на ўсходжасць, каліброўку ў саляным растворы. Не палянуйцеся для прадухілення ад захворванняў апрацаваць насенне ў марганцоўцы або ў растворы мікраэлементаў. Вельмі добры вынік дае сок алоэ. Лісты алоэ перад гэтым вытрымаць у халадзільніку 10—12 дзён, выціснуць сок і перамяшаць з насеннем, трымаць суткі. Затым насенне прасушыць.

У вольны час можна правесці зімовую «сяўбу» — наклеіць насенне на палосы тонкай паперы, змазанай крухмальным клейстарам. Пры гэтым зручна карыстацца запалкай, змочанай у клейстары. Палосы з наклееным на іх насеннем прасушыць і захоўваць згорнутымі ў рулонах.

Шматаблічны рэвень



Гэта сапраўды так, бо рэвень — лекавая, харчовая і дэкаратыўная расліна. Многія дачнікі вырошчваюць яго на сваіх участках. Пасаджаны ў цэнтры клумбы, рэвень упрыгожыць яе. Гэта шматгадовая травяністая расліна прыйшла да нас з Цэнтральнага Кітая, дзе яго культывуюць з незапамятных часоў. А ў Еўропе з ім пазнаёміліся ў Сярэднявеччы, куды ён быў занесены манахамі-паломнікамі і не з Кітая, а з Індыі. Спачатку ён пасяліўся ў Англіі, потым на паўночным узбярэжжы Германіі. Да канца XVIII стагоддзя рэвень вырошчвалі ўжо многія еўрапейскія агароднікі.

У Расіі гэтае ўсходняе дзіва прыжылося толькі ў другой палове XIX стагоддзя, пасля таго як яе прывёз з падарожжа славуты географ М. Пржэвальскі.

Размножыць рэвень можна насеннем, каранёвымі чаранкамі. Догляд — самы просты: 1-2 праполкі за лета і паліў (у залежнасці ад умоў надвор'я).

Кажучы пра знешняе аблічча рэвеню, трэба адзначыць, што яго не збытаеш з іншымі культурамі: вельмі своеасаблівы ў яго ліст — трохвугольны па форме, ад 15 да 60 см даўжынёй. Лісты «сядзяць» на доўгіх, шырокіх зялёных або расфарбаваных чаранках. І красуецца гэта расліна на градцы гэткім лапушыстым магнатам-веліканам. А вось кветкі ў яго дробныя. Багацце рэвеню — стрыжневы корань. Яго, гэтак жа як і лісты, выкарыстоўваюць у народнай медыцыне. Рэчывы, якія знаходзяцца ў корані, аказваюць лекавае дзеянне пры захворваннях кішэчніка. Адвар, настой каранёў прымяняюць пры запаленчых працэсах у жаночай палавой сферы, унутраных крывацёках. А вось пры цяжарнасці прэпараты рэвеню лепш не прымаць.

Лісты рэвеню — сапраўдная кладоўка вітамінаў (С, Е, К, РР, каратын), шмат вітаміну С і ў чаранках. У іх знаходзяцца солі калію, магнію, кальцыю, фосфару, натрыю, флаваноіды.

Агульнавядома, што рэвень — гэта каштоўны харчовы прадукт. З лісцяў чаранкоў можна прыгатаваць выдатны кампот. З іх папярэдне знімаюць валокны-скурку, рэжуць на дробныя частачкі і вараць у закрытай пасудзіне, каб не разбураўся вітамін С, дадаюць цукар на смак. Гэты цудоўны напой можна прыгатаваць, калі яшчэ няма свежых ягад новага ўраджаю. Збор чаранкоў трэба пачынаць ранняй вясной, пакуль тэмпература паветра не перавышае 15—17 градусаў. У гарачае надвор'е ў чаранках назапашваецца шчаўевая кіслата, якая не толькі зніжае смакавыя якасці, але і адмоўна дзейнічае на арганізм: выводзіць кальцый, што знаходзіцца ў крыві, і ўтварае солі, якія дрэнна выводзяцца.

Летам трэба амаладзіць куст, гэта значыць скасіць усе лісты з чаранкамі. За лета куст зноў адрастае, у жніўні тэмпература паніжаецца да 16—17 градусаў, і маладыя чаранкі зноў будуць карыснымі. Шкоднае ўздзеянне шчаўевай кіслаты лёгка нейтралізаваць малаком. Вось чаму стравы з рэвеню пажадана спалучаць з малочнымі, якія павялічваюць іх каштоўнасць. Чаранкі ўжываюць у свежым выглядзе сырымі і для прыгатавання кісялю, супоў, кампоту, мармеладу, варэння, цукатаў.

НАДВОР'Е на заўтра

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.03	16.43	8.40
Віцебск —	7.58	16.27	8.29
Магілёў —	7.53	16.33	8.40
Гомель —	7.44	16.35	8.51
Гродна —	8.18	16.59	8.41
Брэст —	8.12	17.05	8.53

Месяц

Поўня 30 студзеня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Гаўрылы, Івана, Паўла, Прохара.*

К. *Агнешкі, Аманды, Карыны, Аўгусціна, Валерыя, Пятра, Тамаша.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзве даты

28 студзеня

1044 год — пачалося княжанне ў Полацку Усяслава Брачыславіча, якога называлі Чарадзеем. Яго жыццё апета ў паэме «Слова аб палку Ігаравым»: «Усяслаў-князь людзям суд судзіў, гарадамі князёў надзяляў, а сам ponачы, свету на здзіў, ваўкалакам ці воўкам гуляў. Таму ў Полацку рана званы пазванілі ў Сафіі святой да завутрані,— ён жа праз сны ўжо ў Кіеве звон чуе той».

1820 год — руская экспедыцыя Ф.Ф. Белінсгаўзена і М.П. Лазарава на караблях «Усход» і «Мірны» адкрыла Антарктыду.

Цытата дня:

«Няшчасці бываюць двух відаў: па-першае, нашы ўласныя няўдачы, па-другое, удачы іншых».

Амброз БІРС (1842—1914), амерыканскі пісьменнік, журналіст.

«МЁРТВАЯ» ВАДА

«Мёртвай» вадой называлі тую, якую выкарыстоўвалі падчас надыходу смерці, абмывання нябожчыка і падчас выканання розных рытуальных дзеянняў, звязаных з пахаваннем чалавека. Так, народная традыцыя забараняла карыстацца той вадой, якая знаходзілася ў хаце ў момант смерці чалавека — яе тут жа вылівалі ў двор, а вядро ці іншы посуд трэба было перавярнуць. Асабліва небяспечнай у энергетычным плане лічылі ваду, якой абмывалі нябожчыка. І гэта меркаванне было зусім не беспадстаўным: вада забірала на сябе ўсю інфармацыю, якую назапашваў чалавек на працягу свайго жыцця, уключаючы і сам момант смерці. Таму яе стараліся выліць туды, дзе ніколі не будуць хадзіць чалавек ці свойская жывёла.

● Сімвалам нязгаснасці жыцця быў пастаянны агонь у печы. Аднак як толькі ў хаце паміраў чалавек, агонь у печы тут жа заліваці вадой.

● Менавіта таму стравы для памінальнага стала (а прыгатаванне ежы ніколі не абыдзецца без вады) гатавалі ў суседзяў ці родзічаў, а не там, дзе знаходзіўся нябожчык.

● Калі нябожчыка павязуць хаваць, трэба было хуценька вымыць хату. Ваду для гэтага стараліся браць са святой крынічкі, каб «ажывіць» жытло, быццам бы стварыўшы яго наноў. Адна абавязковая ўмова: ваду, якой мылі падлогу за нябожчыкам, вылівалі на скрыжаванне дарог толькі тады, калі пахавальная працэсія вернецца з могілак.

● Калі людзі вярталіся з могілак, дзе яны развітваліся з памерлым, то павінны былі памыць рукі, каб вада забрала на сябе адмоўную інфармацыю.

● Самае галоўнае правіла, якое трэба бездакорна выконваць у дачыненні да «мёртвай» вады, наступнае: яна не павінна трапіць у рукі злыдняў, якія могуць з яе дапамогай тварыць свае «чорныя» справы. Калі ў выпадку купання дзіцяці ваду трэба было захоўваць на працягу ночы і выліваць толькі з першымі промнямі сонца, то «мёртвую» ваду знішчалі адразу ж.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Правадніца цягніка «Уладзівасток—Калінінград» на развітанне шэптам кажа пасажырам «дапамажыце!..».

Гутарка двух сяброў па тэлефоне:

— Ну і бадун у мяне. Учора столькі выпіў, што нават не памятаю, як пайшоў ад цябе. Напэўна апошняя бутэлька была лішняй.

— Па-любому апошняя бутэлька была лішняй! Ты, дарэчы, сёння зайдзі да мяне.

— Навошта?

— Як навошта? Прынясеш майго ката ды і заадно шапку сваю забярэш...

На спаборніцтвах па каратэ спартсмен з Ліпецка узгадаў словы свайго настаўніка, але мацюкі ніяк не дапамаглі яму перамагчы.

— Прыстрэльце яго, каб не мучыўся.

— Доктар! У нас прыватная клініка, а не дзяржаўная, тут так нельга!

Сапраўдны мужчына павінен пабудаваць дом, пасадзіць дрэва, выгадаваць сына, ну і ўсё астатняе, што скажа жонка.

— Мая жонка мяне ніколі не кіне.

— Чаму?

— Я ёй пяцьдзясят еўра павінен.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 423. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12